Г. В. Штыхаў, Ю. М. Бохан, М. А. Краснова

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

другая палова XIII — першая палова XVI ст.

Вучэбны дапаможнік
для 7 класа агульнаадукацыйных устаноў
з беларускай мовай навучання

Пад рэдакцыяй доктара гістарычных навук
Ю. М. Бохана

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

**Мінск «Народная асвета» 2009**

Народная асвета
Правообладатель Народная асвета

УДК 94(476)(075.3=161.3)
ББК 63.3(4Беи)я721
Ш94

Рэцэнзенты:

кафедра гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў Беларускага дзяржаўнага універсітэта (кандыдат гістарычных навук, дацэнт *В. А. Варонін*); метадыст першай катэгорыі ўпраўлення вучэбна-метадычнай работы Акадэміі паслядыпломнай адукацыі *В. М. Варановіч*; настаўнік вышэйшай катэгорыі сярэдняй школы № 115 г. Мінска *А. А. Корзюк*; кандыдат гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі і культуры Беларусі Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А. Куляшова *П. Ф. Дзмітрачкоў*

**Штыхаў, Г. В.**
Ш94 Гісторыя Беларусі : другая палова XIII — першая палова XVI ст. : вучэб. дапам. для 7-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. мовай навучання / Г. В. Штыхаў, Ю. М. Бохан, М. А. Краснова; пад рэд. Ю. М. Бохана. — Мінск : Нар. асвета, 2009. — 158 с. : іл.
ISBN 978-985-03-1188-7.

**УДК 94(476)(075.3=161.3)**
**ББК 63.3(4Беи)я721**

**ISBN 978-985-03-1188-7**

© Штыхаў Г. В., Бохан Ю. М., Краснова М. А., 2009
© Афармленне. УП «Народная асвета», 2009

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# Ад аўтараў

Дарагія сямікласнікі! У гэтым навучальным годзе перад вамі разгорнуцца новыя старонкі мінулага нашай Бацькаўшчыны. Гісторыя беларускага народа надзвычай даўняя і слаўная. Мы можам і павінны ёю ганарыцца. Наша дзяржава — Рэспубліка Беларусь — з высокім узроўнем развіцця гаспадаркі і культуры стала вынікам шматвяковай дзейнасці нашых продкаў, іх таленавітай і самаадданай працы.

У 6-м класе вы пазнаёміліся з вытокамі нашай гісторыі. Вы ўжо ведаеце пра першыя дзяржавы на нашай зямлі — Полацкае і Тураўскае княствы, пра жыццё іх жыхароў, пра барацьбу з іншаземнымі захопнікамі, пра культурныя дасягненні нашых продкаў. У XII—XIII стст. гэтыя княствы пачалі распадацца на часткі — удзелы, у якіх правілі свае ўласныя князі. У 7-м класе вы будзеце вывучаць перыяд, калі ўсе беларускія землі ўвайшлі ў склад новай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага.

У гэтым вам дапаможа кніга, якую вы трымаеце ў руках. Аўтары імкнуліся зрабіць яе пазнавальнай, цікавай, павучальнай. Асноўны гістарычны матэрыял дадзены ў тэкстах параграфаў. Галоўныя даты, гістарычныя паняцці і імёны выдзелены **тлустым шрыфтам**, другасныя — *курсівам*. Кожны параграф змяшчае пытанні і заданні, якія накіраваны на тое, каб дапамагчы глыбей зразумець вучэбны матэрыял. Зорачкай (*) адзначаны творчыя заданні.

У канцы параграфаў змешчаны дакументы: урыўкі з летапісаў, заканадаўчыя акты, успаміны сучаснікаў і г. д. Работа з імі пашырыць вашы веды і навучыць аналізаваць, параўноўваць гістарычныя дакументы, рабіць вывады.

Ведаць гісторыю сваёй краіны — гэта значыць ведаць і гісторыю краю, у якім вы пражываеце. З гэтай мэтай пасля асобных параграфаў змешчаны заданні краязнаўчага характару. Падвесці вынікі краязнаўчай работы вы зможаце на асобным уроку.



Правообладатель Народная асвета

Гістарычныя карты дазволяць убачыць тэрытарыяльныя змены, якія адбываліся на беларускіх землях на працягу пэўнага часу. Тэксты параграфаў суправаджаюцца ілюстрацыямі з кароткімі подпісамі, якія нясуць дадатковую інфармацыю. Яны дапоўняць вашы ўяўленні аб гістарычным перыядзе, які вы будзеце вывучаць.

У канцы вучэбнага дапаможніка змешчаны храналагічная табліца асноўных падзей гісторыі Вялікага княства Літоўскага, гістарычны слоўнік, спіс літаратуры для дадатковага чытання і памяткі, якія дапамогуць вам плённа працаваць з тэкстам вучэбнага дапаможніка.

Жадаем поспехаў!

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# Уводзіны

У XIII стагоддзі беларускія землі ўвайшлі ў склад новай дзяржавы. Яна ўзнікла на аснове тэрыторыі рассялення двух народаў — літоўскага і беларускага. Пазней у яго склад увайшла частка ўкраінскіх і рускіх зямель. Аб'яднанне ў гэтай дзяржаве балцкіх зямель і княстваў былой Русі абумовілі яе назву — *Вялікае княства Літоўскае і Рускае*. Аднак часцей яе называлі проста **Вялікае княства Літоўскае** ці скарочана **ВКЛ**. З самага пачатку гэта была шматэтнічная дзяржава, дзе ўсе народы мірна суіснавалі паміж сабой, дапаўняючы і ўзбагачаючы адзін аднаго. Кіруючая дынастыя паходзіла з асяроддзя літоўскай знаці, а культурнае і гаспадарчае аблічча дзяржавы вызначалі беларускія землі.

Вялікае княства Літоўскае адыграла важную ролю ў гісторыі Беларусі. У складзе гэтай дзяржавы нашы продкі здолелі выстаяць перад крыжацкай і мангола-татарскай агрэсіяй. У складзе ВКЛ праходзіла фарміраванне беларускай народнасці. Калі Кіеўскую Русь называюць калыскай беларускага народа, то ў Вялікім княстве, можна сказаць, адбылося яго сталенне. Менавіта ў гэты час аформіліся асноўныя рысы беларускай культуры і беларускага характару — шматканфесійнасць, рэлігійная і нацыянальная цярпімасць, павага да розных звычаяў і культур, да традыцый суседзяў, адкрытасць.

Беларусь знаходзіцца ў геаграфічным цэнтры Еўропы, паміж Чорным і Балтыйскім морамі, на скрыжаванні гандлёвых шляхоў, якія ішлі з поўначы на поўдзень, з захаду на ўсход. Замежныя купцы, падарожнікі і прапаведнікі былі тут частымі гасцямі. Яны садзейнічалі развіццю нашага краю, яго гаспадаркі і культуры. Шчыры, сардэчны і гасцінны беларускі народ умеў сустракаць і частаваць тых, хто ішоў да нас з мірам.

Пакуты і выпрабаванні гартавалі беларускі народ, і ён мацнеў, мужнеў, назапашваў сілы, каб выжыць і паўстаць перад усім светам са сваёй уласнай гісторыяй, гераічнай і драматычнай. Гісторыю беларускага народа з поўным правам можна назваць сапраўдным падручнікам жыцця.



Правообладатель Народная асвета

**Гістарычныя крыніцы.** Мы ўжо ведаем, што важнейшыя звесткі аб гісторыі ўсходніх славян да пачатку XII ст. змяшчае найбольш ранні з захаваных летапісаў — *«Аповесць мінулых гадоў»,* створаны ў Кіеве. Працягам гэтага летапісу з'явіліся пазнейшыя мясцовыя летапісы: Кіеўскі, Галіцка-Валынскі, Наўгародскі.

Кіеўскі і Галіцка-Валынскі летапісы складаюць часткі летапіснага зводу, які называецца *Іпацьеўскім летапісам.* Ён быў знойдзены ў XVIII ст. у Іпацьеўскім манастыры каля г. Кастрама. Іпацьеўскі летапіс — найважнейшая крыніца гісторыі Кіеўскай, Галіцка-Валынскай, Полацкай зямель і пачатку ўтварэння Вялікага княства Літоўскага. У ім змешчана асноўная частка звестак па гісторыі беларускіх зямель XIII ст.

Для разумення гісторыі Беларусі вялікае значэнне мае беларуска-літоўскае летапісанне, якое складвалася ў XV—XVII стст. Агульнадзяржаўным летапісным зводам з'яўляецца *Беларуска-літоўскі летапіс* 1446 г. Яго аўтар праводзіў ідэю гістарычнага адзінства літоўскіх і славянскіх зямель і абгрунтоўваў заканамернасць іх палітычнага саюза ў складзе Вялікага княства Літоўскага, якое ён лічыў вядучым цэнтрам аб'яднання ўсходніх славян. У сярэдзіне XVI ст. створана *«Хроніка Быхаўца»,* найбольш поўны летапісны звод беларуска-літоўскага летапісання.



Храніст Мацей Стрыйкоўскі

Першым гісторыкам Вялікага княства Літоўскага лічыцца польскі храніст XVI ст. *Мацей Стрыйкоўскі.* У сваёй «Хроніцы польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсяе Русі», выдадзенай у 1582 г., ён выкарыстаў шмат разнастайных крыніц.

Найважнейшымі крыніцамі гісторыі Беларусі часоў Вялікага княства з'яўляюцца заканадаўчыя помнікі: *Судзебнік Казіміра* 1468 г. і *Статуты ВКЛ* 1529, 1566 і 1588 гг. Яны даюць уяўленне пра грамадска-палітычныя і



Правообладатель Народная асвета

эканамічныя адносіны, пра свядомасць, мараль, быт, культуру і мову людзей таго часу.

Неацэннай скарбніцай ведаў па гісторыі Беларусі з'яўляецца *«Метрыка Вялікага княства Літоўскага»* — архіў гэтай дзяржавы, які налічвае тысячы дакументаў.

**Асаблівасці перыядызацыі гісторыі Беларусі ў сярэднія вякі.** Назва «сярэднія вякі» даволі папулярная і выкарыстоўваецца ў многіх школьных курсах гісторыі. У 6-м класе вы вывучалі падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі Беларусі ў перыяд ранняга і высокага сярэдневякоўя.

Трэці перыяд — позняе сярэдневякоўе — звычайна датуецца ў гісторыі краін Заходняй Еўропы XIV—XV стст. Беларускія землі тады былі ў складзе Вялікага княства Літоўскага. У навуковай літаратуры выдзяляюцца наступныя асноўныя этапы гісторыі гэтай дзяржавы: *першы* — ад заснавання ВКЛ у сярэдзіне XIII ст. да Крэўскай уніі 1385 г., *другі* — ад Крэўскай уніі да Люблінскай уніі 1569 г., калі Вялікае княства Літоўскае стала часткай новай дзяржавы — Рэчы Паспалітай.

У вучэбным дапаможніку «Гісторыя Беларусі: другая палова XIII — першая палова XVI ст.» для 7 класа вывучаецца гісторыя беларускіх зямель ад утварэння Вялікага княства Літоўскага ў сярэдзіне XIII ст. да Люблінскай уніі 1569 г., калі ВКЛ стала часткай Рэчы Паспалітай.

**Пытанні і заданні**

1. У склад якой дзяржавы ўваходзілі беларускія землі ў перыяд позняга сярэдневякоўя? Які ўплыў на гістарычнае развіццё Беларусі аказала яе геаграфічнае становішча? 2. Якія гістарычныя крыніцы выкарыстоўваюцца для вывучэння гісторыі Беларусі перыяду позняга сярэдневякоўя? 3. Калі склалася беларуска-літоўскае летапісанне? 4. Якія ідэі праводзіў аўтар Беларуска-літоўскага летапісу 1446 г.? 5. Хто лічыцца першым гісторыкам ВКЛ? 6. Чаму Статуты ВКЛ гісторыкі лічаць найважнейшымі крыніцамі гісторыі Вялікага княства Літоўскага? 7. Якія асноўныя этапы можна выдзеліць у гісторыі Вялікага княства Літоўскага? 8. Падлічыце прыблізна, колькі часу існавала Вялікае княства Літоўскае як самастойная, незалежная дзяржава.



Правообладатель Народная асвета

# Раздзел I

# БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СЯРЭДЗІНЕ XIII—XIV СТ.

## § 1. Вытокі ўтварэння Вялікага княства Літоўскага

**Успомніце:**

*1. Дзе ў раннім сярэдневякоўі пражывалі балты і славяне? 2. Якія княствы існавалі на тэрыторыі Беларусі ў XI—XII стст.? 3. Якія прычыны садзейнічалі іх раздробленасці?*

**Прычыны і асаблівасці ўтварэння новай дзяржавы.** У сярэдзіне XIII ст. ва Усходняй Еўропе ўтварылася новая дзяржава, знаходжанне ў якой стала важным этапам у гісторыі беларускіх зямель. Якія ж былі прычыны яе ўтварэння? Перш за ўсё гэта суседства ў басейне р. Нёман усходнеславянскіх і балцкіх плямён. Кантакты паміж гэтымі плямёнамі існавалі здаўна, аднак у XII—XIII стст. яны сталі асабліва цеснымі.

Славяне і балты знаходзіліся на розных узроўнях развіцця. Славянскія землі былі больш развітымі. Тут існавалі багатыя гарады з развітым рамяством, сталыя традыцыі дзяржаўнай арганізацыі. Усяго гэтага не было ў балтаў — продкаў сучасных літоўцаў і латышоў. Аднак затое яны ўступілі ў XII—XIII стст. у стадыю распаду радавога ладу і фарміравання дзяржаўнасці. Гэта прывяло да росту ваеннай актыўнасці балтаў. Паступова склаліся ўмовы для больш цеснага саюзу, у якім беларускія гарады жадалі скарыстаць у сваіх мэтах ваенную сілу балтаў, а балты — атрымаць доступ да эканамічных і палітычных выгод, якія меліся ў беларускіх княствах. Ужо ў пачатку XIII ст. палачане разам з лівамі, латгаламі і літоўцамі супрацьстаялі агрэсіі рыцараў ордэна мечаносцаў.

У сярэдзіне XIII ст. над народамі Усходняй Еўропы навісла новая страшная пагроза. У выніку мангола-татарскага нашэсця большасць зямель Русі была захоплена. Была цалкам парушана сістэма палітычных адносін, існаваўшая раней. Для захавання незалежнасці



Правообладатель Народная асвета

беларускія землі былі вымушаны шукаць новых саюзнікаў. Балтам таксама пагражалі ворагі — рыцары-крыжакі, якія падпарадкавалі сабе плямёны латгалаў, куршаў і прусаў. У такіх умовах збліжэнне славянскага і балцкага насельніцтва дазваляла аб'яднацца для барацьбы як з мангола-татарамі, так і з крыжакамі.



Літоўскі воін. XIII ст.

**Літоўскія плямёны ў Верхнім Панямонні.** У пачатку сярэдневякоўя балты былі асноўным насельніцтвам Панямоння. Паступова балцкія плямёны пачалі аб'ядноўвацца ў саюзы. У XIII ст. на балцкіх землях, не захопленых крыжакамі, ужо вылучаліся дзве вялікія вобласці — *Аўкштайція* і *Жамойць*. Жамойты насялялі Ніжняе Панямонне каля Балтыйскага мора. Аўкштайты пражывалі ў Сярэднім і Верхнім Панямонні, у тым ліку і на тэрыторыі сучаснай Гродзенскай вобласці. Адзін з раёнаў Аўкштайціі — **Літва** — стаў цэнтрам аб'яднання балцкіх плямён. Хутка пад Літвой сталі разумець усю Аўкштайцію і нават Жамойць. Неўзабаве ж Верхняе і Сярэдняе Панямонне стала ядром утварэння балцка-славянскай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага.

**Славянская каланізацыя Верхняга Панямоння.** Славяне сталі актыўна засяляць і асвойваць беларускія землі ў канцы *V — XIII ст.* Такі працэс у гістарычнай навуцы называецца **каланізацыяй**. Славянская каланізацыя беларускіх зямель адбывалася як мірным, так і ваенным шляхам, аднак у любым выпадку яна прыводзіла да збліжэння славян з мясцовым балцкім насельніцтвам. Там, дзе славяне з'явіліся раней, мясцовае насельніцтва **славянізавалася** — пераняло мову, культуру і традыцыі славян. Славянская каланізацыя Верхняга Панямоння праходзіла больш павольна. Тут яна ажыццяўлялася з розных напрамкаў, аднак пераважна з поўдня і ўсходу — з зямель дрыгавічоў, валынян і крывічоў. У выніку Верхняе Панямонне



Правообладатель Народная асвета

ў XII—XIII стст. было зонай пражывання змешанага славяна-балцкага насельніцтва.

**Узнікненне ўсходнеславянскіх гарадоў у Верхнім Панямонні.** Славянская каланізацыя суправаджалася заснаваннем гарадоў. Летапісы паведамляюць пра існаванне ў Панямонні не менш за шэсць старажытных гарадоў. Гарады служылі апорнымі пунктамі славян, месцам збору даніны, размяшчэння гарнізонаў. Паступова тут развівалася рамесніцкая вытворчасць, наладжваліся гаспадарчыя сувязі з акругай, што спрыяла гаспадарчаму і культурнаму збліжэнню славянскага і балцкага насельніцтва. Развіццё рамяства садзейнічала ўтварэнню ў гарадах гандлёва-рамесніцкіх пасадаў. Яны размяшчаліся каля ўмацаваных цэнтраў гарадоў — **дзядзінцаў**, дзе знаходзіўся князь з дружынай і іншая феадальная знаць.

Самымі старажытнымі гарадамі Панямоння з'яўляюцца *Навагрудак* (летапісныя назвы горада — Новогород, Новгородок, Новогородок, Наваградак і інш.), *Ваўкавыск, Гродна*. Яны ўзніклі ў канцы X—XI ст. Крыху пазней быў заснаваны *Слонім*. Невялікімі гарадамі былі *Турыйск* (Шчучынскі раён), *Здзітаў* (Бярозаўскі раён).

**Удзельныя княствы.** Доўгі час гарады Верхняга Панямоння знаходзіліся пад уладай кіеўскіх, а потым галіцка-валынскіх князёў. У XII—XIII стст. яны выступаюць як цэнтры **ўдзельных княстваў**, дзе правілі асобныя князі. Адным са значных княстваў Панямоння было *Гродзенскае княства*. Яно згадваецца з XII ст., калі князем тут быў Усевалад.

Цэнтрам аднаго з вельмі значных у той час княстваў у Панямонні з'яўляўся Навагрудак. Не выключана, што *Навагрудскае княства*, як і Гродзенскае, ужо існавала ў XII ст. У XIII ст. яно вылучаецца на пярэдні план і робіцца найбольш уплывовым у рэгіёне.

У сярэдзіне XIII ст. цэнтрам удзельнага княства быў таксама Ваўкавыск. *Ваўкавыскае княства* было невялікае па памерах, але яго ўладальнікі з'яўляліся багатымі феадаламі, аб чым сведчаць знаходкі ў горадзе багатых рэчаў, якімі карысталіся тагачасныя жыхары Ваўкавыска.

Такім чынам, у Верхнім Панямонні ў XII — першай палове XIII ст. існавалі Гродзенскае, Навагрудскае, Ваўкавыскае княствы.



Правообладатель Народная асвета

Яны з’яўляліся развітымі асяродкамі дзяржаўнасці, якія папярэднічалі фарміраванню Вялікага княства Літоўскага і адыгралі пэўную ролю ў станаўленні новай балта-славянскай дзяржавы.

**Пытанні і заданні**

1. Калі славяне каланізавалі беларускія землі? 2. Якія плямёны пражывалі на беларускіх землях да з’яўлення славян? 3. Чаму балты пераняли мову, традыцыі, культуру славян? Як называецца гэты працэс? 4. Якую тэрыторыю называлі Літвой у XIII ст.? Пакажыце яе на карце. 5. Якія ўдзельныя княствы Верхняга Панямоння адыгралі пэўную ролю ў стварэнні балта-літоўскай дзяржавы? 6. Якія прычыны садзейнічалі ўтварэнню балта-славянскай дзяржавы?

### Гістарычная крыніца

**З Хронікі Літоўскай і Жамойцкай аб залежнасці Літвы ад Русі**

Еднак же той народ литовский през час долгий от початку своего панованя незначный был. Русь мела над ними зверхность и трибут от них отбирала, а меновите: все пануючии княжата киевские земле Руской монархии отбиралы от них в дань веники и лыка на веровки, а то для недостатку и неплодности земле, которая еще не была выправна, и абы толко монарха руский свою зверхность над ними оказовал.

*Як апісвае хроніка адносіны паміж старажытнарускімі княствамі і літоўскімі плямёнамі?*

**!** **Гэта цікава.** Пры раскопках у Навагрудку на дзядзінцы і ў багатых дамах вакольнага горада знойдзена шмат прадметаў узбраення, рыштунку воіна і баявога каня. Сярод іх бронзавыя перакрыжаванні мяча, бронзавыя наканечнікі ножнаў мячоў, наканечнікі коп’яў і дроцікаў, стрэл лукаў і арбалетаў, акоўкі калчанаў і кісцяні. Выяўлены такія рэдкія для гарадскіх слаёў знаходкі, як кальчугі і пласцінкавыя даспехі. Навагрудскія матэрыялы лішні раз дазваляюць меркаваць, што з развіццём феадальнага войска кольчатыя і пласцінкавыя даспехі становяцца сродкам засцярогі не толькі прафесійных воінаў, але і багатых гараджан.



Правообладатель Народная асвета

# § 2. Пачатак Вялікага княства Літоўскага

**Успомніце:**
*1. Якія адносіны склаліся паміж славянамі і балтамі? 2. Якая пагроза існавала для беларускіх зямель у першай палове XIII ст?*

**Першыя звесткі пра Літву.** Упершыню пісьмовыя крыніцы ўзгадваюць пра Літву ў *1009 г.* Да XIII ст. у літоўцаў не было гарадоў і пісьменнасці, але ўжо існаваў падзел на знаць і просты народ, існавала неразвітое рабства. На нейкі час Літва трапіла ў залежнасць ад Русі, аднак у XII ст. літоўцы самі пачынаюць здзяйсняць набегі на некаторыя рускія землі. У пачатку XIII ст. Літва ўжо выступае як значная ваенная сіла, якая пагражае Русі і Польшчы, паспяхова супрацьстаіць крыжацкай агрэсіі. У 1236 г. літоўцамі было нанесена страшнае паражэнне рыцарам ордэна мечаносцаў. Пасля гэтага ордэн ужо не мог самастойна існаваць і быў далучаны да больш моцнага Тэўтонскага ордэна, які незадоўга да гэтага




Вялікае княства Літоўскае ў другой палове XIII — першай палове XIVст.



Правообладатель Народная асвета

з'явіўся ў Паўночнай Польшчы і падначаліў сабе землі балцкага племені прусаў. З 1235 г. летапісы паведамляюць пра **Міндоўга**, які здолеў падпарадкаваць сабе іншых літоўскіх валадароў і стаў вялікім князем.

**Узвышэнне Навагрудскага княства.** Адначасова з ростам ваеннай актыўнасці Літвы адбывалася гаспадарчае ўзвышэнне **Навагрудскага княства**. Гэта быў край даволі высокага ўзроўню развіцця сельскай гаспадаркі, рамяства і гандлю. У XII—XIII стст. у **Навагрудку** разгарнулася актыўнае будаўніцтва. Было ўзведзена шмат дамоў, некаторыя двухпавярховыя, з зашклёнымі вокнамі, нават упрыгожаныя фрэскамі. Гандлёвымі шляхамі ў Навагрудак трапляла дарагая зброя і каштоўны шкляны посуд — кубкі, флаконы, распісаныя золатам і эмаллю. Яны вырабляліся ў Візантыі і падуладных ёй краінах.

Навагрудская зямля была адным з найбольш спакойных рэгіёнаў на землях Русі. Дзякуючы яе геаграфічнаму становішчу крыжацкая і мангола-татарская навала доўгі час нават не дасягала яе тэрыторыі. Гарадская знаць была зацікаўлена ў захаванні міру і спакою, якія былі гарантыяй дабрабыту Навагрудка.

Асаблівасцю Навагрудскай зямлі быў значны вопыт мірнага суіснавання балтаў і славян. Узровень гаспадарчага і палітычнага развіцця беларускіх зямель быў вышэйшы, чым у літоўцаў. Мясцовыя купцы і рамеснікі бачылі ў Літве не канкурэнта, а саюзніка ў барацьбе з іншаземнымі заваёўнікамі. Таму яны спакойна ўспрымалі ўмацаванне ў беларускіх гарадах улады літоўскіх князёў, а часам і самі запрашалі іх на княжанне.

**Каранацыя Міндоўга ў Навагрудку.** У сярэдзіне XIII ст. князь Міндоўг распаўсюдзіў сваю ўладу не толькі на ўсю Літву, але і на Беларускае Панямонне з гарадамі Навагрудак, Ваўкавыск і Слонім. Гэта фактычна стала пачаткам утварэння Вялікага княства Літоўскага. Але ўмацаванне ўлады Міндоўга сустрэла незадавальненне іншых літоўскіх князёў, якія паднялі супраць яго мяцеж. Да мяцежнікаў далучыліся крыжакі і галіцка-валынскія князі. Крыжакоў асабліва вабіла Жамойць, якая знаходзілася паміж прускімі і лівонскімі землямі Тэўтонскага ордэна. Атрымаўшы яе,



Правообладатель Народная асвета



Вялікі князь літоўскі Міндоўг
(1230-я — 1263 гг.).
*Гравюра XVI ст.*

крыжакі злучылі б свае землі ў адзінае цэлае. Што да галіцка-валынскіх князёў, то яны прад'яўлялі прэтэнзіі на Навагрудскую зямлю.

Аднак Міндоўг здолеў разбурыць небяспечны саюз. Ён прыняў каталіцтва і ў 1253 г. каранаваўся ў Навагрудку каралеўскай каронай, якую прыслаў яму Рымскі Папа.

Тытул хрысціянскага манарха падняў міжнародны прэстыж Міндоўга і дазваляў яму на роўных размаўляць з іншымі еўрапейскімі ўладарамі.

Каб выключыць з саюза крыжакоў, Міндоўг часова аддаў ім частку Жамойці. Навагрудак разам з Ваўкавыскам і Слонімам Міндоўг быў вымушаны перадаць сыну галіцка-валынскага князя Раману Данілавічу на правах васальнай залежнасці.





Пячатка Міндоўга

Каб замацаваць мір з галіцка-валынскім князем, Міндоўг аддаў сваю дачку за яго другога сына — Шварна. Пасля гэтага ён здолеў расправіцца з мяцежнымі літоўскімі князямі і зноў вярнуў сабе Навагрудак, які стаў першым палітычным цэнтрам дзяржавы. Галіцка-валынскія князі спрабавалі аслабіць уладу Міндоўга пры дапамозе мангола-татараў, аднак іх паход у землі Літвы і Беларускага Панямоння значных поспехаў не прынёс.



Правообладатель Народная асвета

**Змаганне з крыжакамі.** Насельніцтва Жамойці не жадала скарыцца крыжакам. У 1260 г. жамойцкія сілы ўшчэнт разбілі крыжакоў у *бітве каля возера Дурбе*. Пасля гэтага супраць улады Тэўтонскага ордэна паўсталі падпарадкаваныя яму плямёны прусаў. Крыжакам на працягу амаль дваццаці гадоў давялося зноў умацоўваць сваю ўладу ў Прыбалтыцы.

У 1261 г. Міндоўг разарваў пагадненне з крыжакамі і ўступіў у саюз супраць іх з Аляксандрам Неўскім, князямі Полацка і Віцебска. Аднак супраць яго была арганізавана новая змова, і ў 1263 г. Міндоўг быў забіты. На чале дзяржавы стаў адзін са змоўшчыкаў — жамойцкі князь *Транята*.



Вялікі князь літоўскі Войшалк (1264—1266 гг.)

**Барацьба за ўмацаванне дзяржавы.** Становішча маладой, толькі што ўзнікшай дзяржавы было нялёгкім. Знешняя небяспека ўскладнялася ўнутранай барацьбой. У гэтых абставінах рашучасць праявіў сын Міндоўга **Войшалк**. Абапіраючыся на пінскіх князёў, ён падпарадкаваў сабе Навагрудак, а затым пры падтрымцы навагрудчан падначаліў Літву і расправіўся з забойцамі бацькі. Хутка Войшалк сышоў у манастыр, перадаўшы ўладу ў дзяржаве свайму сваяку *Шварну*. Пасля смерці Шварна ў 1270 г. кіраванне дзяржавай перайшло ў рукі *Трайдзеня*.

Князі, якія кіравалі пасля Міндоўга, здолелі распаўсюдзіць сваю ўладу на ўсё Верхняе Панямонне. У канцы XIII ст. вялікім князем стаў **Віцень**. Яму ўдалося дасягнуць адзінства новай дзяржавы. З'явілася надзея, што яна выжыве і захаваецца. Так яно і адбылося. Велікакняжацкая ўлада, якую ён перадаў у спадчыну свайму брату Гедзіміну, была досыць трывалай. Значная частка беларускіх зямель знаходзілася ўжо ў складзе Вялікага княства Літоўскага.



Правообладатель Народная асвета

**Пытанні і заданні**

1. Калі пісьмовыя крыніцы ўпершыню ўзгадваюць пра Літву? 2. У межах якой тэрыторыі пачалося фарміраванне новага дзяржаўнага ўтварэння на беларускіх і літоўскіх землях? 3. Якія прычыны садзейнічалі ўзвышэнню Навагрудскага княства? 4. Для чаго, на вашу думку, патрэбна была каранацыя Міндоўга? 5. Якім шляхам Міндоўг умацоўваў велікакняжацкую ўладу? 6. Якія вялікія князі пасля Міндоўга распаўсюдзілі сваю ўладу на Верхняе Панямонне? Вызначце іх ролю ва ўмацаванні Вялікага княства Літоўскага.

## Гістарычная крыніца

**З Аповесці пра князёў Міндоўга, Войшалка і Трайдзеня**

У год 1252... У той жа год выгнаў Міндоўг сваіх пляменнікаў Таўцівіла і Эрдзівіда... Ён паслаў іх... на Русь, ваяваць, к Смаленску, і сказаў: «Хто што захопіць, хай тым і валодае». Сам жа ён, варагуючы з імі, вераломна завалодаў Літвою, захапіў усю зямлю Літоўскую і шматлікае дабро іх і прысвоіў іх набытак...

Калі ўведаў Міндоўг, што Таўцівілу хочуць дапамагаць божыя дваране, і біскуп, і ўсе рыжскія воі, ён спалохаўся і таемна паслаў да рыжскага магістра, і пераканаў яго з дапамогаю багатых дарункаў, улітасцівіў яго, паслаўшы шмат золата і срэбра... І сказаў ён [магістру]: «Калі ты заб'еш або выжанеш Таўцівіла, атрымаеш яшчэ больш». Магістар жа адказаў: «...Пакуль не пашлеш да папы і не прымеш хрышчэння — не адолееш ворага... »

Міндоўг прыслаў да папы і прыняў хрышчэнне. Аднак хрышчэнне яго было няшчырае, ён таемна прыносіў ахвяры сваім багам... целы мёртвых спальваў і адкрыта трымаўся свайго язычніцтва.

*Якім чынам, згодна хронікі, Міндоўг прыйшоў да ўлады? Якія шляхі выкарыстоўваў Міндоўг, каб захаваць уладу?*

**Гэта цікава.** Паводле летапісаў, адной з прычын забойства Міндоўга было тое, што ён хацеў забраць жонку аднаго з літоўскіх уладароў — Даўмонта. Калі Міндоўг быў забіты, Даўмонт уцёк у Пскоў. Там ён быў прыязна прыняты пскавічамі, стаў іх князем, прыняў праваслаўе пад імем Цімафей і нават прызнаны святым.

**Да ўрока «Наш край».** Даведайцеся, ці ўваходзілі землі мясцовасці, у якой вы пражываеце, у XIII ст. у склад ВКЛ. Якія плямёны пражывалі ў вашай мясцовасці ў XIII ст.?



Правообладатель Народная асвета

## § 3. Умацаванне велікакняжацкай улады

**Успомніце:**
*1. Якое княства стала цэнтрам утварэння Вялікага княства Літоўскага?*
*2. Якіх вы ведаеце першых князёў літоўскіх? Хто з іх адыграў найбольшую ролю ва ўтварэнні Вялікага княства Літоўскага?*

**Шляхі ўключэння беларускіх зямель у склад Вялікага княства Літоўскага.** На працягу другой паловы XIII—XIV ст. у складзе Вялікага княства Літоўскага апынуліся ўсе беларускія землі. Яны ўваходзілі сюды рознымі шляхамі. Часам мясцовыя жыхары, бачачы ў літоўскіх уладарах надзейную абарону ад знешніх ворагаў, самі запрашалі іх да сябе на княжанне. Пры гэтым з запрошанымі князямі маглі заключацца спецыяльныя дагаворы, якія гарантавалі беларускім землям захаванне даўніх парадкаў. Верагодна, такім чынам літоўскі князь Таўцівіл стаў правіць у старажытным Полацку ўжо ў сярэдзіне XIII ст. Калі ж у 1307 г. Полацкая зямля ненадоўга трапіла ў рукі крыжакоў, палачане звярнуліся да вялікага князя літоўскага Віценя па дапамогу ў барацьбе з немцамі. Немцы былі прагнаны, а Полацкая зямля канчаткова ўвайшла ў склад ВКЛ. Аднак Полацк працягваў карыстацца шырокімі правамі, а літоўскія князі, якія правілі тут, павінны былі прымаць праваслаўе. Такім чынам, Полацкая зямля аказалася пад уладай Вялікага княства Літоўскага не ў выніку заваявання, а са згоды мясцовага баярства і купецтва. На пачатку XIV ст. адбылося ўключэнне ў склад Вялікага княства Літоўскага Мінскага княства.

Дабравольна ўвайшла ў склад ВКЛ і Віцебская зямля. Віцебскі князь Яраслаў, які не меў сыноў, заключыў дагавор з вялікім князем літоўскім Гедзімінам. Па гэтым дагаворы ён аддаваў сваю дачку Марыю за сына Гедзіміна Альгерда. Пасля смерці Яраслава ў 1320 г. Альгерд стаў княжыць у Віцебску. Пры гэтым, напэўна, паміж Альгердам і віцебскім баярствам таксама быў заключаны дагавор, па якім літоўскі князь абяцаў «старыны не рухаць» і пакінуць у Віцебску даўнія парадкі.

Некаторыя ўсходнеславянскія землі былі далучаны да ВКЛ ваенным шляхам. Ужо ў пачатку праўлення Гедзіміна канфлікт з



Правообладатель Народная асвета

Галіцка-Валынскім княствам прывёў да ўключэння ў склад ВКЛ Брэстчыны. У 1359 г. Альгердам было захоплена Мсціслаўскае княства, якое належала Смаленску. У **1362** г. сілы Альгерда ў бітве на *Сініх Водах* разбілі татарскія войскі. Гэта было першае буйное паражэнне татар ва Усходняй Еўропе. У выніку ВКЛ замацавала сваю ўладу на большай частцы ўкраінскіх зямель. Яно паклала пачатак вызваленню рускіх зямель ад мангола-татарскага ярма.

Хуткі тэрытарыяльны рост ВКЛ быў бы немагчымым без удзелу насельніцтва беларускіх зямель. Знайшоўшы досыць надзейную абарону ад знешняга ворага, мясцовае баярства і купецтва захоўвала звыклы лад, традыцыі і веру бацькоў. Ва ўнутраныя справы ўсходнеславянскіх княстваў вярхоўная ўлада практычна не ўмешвалася. Гэтым тлумачыцца як адносная трываласць новай дзяржавы, так і даволі лёгкае далучэнне да яе новых тэрыторый Русі.

**Княжанне Гедзіміна.** Пасля смерці Віценя велікакняжацкі трон заняў яго брат **Гедзімін** (Гедымін). У часы яго праўлення Вялікае княства Літоўскае ператвараецца ў адзін з галоўных цэнтраў аб'яднання рускіх зямель. Гэтаму спрыяла тое, што Галіцка-Валынскае княства ў той час пачало слабець, а Маскоўскае княства яшчэ не набрала моцы, ачуняўшы ад страшнага мангола-татарскага пагрому.



Вялікі князь літоўскі Гедзімін (1316—1341 гг.). *Гравюра XVI ст.*

Гедзімін праводзіў дальнабачную знешнюю і ўнутраную палітыку. Ён імкнуўся супрацьстаяць крыжацкай і татарскай агрэсіі не толькі сілай зброі, але і дыпламатычнымі сродкамі. Пры ім актывізаваліся кантакты з Заходняй Еўропай, адкуль ён запрашаў рамеснікаў і гандляроў. Каб спыніць націск крыжакоў, Гедзімін абяцаў прыняць хрышчэнне і дазволіў дзейнасць у сваёй дзяржаве каталіцкіх манахаў. У часы Гедзіміна



Правообладатель Народная асвета

ВКЛ упершыню ўступіла ў антынямецкі саюз з Польшчай.



Воін ВКЛ канца XIII ст.

Важную ролю ва ўваходжанні беларускіх зямель у склад Вялікага княства Літоўскага адыгралі славянская мова і культура. Старабеларуская мова ўжо ў XIV ст. набыла ў ВКЛ распаўсюджанне і стала афіцыйнай. Пры Гедзіміне большая частка сучаснай Беларусі была ўжо ў складзе Вялікага княства Літоўскага. Прыкладна тры чвэрці насельніцтва гэтай дзяржавы былі «русьскими» людзьмі, як тады называлі беларусаў. Пад уплывам беларускага насельніцтва частка літоўскай знаці нават прымала праваслаўе. Сярод іх — брат Гедзіміна і яго сыны, якія княжылі ва ўсходнеславянскіх землях. У той жа час выхадцы з гэтых зямель адыгрывалі пры Гедзіміне значную ролю ў кіраванні дзяржавай. Асаблівым аўтарытэтам карыстаўся гродзенскі *кашталян* (стараста) *Давыд*. Ён узначальваў вайсковыя сілы дзяржавы падчас ваенных паходаў, выконваў дыпламатычныя даручэнні вялікага князя і нават быў жанаты з яго дачкой Бірутай.

У **1323** г. Гедзімін перанёс сталіцу дзяржавы ў **Вільню** (цяперашні Вільнюс — сталіца Літоўскай Рэспублікі). Узросшая роля кіраўніка дзяржавы яскрава бачна ў змене яго тытула. Гедзімін пачаў называць сябе «каралём Літвы і Русі», «каралём літоўцаў і многіх рускіх», прычым пад назвай «рускія», «русіны» меліся на ўвазе жыхары беларускіх зямель. Таму дзяржава стала называцца *Вялікае княства Літоўскае і Рускае*. Пазней, калі да яго была далучана Жамойць, яно стала называцца **Вялікае княства Літоўскае, Рускае,**



Правообладатель Народная асвета



Будаўніцтва Вільні Гедзімінам. *З гравюры XV ст.*



Правообладатель Народная асвета

**Жамойцкае**. Але часцей ужывалася скарочаная назва **Вялікае княства Літоўскае**.

Вялікі князь Гедзімін быў мудрым правіцелем. Ён праяўляў цярплівыя адносіны да розных рэлігій. Пры ім у Вільні былі заснаваны два каталіцкія *кляштары* (манастыры). Разам з тым вялікі князь не рабіў перашкод будаўніцтву праваслаўных храмаў. Сам Гедзімін не аддаваў перавагі ні праваслаўю, ні каталіцтву, ён заставаўся язычнікам. Такія адносіны да рэлігіі ў шматрэлігійнай дзяржаве садзейнічалі ўмацаванню краіны, рэлігійнаму міру ў ёй.

### Пытанні і заданні

1. Вызначце асноўныя шляхі, якімі беларускія землі ўваходзілі ў склад Вялікага княства Літоўскага. 2. Растлумачце, чаму ўжо ў першай палове XIV ст. дзяржава стала называцца Вялікае княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае. 3. Які горад стаў сталіцай ВКЛ пры Гедзіміне? Калі гэта адбылося? 4. Прывядзіце факты, якія сведчаць аб узрастанні ролі кіраўніка дзяржавы пры Гедзіміне. 5. Якую палітыку праводзіў Гедзімін у адносінах да розных рэлігій? Як гэта паўплывала на становішча ў грамадстве? 6. Дайце характарыстыку Гедзіміна як кіраўніка дзяржавы.

### Гістарычная крыніца

У 1338 г. Гедзімін заключыў гандлёвы дагавор з Лівонскім ордэнам. У канцы тэкста дагавора сказана, што дагавор заключаны «са згоды караля Літвы і яго дзяцей і ўсіх баяр, якія таксама свае абрады пры гэтым здзейснілі, і са згоды епіскапа Полацка, караля і горада Полацка і караля (князя) Віцебска, якія ўсе на гэтым вышэй названым зборы цалавалі хрэст».

*З кім вымушаны быў дзяліць уладу Гедзімін? Пра што сведчыць удзел прадстаўнікоў мясцовых улад з беларускіх гарадоў у заключэнні Гедзімінам важнейшых гандлёвых дагавораў?*

**!** **Гэта цікава.** Каб спыніць крыжацкую агрэсію, Гедзімін рабіў выгляд, што згаджаецца прыняць каталіцтва, аднак у самы апошні момант прапаноўваў крыжакам такія ўмовы, якія яны выканаць не маглі. Напрыклад, ён прапаноўваў ім перасяліцца ў прычарнаморскія стэпы для барацьбы з татарамі. У выніку хрышчэнне Гедзіміна і Літвы зрывалася як быццам па віне крыжакоў.



Правообладатель Народная асвета

## § 4. Княжанне Альгерда. Пачатак праўлення Ягайлы

**Успомніце:**
*1. Якія прычыны садзейнічалі ўтварэнню Вялікага княства Літоўскага? 2. Чаму ўлада першых літоўскіх князёў (Міндоўга, Войшалка) была нетрывалай? 3. Каму з вялікіх князёў літоўскіх удалося дасягнуць трываласці велікакняжацкай улады і значна яе ўмацаваць?*

**Альгерд і Кейстут.** Гедзімін пакінуў вялікае патомства, у тым ліку сем сыноў. Велікакняжацкі трон заняў *Яўнут*, які не быў старэйшым у сям'і. Гэта выклікала незадавальненне яго братоў, асабліва **Альгерда** і **Кейстута**. У 1345 г. Альгерд і Кейстут «змовіліся паміж сабой» і скінулі Яўнута з велікакняжацкага трона. Праз некаторы час браты памірыліся з Яўнутам і далі яму ва ўладанне Заслаўе каля Мінска.

Альгерд і Кейстут правілі сумесна і жылі ў згодзе паміж сабой. Тэрыторыя дзяржавы была падзелена на дзве часткі. Уся ўсходняя частка, большая па памерах, была пад уладай Альгерда, заходняя належала Кейстуту. Дзейнасць Кейстута была скіравана ў першую чаргу на барацьбу з нямецкімі крыжакамі. Яго асабліва паважалі язычнікі-літоўцы.



Вялікі князь літоўскі Альгерд (1345—1377 гг.). *Гравюра XVI ст.*

Альгерд прыняў тытул вялікага князя. Яму належала вярхоўная ўлада ў дзяржаве. Аднак як непасрэдны кіраўнік усходняй часткі ВКЛ Альгерд больш увагі звяртаў на ўсходні напрамак. Тут ён паспяхова вёў палітыку, накіраваную на аб'яднанне ўсходнеславянскіх (рускіх) зямель у адзінай дзяржаве.

Значныя намаганні прыкладаў Альгерд, каб далучыць да Вялікага княства Літоўскага землі ва Украіне. У гэты час яму давялося весці ўпартую барацьбу з Польшчай за землі канчаткова аслабленага Галіцка-Валынскага княства. Барацьба вялася з пераменным поспехам,



Правообладатель Народная асвета

аднак пад канец свайго жыцця Альгерд здолеў умацаваць свае пазіцыі на Валыні.

Авалодаўшы Кіевам, Альгерд пасадзіў там князем свайго сына Уладзіміра. Пры Альгердзе адбылося далучэнне да Вялікага княства Літоўскага Чарнігава-Северскага княства, шэрага смаленскіх і бранскіх зямель, Кіеўскай зямлі і Падолля. Поспехі ўсходняй палітыкі Альгерда былі такія значныя, што ўжо ў 1358 г. ён адкрыта заявіў паслам германскага імператара: «Уся Русь павінна належаць Літве».



Вялікі князь літоўскі Кейстут (1381—1382 гг.)

У барацьбе за «збіранне рускіх зямель» Альгерду давялося сутыкнуцца з Залатой Ардой, якая лічыла рускія землі сваім уладаннем. Разгром татарскіх войск на Сініх Водах замацаваў за ВКЛ украінскія землі. Няпроста складваліся адносіны Альгерда і з Маскоўскім княствам, якое таксама стала прэтэндаваць на ролю аб'яднальніка Русі. З мэтай аслаблення мацнеючай Маскоўскай дзяржавы Альгерд падтрымліваў яе саперніка — Цвярское княства. У 1368, 1370 і 1372 гадах ён здзейсніў паходы на Маскву, аднак канчаткова разбіць свайго ўсходняга суседа Альгерду не ўдалося.

За час княжання Альгерда тэрыторыя ВКЛ павялічылася больш чым у два разы. Павелічэнне дзяржавы было на карысць беларускіх зямель, бо яны занялі цэнтральнае месца ў краіне. Такое выгаднае размяшчэнне спрыяла росту эканомікі беларускіх зямель, развіццю культуры і тым самым забяспечвала ім вядучае месца ў Вялікім княстве.

Памёр Альгерд у 1377 г. у самы разгар барацьбы з крыжакамі. Яшчэ пры жыцці Альгерд назначыў вялікім князем літоўскім **Ягайлу**, свайго старэйшага сына ад другой жонкі — цвярской князёўны Юльяны.

**Барацьба Ягайлы за вялікае княжанне.** На пачатку свайго праўлення Ягайла стараўся працягваць палітыку свайго бацькі. Заход-



Правообладатель Народная асвета

няй часткай дзяржавы па-ранейшаму кіраваў стары Кейстут. Яму Альгерд даручыў абарону заходніх межаў ад крыжакоў і адначасова апеку над «недасведчаным» Ягайлам. Сам Ягайла павінен быў ажыццяўляць палітыку бацькі па «збіранні рускіх зямель». У гэтай справе Ягайла нават здолеў знайсці саюзніка — фактычнага правіцеля Залатой Арды цемніка Мамая, заклапочанага ўмацаваннем Масквы.

Аднак прыход да ўлады ў ВКЛ Ягайлы адначасова прывёў да дынастычнага крызісу ў дзяржаве. Старэйшыя браты Ягайлы — сыны Альгерда ад першай жонкі, Марыі Віцебскай, — лічылі сябе пакрыўджанымі. Ужо ў 1377 г. Ягайла сутыкнуўся з супрацьдзеяннем незадаволеных князёў, якія гуртаваліся вакол полацкага князя Андрэя Альгердавіча. Ягайла выгнаў Андрэя з Полацка, і той разам з некаторымі іншымі князямі мусіў паступіць на службу да маскоўскага князя Дзмітрыя. У далейшым яны адыгралі выключна важную ролю ў перамозе маскоўскіх войскаў над татарамі ў Кулікоўскай бітве 1380 г.

Гэта перамога ўмацавала пазіцыі Дзмітрыя, які атрымаў мянушку «Данскі». У той жа час паражэнне Мамая на Куліковым полі аслабіла пазіцыі Ягайлы, які бачыў у татарах саюзніка супраць Масквы. Ягайла ўстрымаўся ад непасрэднага ўдзелу ў Кулікоўскай бітве, хаця гэты ўдзел мог змяніць ход бітвы і прывесці да паражэння маскоўскага князя. Князям Альгердавічам, якія кіравалі асобнымі палкамі маскоўскага войска, спачувалі многія князі і простыя воіны ВКЛ, таму невядома, каго б яны падтрымалі ў час бою.

Небяспечная для Ягайлы сітуацыя склалася і на захадзе дзяржавы. Яго дзядзька Кейстут, які напачатку падтрымліваў свайго пляменніка, западозрыў яго ў патаемных перамовах з крыжакамі. Каб праверыць свае падазрэнні, Кейстут у 1381 г. раптоўна захапіў Вільню, дзе знайшоў сакрэтныя пагадненні з немцамі. Раз'юшаны Кейстут адхіліў Ягайлу ад улады і саслаў яго ў Віцебск.

Пазбаўленне Ягайлы ўлады прывяло да прымірэння з апальнымі Альгердавічамі. Адначасова былі наладжаны кантакты Кейстута з Дзмітрыем Данскім. Усе сілы, якія вызваліліся пасля ўладкавання праблем на ўсходзе, Кейстут кінуў на барацьбу з крыжакамі.



Правообладатель Народная асвета

Аднак сітуацыя зноў ускладнілася, калі на ўсходзе дзяржавы падняў мяцеж северскі князь Карыбут. Ягайла знайшоў паразуменне з Карыбутам і, скарыстаўшы адсутнасць у Вільні Кейстута, 12 чэрвеня 1382 г. захапіў сталіцу дзяржавы. Вітаўт, сын Кейстута, гродзенскі, брэсцкі і камянецкі князь, рушыў да Вільні, але быў разбіты. Пасля гэтага Ягайлам была захоплена і старая рэзідэнцыя Кейстута — *Трокі*.

Кейстут і Вітаўт сабралі новае войска, але падманам былі захоплены і зняволены ў Крэўскім замку. Па загаду Ягайлы Кейстут быў задушаны, аднак Вітаўту ўдалося ўцячы. Ён скіраваўся да крыжакоў, пры дапамозе якіх вырашыў вярнуць спадчыну бацькі — Троцкае княства. Вялікае княства Літоўскае зноў было ўкінута ў бездань дынастычнай барацьбы.

**Пытанні і заданні**

1. Пры якіх абставінах прыйшоў да ўлады Альгерд? 2. Чаму Альгерд быў вымушаны дзяліць уладу з Кейстутам і жыць з ім у згодзе? 3. Вызначце асноўныя накірункі дзейнасці Альгерда і Кейстута. 4. Якімі былі вынікі княжання Альгерда для Вялікага княства Літоўскага? 5. Як павелічэнне тэрыторыі ВКЛ паўплывала на развіццё беларускіх зямель? 6. Чаму Ягайла ўчыніў расправу над Кейстутам і хацеў знішчыць яго сына Вітаўта?

**Гістарычная крыніца**

**З «Летапісца вялікіх князёў літоўскіх»**

Альгерд, бацька караля [Ягайлы], і Кейстут, бацька вялікага князя Вітаўта, жылі ў вялікай дружбе і любові… І сказаў князь вялікі Кейстут брату свайму, вялікаму князю Альгерду: «Табе належыць князем вялікім быць у Вільні, бо ты старэйшы брат, а я з табой заадно жыву». І пасадзіў яго [Кейстут] на вялікае княжанне ў Вільні... І прысягнулі яны адзін аднаму быць да канца жыцця ў любові і дружбе і ніколі не задумваць нічога благога. І захавалі яны клятву да канца жыцця свайго.

*Чаму Кейстут лічыў, што вялікае княжанне ў Вільні павінна было належаць Альгерду? Як гэта характарызуе Кейстута?*



Правообладатель Народная асвета

**! Гэта цікава.** У Маскоўскім летапісе пра Альгерда гаворыцца: «Ён не піў ні віна, ні піва, меў вялікі розум і падпарадкаваў многія землі. Скрытна рыхтаваў свае паходы. Выяваў не столькі колькасцю [людзей], колькі ўмельствам».

## § 5. Барацьба з крыжацкай агрэсіяй

**Успомніце:**

*1. З якой мэтай ажыццяўляліся крыжовыя паходы ў Палесціну? 2. Хто былі іх асноўныя ўдзельнікі? 3. Якія вынікі мелі крыжовыя паходы?*

**З'яўленне ў Прыбалтыцы Тэўтонскага ордэна. Тэўтонскі ордэн** быў утвораны ў канцы XII ст. у Палесціне для барацьбы з «нявернымі». Поўная назва ордэна гучала як «Ордэн шпіталю Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Іерусаліме». «Тэўтонскім» яго называлі таму, што ў яго ўваходзілі пераважна рыцары нямецкага, ці «тэўтонскага», паходжання. У 1227 г. тэўтоны па запрашэнні мазавецкага князя з'явіліся на поўначы Польшчы для барацьбы з плямёнамі прусаў, роднасных літоўцам. Рыцары заўзята прыняліся за справу і хутка скарылі прусаў.

Пасля паражэння ў 1236 г. пад Шаўляем рыцараў Ордэна мечаносцаў, заснаванага ў Лівоніі яшчэ ў 1203 г., Папа Рымскі загадаў ім далучыцца да Тэўтонскага ордэна. Такім чынам, у Прыбалтыцы ўтварылася ажно дзве правінцыі Ордэна — пруская і лівонская, аддзеленыя адна ад адной Жамойцю. З гэтага часу крыжакі прыкладалі немалыя намаганні, каб захапіць Жамойць і злучыць свае землі.

Пасля завяршэння крыжовых паходаў у Палесціну барацьба з язычнікамі-літоўцамі стала асноўнай задачай тэўтонаў. Спачатку галоўная рэзідэнцыя Ордэна была перанесена са Святой зямлі ў Венецыю, а ў 1309 г. — у прускі замак Мальбарк. Аднак барацьба з літоўцамі аказалася справай нялёгкай: у 1260 г. жамойты ўшчэнт разбілі войскі Ордэна каля возера Дурбе. Пасля гэтага паднялі паўстанне прусы, даўно заваяваныя, але не зломленыя. Тэўтонам зноў давялося ўмацоўвацца ў Прыбалтыцы.

**Асноўныя напрамкі крыжацкай агрэсіі.** Пасля падаўлення паўстання прусаў націск крыжакоў на землі ВКЛ аднавіўся. У 1290—1294 гг. немцы арганізоўвалі сюды не менш чым па два паходы на



Правообладатель Народная асвета

год. Крыжакі рабілі свае паходы ў некалькіх напрамках. Найбольш прыцягальнымі былі для іх землі Літвы і асабліва Жамойці. Гэтыя землі былі ахоплены, як абцугамі, з абодвух бакоў: з захаду ціснулі прускія рыцары, а з усходу — лівонскія.



Крыжакі Тэўтонскага ордэна ў XIII ст.

Акрамя жадання злучыць свае землі, крыжакоў штурхаў сюды язычніцкі статус літоўскіх плямён. Існаванне любога крыжацкага Ордэна, у тым ліку Тэўтонскага, апраўдвалася толькі адной мэтай — барацьбой з «нявернымі» — мусульманамі ці язычнікамі, змаганнем за Хрыстову веру. Без гэтага Ордэн страціў бы падтрымку хрысціянскай Еўропы. Гэта падтрымка аказвалася ў выглядзе грошай і асабліва добраахвотнікамі, якія лічылі сваім абавязкам адкупіць свае грахі праз удзел у войнах з язычнікамі. Ва ўсіх буйных паходах крыжакоў аснову войска складалі не «браты» Ордэна, а так званыя «госці» — рыцары з Германіі, Чэхіі, Англіі, Францыі і іншых краін. Не былі рэдкасцю і прадстаўнікі знаці, траляліся нават будучыя каралі. На пачатку існавання Ордэна падтрымку яму аказвалі нават палякі, якія ў далейшым сталі лютымі ворагамі крыжакоў.

Гэту асаблівасць крыжацкага войска кіраўніцтва ВКЛ навучылася выкарыстоўваць вельмі хутка. Ужо Віцень умела іграў на супярэчнасцях паміж лівонскімі рыцарамі і мяшчанамі Рыгі, што на нейкі час нейтралізавала крыжакоў. Гедзімін праводзіў тонкую дыпламатычную гульню, то абяцаючы прыняць хрышчэнне, то адмаўляючыся ад сваіх абяцанняў. Аднак галоўным у супрацьстаянні крыжацкай агрэсіі была ўсё ж узброеная барацьба беларускага і літоўскага народаў.

Абвяшчаючы сябе змагарамі за веру, крыжакі нападалі і на беларускія землі. Беларускае Панямонне ўжо з канца XIII ст. стала арэнай



Правообладатель Народная асвета



Вершнік войска ВКЛ. XIVст.

няспынных паходаў прускага рыцарства. Асабліва часта быў атакаваны горад Гродна. Упершыню крыжакі напалі на яго ў 1284 г., потым у 1295 г., двойчы ў 1296 г., тройчы ў 1311 і 1328 гг. Пазней крыжакі нападалі і на больш аддаленыя гарады, даходзячы да Ліды, Брэста, Камянца. Землі Беларускага Панямоння баранілі не толькі славяне, але і літоўцы, а таксама прусы, паселеныя ў Гродне і Слоніме.

Падчас паходаў крыжакі стараліся замацавацца на захопленай тэрыторыі, хутка пабудаваўшы тут замкі, якія служылі апорай для далейшых паходаў. У адказ вялікія князі літоўскія, асабліва Віцень і Гедзімін, стараліся ўзвесці магутны абарончы пояс, які стваралі замкі ў Гродне, Навагрудку, Лідзе, Крэве і іншых гарадах.

Часам даходзіла і да буйных бітваў. У **1348** г. беларуска-літоўскае войска сутыкнулася з нямецкімі рыцарамі на рацэ *Стрэве* (прыток Нёмана). На дапамогу крыжакам прыбылі наёмнікі — рыцары з Францыі і Англіі. Войска ВКЛ было ўзмоцнена палкамі з Брэста, Полацка, Віцебска, Смаленска. Бітва на Стрэве насіла вельмі жорсткі характар. Нягледзячы на вялікія страты абодвух бакоў, бітва скончылася практычна безвынікова, хоць нямецкія рыцары распаўсюджвалі чуткі аб сваёй перамозе.

**Стараста Давыд Гарадзенскі.** Вялікую славу ў час абароны ад крыжакоў Беларускага Панямоння набыў гродзенскі кашталян Давыд. Ужо ў 1305 г. разам з Гедзімінам ён разбіў нямецкія войскі каля Гродна, а ў наступным годзе ўзначаліў паспяховую абарону гэтага горада ад тэўтонаў.



Правообладатель Народная асвета

У 1314 г. у час нападу крыжакоў на Навагрудак Давыд знішчыў увесь нямецкі абоз, забраў варожых коней і прымусіў рыцараў уцякаць назад. Мала хто з крыжакоў вярнуўся дамоў, большасць палегла ад голаду і ад зброі воінаў Давыда.

Неўзабаве Давыд ужо сам узначаліў паход на Прусію, а потым — на саюзную крыжакам Мазовію. Слава Давыда грымела далёка за межамі ВКЛ і ў 1322—1324 гг. ён неаднаразова бараніў Пскоў ад лівонскіх і дацкіх рыцараў, даходзячы да Рэвеля (сучасны Талін).

У 1326 г. па даручэнні Гедзіміна Давыд узначаліў войска ВКЛ, якое ўдзельнічала ў сумесным з палякамі паходзе на Брандэнбург і Франкфурт-на-Одэры. Падчас гэтага паходу Давыд быў забіты мазавецкім рыцарам Андрэем Гостам. Паводле адной з версій, ён помсціў за разарэнне Давыдам Мазовіі, а паводле другой — быў падкуплены крыжакамі.

**Князь Андрэй Полацкі.** У 60—70-я гады XIV ст. арэнай барацьбы з крыжакамі сталі землі Беларускага Падзвіння, куды неаднаразова скіроўваліся паходы лівонскіх рыцараў. Цэнтрам абароны Падзвіння стаў Полацк, дзе з 1348 г. княжыў Андрэй Альгердавіч. Ужо ў 1366 г. Полацку давялося вытрымаць аблогу крыжакоў на чале з лівонскім магістрам. А ў 1373 г. палачане самі зрабілі паход на Лівонію. У далейшым Андрэй вёў асноўныя ваенныя дзеянні з крыжацкім горадам Дынабургам (цяпер Даўгаўпілс у Латвіі), які знаходзіўся паблізу ад Полацка і пастаянна пагражаў яму. Не раз сілы палачан пустошылі ваколіцы Дынабурга і іншых крыжацкіх замкаў.

У 1375 г. быў зроблены вялікі паход у Лівонію з удзелам палачан, літоўцаў, віцебскіх і смаленскіх палкоў. У тым жа годзе паход быў паўтораны толькі сіламі палачан. Крыжацкі храніст адзначаў, што вынікі гэтага паходу адчуваліся ў Дынабургу на працягу цэлага года.

Для больш паспяховай барацьбы з лівонскімі рыцарамі палачане збудавалі каля Дынабурга «Новы замак» (цяпер гэта Друя). Спробы знішчыць яго крыжакі рабілі ў 1376 і 1377 гг. Рыцары абстрэльвалі замак з камнямётаў і бамбард, але мусілі вярнуцца назад ні з чым.



Правообладатель Народная асвета

У далейшым Андрэй быў уцягнуты ў дынастычную барацьбу і прыпыніў ваенныя дзеянні з крыжакамі. Скончыў жыццё славуты князь на полі бою падчас бітвы з татарамі на рацэ Ворскла.

**Пытанні і заданні**

1. Калі і з якой мэтай Тэўтонскі ордэн з'явіўся ў Прыбалтыцы? 2. Якія беларускія гарады часцей за ўсё падвяргаліся нападам крыжакоў? 3. Якія спосабы выкарыстоўваліся для супрацьстаяння крыжакам? Які з іх з'яўляецца, на вашу думку, галоўным? 4. Прывядзіце прыклады барацьбы беларускага і літоўскага народаў супраць крыжакоў. Складзіце храналагічную табліцу «Барацьба беларускага народа супраць крыжацкай агрэсіі». 5. Чым праславіліся Давыд Гарадзенскі і Андрэй Полацкі? Дайце ацэнку іх дзейнасці. 6. Якія вынікі мела барацьба супраць крыжакоў на беларускіх землях у XIV ст.?

## Гістарычная крыніца

### З нямецкай хронікі

У 1333 г. магістр [Эбергард] са шматлікім войскам на лодках быў каля Полацка.

У 1334 г. гэты ж магістр... павёў шматлікае войска да Полацка.

У 1366 г. гэты ж магістр... павёў войска супраць русінаў на Полацк.

У той жа год [1373] Андрэй, князь полацкі, быў са сваімі людзьмі перад замкам Дынабург, дзе ён захапіў некалькі нашых [немцаў] з іх коньмі і павёў з сабой.

...У той жа [1375] год... князь Андрэй Полацкі рушыў з усёю сваёй конніцай і людзьмі да замка Дынабург... Ён таксама вывеў з сабой 15 сялян і коней. Апрача таго, ён забраў камандорскую жывёлу на забой, у якой [нямецкі] камандор пасля меў патрэбу цэлы год.

*Каго называе «русінамі» аўтар нямецкай хронікі? Што прымушала Андрэя Полацкага намагацца, каб выбіць немцаў з Дынабурга?*

**Да ўрока «Наш край».** Ці давялося жыхарам мясцовасці, у якой вы жывяце, сутыкнуцца з крыжакамі?



Правообладатель Народная асвета

## § 6. Збліжэнне Вялікага княства Літоўскага з Польшчай

**Успомніце:**
*1. Хто стаў вялікім князем літоўскім пасля смерці Альгерда? 2. Чаму ўлада Ягайлы была недастаткова моцнай?*

**Прычыны збліжэння ВКЛ і Польшчы.** Становішча Ягайлы было вельмі няўстойлівым. Асабліва пагоршылася яно пасля ад'езду ў Прусію Вітаўта. З яго дапамогай крыжакі спадзяваліся ўсталяваць свой поўны кантроль над Літвой, таму яны больш не былі зацікаўлены ў падтрымцы Ягайлы. У сваю чаргу Вітаўт, які карыстаўся ў ВКЛ вялікай папулярнасцю, спадзяваўся выкарыстаць немцаў для барацьбы з забойцам свайго бацькі. Для захавання сваёй улады Ягайлу трэба было тэрмінова шукаць саюзнікаў. Ён нават спрабаваў заключыць саюз з Масквой, але Дзмітрый Данскі, разумеючы нетрывалыя пазіцыі Ягайлы, прапанаваў умовы, абсалютна непрымальныя для ВКЛ. Ягайла павінен быў прызнаць ледзь не васальную залежнасць ад Дзмітрыя.

Позіркі Ягайлы звярталіся і ў заходні бок. Шукаліся шляхі збліжэння з крыжакамі і Вітаўтам. Аднак крыжакі жадалі адхіліць Ягайлу ад улады і замяніць яго на Вітаўта. Пры гэтым будучаму вялікаму князю выстаўляліся пэўныя ўмовы: ён павінен быў прыняць каталіцтва, перадаць Тэўтонскаму ордэну Жамойць і прызнаць сваю васальную залежнасць ад крыжакоў.

Ягайла, у сваю чаргу, прапанаваў Вітаўту спадчыну Кейстута — усю заходнюю частку ВКЛ. Для гэтага Вітаўт павінен быў адмовіцца ад саюза з немцамі і перайсці ў праваслаўе. У 1384 г. Вітаўт прыняў прапанову Ягайлы, знішчыў даручаныя яму крыжацкія замкі і вярнуўся на радзіму. Але Ягайла падмануў Вітаўта, перадаўшы яму толькі частку ўладанняў бацькі — заходнебеларускія землі з гарадамі Гродна, Брэст, Камянец. Напружанасць паміж Вітаўтам і Ягайлам захоўвалася.

У гэты час у Ягайлы нечакана з'явіўся новы саюзнік — Польшча, дзе памёр кароль, не пакінуўшы пасля сябе сыноў. Дзве яго дачкі былі заручаны з нямецкімі прынцамі, а значыць, адзін з іх павінен быў у будучым стаць гаспадаром Польскага Каралеўства. Гэта



Правообладатель Народная асвета

азначала б для палякаў катастрофу, бо немцы і без таго валодалі значнай часткай польскіх зямель.

Пагоршыліся адносіны Польшчы і з Тэўтонскім ордэнам. У пачатку XIV ст. крыжакі авалодалі польскім узбярэжжам Балтыйскага мора. Саюз Германскай імперыі з крыжакамі мог прывесці да канчатковага знікнення польскай дзяржаўнасці.

У гэтых умовах палякі сталі шукаць такога мужа для будучай каралевы, які б захаваў Польшчу і дапамог бы ёй у барацьбе са знешнімі ворагамі. Выбар спыніўся на Ягайле. Для гэтага было некалькі прычын. Па-першае, Ягайла таксама быў зацікаўлены ў саюзніках, якія б дапамаглі яму захаваць уладу. Па-другое, ВКЛ было спрадвечным ворагам нямецкіх крыжакоў, а значыць — натуральным саюзнікам Польшчы. Па-трэцяе, калі б Ягайла хрысціў Літву ў каталіцтва, гэта падняло б аўтарытэт палякаў, бо ім удалося б зрабіць тое, што стагоддзямі не ўдавалася немцам.

**Крэўская унія.** У **1385** г. у замку *Крэва* (цяпер вёска Смаргонскага раёна Гродзенскай вобл.) была заключана **унія** (саюз) Вялікага княства Літоўскага і Польскага Каралеўства. Ягайла павінен быў ажаніцца з польскай каралевай Ядвігай і стаць польскім каралём. Узамен ён і іншыя князі ВКЛ далі абяцанне хрысціць язычніцкую Літву ў каталіцтва і «на вечныя часы далучыць свае землі, літоўскія і рускія, да Кароны Польскай». Пад «рускімі землямі» меліся на ўвазе ў першую чаргу землі Беларусі і часткова Украіны. Былі сярод умоў уніі і іншыя: перавезці ўсе скарбы ВКЛ з Вільні ў Кракаў, дапамагчы Польшчы вярнуць страчаныя землі, выпусціць усіх польскіх палонных, захопленых у папярэдніх войнах. Не забыліся палякі нават на такі пункт, як выплата значнай сумы грошай нямецкаму прынцу Вільгельму Габсбургу за сарваны шлюб з Ядвігай.



Крэўскі замак. *Рэканструкцыя*

У наступным годзе Ягайла прыступіў да выканання ўмоў уніі. Ён быў абраны польскім каралём і



Правообладатель Народная асвета

застаўся вялікім князем літоўскім. Ягайла прыняў каталіцтва, атрымаў імя Уладзіслава II, ажаніўся з польскай каралевай Ядвігай і быў каранаваны.

У *1387 г.* адбылося хрышчэнне літоўскага насельніцтва па каталіцкім абрадзе. Пасля заключэння уніі Ягайла выдаў **прывілей**, які даваў феадалам дадатковыя правы і вольнасці пры ўмове прыняцця каталіцтва. Гэты прывілей не распаўсюджваўся на праваслаўных феадалаў.



Вялікі князь літоўскі (1377—1392 гг.) і кароль польскі (1386—1434 гг.) Ягайла. *Малюнак XV ст.*

**Вынікі Крэўскай уніі.** Заключэнне **персанальнай уніі** — *аб'яднання дзвюх дзяржаў пад уладай аднаго манарха* — не прынесла ВКЛ палітычнага міру. Далучэнне дзяржавы да Польшчы выклікала шырокае незадавальненне літоўскіх і «рускіх» феадалаў. Прыняцце Ягайлам каталіцтва выклікала пратэст праваслаўнага насельніцтва. Ужо ў час вясельных урачыстасцей у Кракаве на беларускіх землях успыхнула паўстанне, якое ўзначаліў Андрэй Полацкі. Паўстанне было задушана, аднак неўзабаве барацьбу супраць Ягайлы ўзначаліў Вітаўт. Ён зноў уцёк да крыжакоў і заключыў з імі саюз.

У ходзе зацятай барацьбы з Вітаўтам Ягайла пераканаўся ў яе безвыніковасці і скрытна пачаў перагаворы з мяцежным князем. У выніку за вяртанне Вітаўта Ягайла згаджаўся перадаць яму не толькі спадчыну Кейстута, але і ўладу ва ўсім Вялікім княстве Літоўскім. Вітаўт зноў вярнуўся ў ВКЛ, але за гэта яму давялося заплаціць смерцю сыноў, якіх крыжакі трымалі ў якасці заложнікаў.

У **1392** г. было заключана *Востраўскае пагадненне* паміж Ягайлам і Вітаўтам. Вітаўт рабіўся вялікім князем літоўскім, але



Правообладатель Народная асвета

празнаваў залежнасць ад Ягайлы. Пераадоленне гэтай залежнасці стала асноўнай мэтай усяго яго доўгага праўлення.

Крэўская унія мела важныя вынікі для ўсяго Вялікага княства Літоўскага. Саюз дзвюх дзяржаў значна павялічыў іх абараназдольнасць. Ён садзейнічаў росту культурных і іншых сувязей паміж імі, а таксама з іншымі краінамі Заходняй Еўропы. Але з Крэўскай уніі пачаліся і адмоўныя з'явы для нацыянальна-культурнага развіцця беларускага народа. Праваслаўнаму насельніцтву давялося змагацца за такія ж правы, якія атрымалі каталікі.

Крэўская унія дапамагла ВКЛ у барацьбе з крыжакамі, аднак яна парадзіла новыя супярэчнасці з Польшчай. Палякі пастаянна патрабавалі захавання пункта уніі, які абвяшчаў поўнае далучэнне ВКЛ да Польшчы. Аднак беларускія і літоўскія феадалы жадалі захаваць самастойнасць сваёй дзяржавы. У рэшце рэшт на працягу XV—XVI стст. было заключана некалькі новых уній. Апошняя з іх, заключаная ў 1569 г. у Любліне, прывяла да страты ВКЛ сваёй незалежнасці і ўтварэння аб'яднанай дзяржавы — Рэчы Паспалітай.

**Пытанні і заданні**

1. Якія прычыны прывялі да збліжэння Вялікага княства Літоўскага і Каралеўства Польскага? 2. Калі была заключана Крэўская унія? Назавіце яе асноўныя ўмовы. 3. Ці здолела ВКЛ захаваць самастойнасць пасля заключэння Крэўскай уніі? 4. Якія вынікі для ВКЛ мела прыняцце Крэўскай уніі? 5. Як змянілася рэлігійнае становішча ў краіне пасля заключэння Крэўскай уніі? 6. Калі было заключана Востраўскае пагадненне? Хто яго падпісаў, з якой мэтай? 7. Якія станоўчыя і адмоўныя вынікі мела збліжэнне Вялікага княства Літоўскага з Польшчай?

## Гістарычная крыніца

### З акта Ягайлы і яго братоў аб саюзе Літвы з Польшчай

*Выдадзены ў Крэве 14 жніўня 1385 г.*

Мы, Ягайла, з ласкі Божай вялікі князь літоўскі, рускі гаспадар прыроджаны, абвяшчаем усім, каму належыць, і тым, якія гэты ліст бачыць будуць, тое, пра што нам паведамілі... Ягайла, як асвечаны князь літоўскі, выправіў сваіх паўнамоцных паслоў... да яе каралеўскай вялікасці... Паслы яго..., стаўшы перад каралевай венгерскай, гэтак, выкладаючы справу, гаварылі: «Многа цэзараў, каралёў і розных князёў прагнулі завязаць сталыя стасункі з тым



Правообладатель Народная асвета

жа вялікім князем літоўскім; але Бог усёмагутны наканаваў гэта асобе вашай каралеўскай ягамосці. Таму, найяснейшая пані,... вазьмі вялікага князя Ягайлу за сына і аддай яму ў жонкі найбольш каханую дачку сваю Ядвігу, каралеву польскую. ...Вялікі князь Ягайла... прагне прыняць веру каталіцкую святога рымскага Касцёла... Той жа вялікі князь Ягайла абяцае і гарантуе ўласным коштам і стараннем вярнуць каралеўству польскаму ўсе краі, кім бы яны ад яго не адарваны і забраны... Нарэшце, той жа вялікі князь Ягайла абяцае землі свае літоўскія і рускія на вечныя часы да кароны каралеўства польскага далучыць».

*Якія абяцанні даваў Ягайла пры заключэнні уніі з Каралеўствам Польскім?*

! **Гэта цікава.** Ядвіга яшчэ да Крэўскай уніі была заручана з маладым нямецкім прынцам Вільгельмам Габсбургам, якога паспела пакахаць. Пасля спаўнення паўналецця Ядвігі Вільгельм прыехаў да яе, каб уступіць у шлюб, аднак быў выгнаны польскімі панамі. Няшчасная Ядвіга спрабавала дагнаць свайго каханага, аднак, замкнутая ў пакоі, праз нейкі час мусіла згадзіцца на шлюб з немаладым і не вельмі жаданым Ягайлам.

## § 7. Дзяржаўны лад ВКЛ у сярэдзіне XIII—XIV ст.

**Успомніце:**
*1. Якія адносіны называюцца васальнымі? Растлумачце значэнне паняццяў «васал» і «сюзерэн»? 2. Што такое веча? Хто меў права ўдзельнічаць у вечы ў Полацкім княстве? Якія пытанні вырашаліся на вечы ў Полацку?*

**Тэрытарыяльны падзел ВКЛ.** На момант стварэння Вялікага княства Літоўскага на беларускіх землях існаваў тэрытарыяльны падзел, які склаўся яшчэ ў папярэднія часы. Заходнія землі Русі ў перыяд высокага сярэдневякоўя складаліся з адзінак, вядомых у пісьмовых крыніцах пад назвамі «зямля» і «воласць». На чале іх знаходзіліся князі, таму даследчыкі называюць іх **княствамі**. У XIII—XIV стст. захоўваліся старыя межы, якія існавалі паміж асобнымі княствамі да ўтварэння ВКЛ.



Правообладатель Народная асвета



Пячатка Кейстута

Вялікія, значныя па плошчы княствы называліся *землямі*, больш дробныя ўдзельныя княствы — *воласцямі*. Сельскія паселішчы (абшчыны) называліся словам *весь* (адсюль беларуская назва «вёска»). Аднак у сярэдневякоўі для абазначэння вёсак звычайна выкарыстоўвалася назва *сяло*.

Да канца XIV ст. фарміраванне тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага было ў асноўным завершана. У гэты час тэрыторыя дзяржавы падзялялася на дзве часткі — Літву і Русь. Пад **Літвой** разумелася не толькі сучасная Літва, але і беларускія землі ў Панямонні, якія ў XIII ст. таксама складалі ядро дзяржавы. Тэрмін **Русь** абазначаў беларускія, украінскія і рускія землі, далучаныя ў XIV ст.

У 1345 г. Альгерд, захоўваючы вярхоўную ўладу ў краіне, падзяліў дзяржаву на дзве часткі паміж сабой і сваім братам Кейстутам. Альгердава частка з цэнтрам у сталіцы ВКЛ — Вільні — уключала Усходнюю Літву і большую частку Беларусі з гарадамі Віцебск, Лагойск, Мінск, Полацк, Слуцк, Мсціслаў. Улада Кейстута распаўсюджвалася на заходнюю частку Літвы з Жамойцю і беларускімі гарадамі Брэст, Ваўкавыск, Камянец, Гродна, Навагрудак, Слонім.

З утварэннем ВКЛ удзельныя князі трапілі ў васальную залежнасць ад вялікага князя літоўскага і ператварыліся ў яго васалаў. Яны захоўвалі пэўную самастойнасць ва ўнутраных справах, але павінны былі ўдзельнічаць ва ўсіх ваенных паходах вялікага князя. Страціўшы дзяржаўную ўладу, яны, аднак, як прадстаўнікі вышэйшага пануючага класа засталіся буйнымі землеўладальнікамі ў Вялікім княстве Літоўскім.

**Дзяржаўны лад і кіраванне.** Вялікае княства Літоўскае з'яўлялася **манархіяй**. Першы яе кіраўнік — Міндоўг — нават здолеў атрымаць каралеўскі тытул. Яго пераемнікі з'яўляліся **гаспадарамі**, ці **вялікімі князямі**, хоць у міжнароднай перапісцы яны таксама ча-



Правообладатель Народная асвета



Выявы з пячатак князёў ВКЛ. XIV—XV стст.

сам называліся *каралямі*. Гаспадар узначальваў узброеныя сілы, мог уступаць у саюзы з іншымі дзяржавамі, абвяшчаць вайну, заключаць мір. У яго руках было заканадаўства.

У канцы XIII—XIV ст. пры вялікім князі існавала **гаспадарская рада**, якая была дарадчым органам. У раду гаспадар уключаў уплывовых, карысных і патрэбных яму людзей, звычайна сваіх родзічаў. Напачатку ў радзе значную ролю адыгрывалі ўдзельныя князі.

У непасрэдным кіраванні вялікіх князёў знаходзілася толькі невялікая частка зямель, якая складала іх *дамен*. 70—75 % тэрыторыі дзяржавы складалі **вотчыны** і **ўдзелы** іншых князёў. Некаторыя з іх былі нашчадкамі роду Рурыкавічаў, якія спрадвек валодалі сваімі княствамі. Яны працягвалі кіраваць у сваіх удзелах разам са сваімі баярамі. Такімі былі князі Друцкія, Лукомскія і інш.

Паступова становішча пачало змяняцца. Вялікі князь Гедзімін яшчэ пры жыцці практыкаваў раздачу некаторых нанава далучаных тэрыторый сваім сынам на правах удзельнага княжання. Пасля смерці Гедзіміна ўсё Вялікае княства Літоўскае было падзелена на восем удзелаў. Сем удзелаў дасталіся сынам Гедзіміна. Восьмы, полацкі, удзел, атрымаў яго пляменнік. Унукі і праўнукі Гедзіміна таксама валодалі ўдзельнымі княствамі. Сыны Альгерда атрымалі буйныя ўладанні ў землях Русі: Андрэй — Полацкае княства, Дзмітрый — Бранскае, Уладзімір — Кіеўскае і г. д.

Некаторыя воласці кіраваліся велікакняжацкімі **намеснікамі** — *прадстаўнікамі вялікага князя, якія валодалі адміністрацыйна-гаспадарчай, фінансавай і судовай уладай*. Так, ужо з сярэдзі-



Праваабладатель Народная асвета

ны XIV ст. велікакняжацкія намеснікі сядзелі ў Менску, Ваўкавыску, Брэсце, Слоніме і інш.

Вядучае становішча ў дзяржаве займалі *цэнтральныя землі*. Як ужо гаварылася, у гістарычных дакументах яны маюць агульную назву — Літва. У іх знаходзілася асноўная колькасць велікакняжацкіх і дзяржаўных маёнткаў. Адсюль набіралася асноўная частка арміі ВКЛ. Да *«прыслухаючых» (сумежных) зямель* адносіліся: Кіеўская, Чарнігаўская, Смаленская, Полацкая, Віцебская землі, Жамойць і інш.

Сістэма кіравання ВКЛ прадугледжвала значную самастойнасць «прыслухаючых» княстваў. Адносіны паміж цэнтрам і сумежнымі землямі грунтаваліся на залежнасці князёў асобных зямель ад вялікага князя літоўскага. Гэта былі адносіны паміж сюзерэнамі і васаламі.

**Мясцовыя органы ўлады.** Мясцовае кіраванне ажыццяўлялася на ўзроўні зямель, валасцей і абшчын. Асноўную частку тагачаснага насельніцтва складалі сяляне, якія жылі абшчынамі. *Сельская абшчына* рэгулявала адносіны сваіх членаў да зямлі. Зямля, якая апрацоўвалася сялянамі, была замацавана ў іх карыстанні як **надзел**. Некалькі абшчын складалі *валасць*. Валасць разам з дзяржавай і феадалам выконвала адміністрацыйна-палітычныя функцыі. У валасці былі пасады *цівуноў*, *сотнікаў*, *старцаў*. Гэтыя пасады займалі ў большасці выпадкаў заможныя сяляне. Яны вялі нагляд за зборам даніны, за абаронай сялян ад рознага роду крыўдаў.

У беларускіх землях існавала тыповая для часоў перыяду феадальнай раздробленасці форма самакіравання — **веча**. Яно ўяўляла сабой сход гараджан, на які збіраліся таксама свабодныя жыхары суседніх сёл. У вечы прымалі ўдзел і мясцовыя князі. Веча выконвала ролю судовай і адміністрацыйнай улады не толькі ў горадзе, але і яго прадмесцях. Яно выдавала пастановы, абавязковыя для ўсяго насельніцтва. Асабліва актыўна дзейнічала веча ў Полацку, Смаленску і іншых буйных гарадах усходніх славян.

### Пытанні і заданні

1. Які быў тэрытарыяльны падзел ВКЛ у сярэдзіне XIII—XIV ст.? 2. Якія тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага называлі Літвой, якія — Руссю? 3. Як было арганізавана кіраванне дзяржавай пры Альгердзе і Кейстуце? 4. Што ўяўляў сабой дзяржаўны лад ВКЛ? Якія органы кіравання дзяржавай існавалі ў



Правообладатель Народная асвета

ВКЛ у канцы XIII—XIV ст.? 5. Якія функцыі выконвалі вялікі князь, гаспадарская рада? 6. Якія тэрыторыі з'яўляліся цэнтральнымі землямі, якія — «прыслухаючымі»? Як вы лічыце, чаму «прыслухаючыя» княствы валодалі значнай самастойнасцю? 7. Як ажыццяўлялася кіраванне сельскай абшчынай, воласцю, зямлёй? 8. Як ажыццяўлялася кіраванне ў гарадах?

**Гістарычная крыніца**

**З Густынскага летапісу**

У год 1276. Пачаў княжыць у Літве Віцень, учыніў сабе герб і ўсяму княству Літоўскаму пячатку — узброены рыцар на кані з мячом, што цяпер называюць «Пагоня».

*Ці можна лічыць, што з 1276 г. «Пагоня» стала агульнадзяржаўным гербам Вялікага княства Літоўскага?*

**Да ўрока «Наш край».** Вызначце, чыімі ўладаннямі была мясцовасць, у якой вы жывяце, у сярэдзіне XIV ст. — Альгерда ці Кейстута.

## § 8. Гаспадарчае жыццё

**Успомніце:**

*1. Што такое падсечна-агнявое земляробства? 2. Якую гаспадарку называюць натуральнай? 3. Якія гарады існавалі на беларускіх землях у IX—XIII стст.?*

**Сельскагаспадарчыя занятки і промыслы.** У беларускай вёсцы XIII—XIV стст. амаль усё неабходнае для жыцця людзі працягвалі, як і раней, вырабляць у сваёй гаспадарцы. Але з ростам колькасці насельніцтва значна ўзрасла патрэба ў прадуктах харчавання.

Сталі пашырацца пасяўныя плошчы і распаўсюджвацца *трохполле*. Цяпер раллю ўжо дзялілі не на два, а на тры ўчасткі. Адно поле засявалі восенню азімай зба-



Жніво. *Гравюра Францыска Скарыны. 1519 г.*



Правообладатель Народная асвета

жыной, другое — яравымі, а трэцяе пакідалі незасеяным, пад папарам.

Першае месца сярод зерневых культур належала азімаму жыту. Сяляне сеялі таксама проса, пшаніцу, ячмень, авёс, грэчку, лён, вырошчвалі боб, гарох і розную гародніну.

Важнай галіной сельскагаспадарчай вытворчасці з'яўлялася жывёлагадоўля. Гадавалі буйную рагатую жывёлу (каровы, валы), дробную рагатую жывёлу (авечкі, козы), свіней, коней, трымалі катоў, сабак.

*Дапаможным заняткам* сельскага насельніцтва заставалася паляванне, рыбалоўства. Паўсюдна існавала бортніцтва.

Па-ранейшаму сельская гаспадарка была звязана з *хатнімі промысламі*. Сялянская сям'я звычайна вырабляла прылады працы, посуд, палатно, грубае сукно, адзенне, абутак і інш. Пастунова з сялян вылучаліся майстры, для якіх рамяство станавілася асобным заняткам.

**Прылады працы.** У сярэдневякоўі прылады працы для земляробства выраблялiся з дрэва. Толькі асобныя іх часткі былі жалезнымі. На тэрыторыі Беларусі была распаўсюджана драўляная саха з двума металічнымі сашнікамі. Саха больш прыстасавана да ўмоў лясной паласы. Яна добра рыхліла зямлю і падразала карэнне пустазелля, што неабходна пры вядзенні папаравай сістэмы земляробства.

Ураджай збіралі жалезнымі сярпамі. Па памерах і форме яны набліжаліся да прылад, якімі карысталіся нават у пачатку XX ст. Зерне намалочвалі ручным спосабам драўлянымі цапамі. Зерне на муку малолі пры дапамозе каменных жорнаў, якія мелі дыяметр да 35 см. Крупы выраблялiся ў ручных і нажных драўляных ступах.

Лён і каноплі апрацоўвалі на iльнамялках, часалі вялікімі драўлянымі грабянямі.

**Сельскія паселішчы.** Сельскія паселішчы называліся *сёламі* ці *вёскамі*. Вёскі размяшчаліся на берагах рэк і азёр. У рачных і азёрных далінах былі больш зручныя для земляробства ўчасткі, лугі і выпасы, неабходныя для ўтрымання хатняй жывёлы.

Вёскі складаліся з сялянскіх двароў — **дымоў**. У забудову сялянскага двара ўваходзіла хата і некалькі гаспадарчых будынкаў: клецьсвіран, хлеў, гумно. Двары размяшчаліся асобна адзін ад аднаго ці групамі па 2—8 двароў. Планіроўка такіх вёсак была бессістэмнай.



Правообладатель Народная асвета

**Гарады.** У XIV ст. адбываецца не вельмі хуткі, але прыкметны рост гарадоў. Павялічваюцца іх памеры і колькасць насельніцтва. Пашыраліся па плошчы Віцебск, Слуцк, Мінск, Навагрудак, Гродна, Брэст. Асабліва хутка развіваўся Полацк — буйнейшы гандлёвы горад Вялікага княства Літоўскага. Тут, на левым беразе Заходняй Дзвіны, утварыліся тры новыя пасады, заселеныя рамеснікамі, купцамі і іншым людам.

Гарадское насельніцтва расло галоўным чынам за кошт сялян, якія ў гарадскіх пасадах шукалі лепшай долі. Асабліва вабілі гарады тых людзей, якія валодалі рамеснымі навыкамі. Найбольш значныя гарады станавіліся важнымі цэнтрамі рамяства і гандлю. Рамяство развівалася і ў некаторых дробных населеных пунктах, якія раней былі крэпасцямі, замкамі, гаспадарскімі дварамі. Такія з'явы назіраліся ў Оршы, Быхаве, Бабруйску, Лідзе, Маладзечне. Вакол замкаў складваліся новыя пасады з вуліцамі, што сцякаліся да замкавых сцен.

Развіццё гандлю стрымлівала натуральная гаспадарка. Набыць рамесніцкія вырабы магла толькі абмежаваная колькасць пакупнікоў. Таму большасць рамеснікаў не прадавала тавары, а выраблялa іх на заказ ці абслугоўвала феадалаў.

**Спецыяльнасці рамеснікаў і іх вырабы.** Адной з прыкмет росту горада было развіццё рамяства. Павялічвалася колькасць рамеснікаў, узрастала колькасць рамесных спецыяльнасцей. Удасканальвалася тэхніка, узрасталі колькасць і якасць прадукцыі, яе асартымент, пашыралася вытворчасць.

Важнай галіной рамяства ў гарадах заставалася апрацоўка металаў, у першую чаргу кавальская справа. Сярод рамеснікаў былі не толькі кавалі, але з'явіліся слесары, якія стваралі складаныя вырабы, напрыклад замкі для замыкання дзвярэй, скрынь, куфраў.

Высокага ўзроўню дасягнула ювелірная справа. З серабра і золата ювеліры выраблялі каштоўныя ўпрыгожанні. Гэтыя металы выкарыстоўваліся таксама для афармлення царкоўных кніг.



Ключ XIV — XV стст.



Правообладатель Народная асвета



Сякера XIII ст.

Прыкладам высокага майстэрства ювеліраў з’яўляецца абклад Лаўрышаўскага евангелля XIV ст.

У XIV ст. адбываліся перамены ў гарбарным (апрацоўка шкур) і шавецкім (шыццё скуранога абутку) рамястве. Гэтыя дзве галіны рамяства канчаткова раздзяліліся. У ботах і чаравіках стаў рабіцца цвёрды заднік, што паляпшала вырабы, а потым навучыліся прымацоўваць да яго абцас, спачатку зусім невысокі.

З’явілася яшчэ адна галіна рамяства — рымарства. Галоўным заняткам рымараў стала шыццё хамутоў. З прымяненнем хамута вырасла працаздольнасць каня на раллі. Адначасова пашырыліся магчымасці гужавога (коннага) транспарту, у якім ужываліся простыя колавыя павозкі.

Для пабудовы сярэдневяковых замкаў патрабавалася шмат будаўнічых матэрыялаў: цэглы, кафлі, чарапіцы для пакрыцця дахаў. З канца XIII ст. ва ўжытак уваходзіць вялікапамерная цэгла, якая выраблялася беларускімі майстрамі. З такой цэглы ўзводзіліся Камянецкая вежа, Лідскі і Гродзенскі замкі, пабудовы ў Полацку, Навагрудку. Прымяненне цэглы вялікага фармату паскарала тэмпы будаўніцтва. У пачатку XIV ст. на Беларусі пры пабудове печаў пачынае выкарыстоўвацца так званая гаршкападобная кафля, якая дапамагала лепш зберагчы цяпло.

**Пытанні і заданні**

1. Назавіце асноўныя і дапаможныя заняткі і хатнія промыслы сельскага насельніцтва. 2. Якая сістэма апрацоўкі зямлі называецца трохполлем? Зрабіце схему трохполля. Якія прылады працы выкарыстоўваліся для земляробства ў сярэдневякоўі на беларускіх землях? 3. Якія зерневыя культуры высявалі на тэрыторыі Беларусі ў XIII—XIV стст.? 4. Чаму вёскі часта размяшчаліся на берагах рэк і азёр? 5*. Апішыце ці замалюйце забудову сялянскага двара. Параўнайце двор сярэдневяковага селяніна з сучасным. 6. Якія прычыны садзейнічалі росту гарадоў на беларускіх землях? 7. Якія існавалі рамесныя спецыяльнасці? 8. Параўнайце развіццё гаспадаркі на беларускіх землях і ў Заходняй Еўропе ў XIII—XIV стст.



Правообладатель Народная асвета

**Гістарычная крыніца**

**З Баркулабаўскай хронікі**

У год 1587 была зіма вельмі снежная, з моцнымі маразамі ды вялікімі завеямі. Гэткая ж і вясна была вельмі няўстойлівая, рэдкі дзень мінаваў без снегу… А потым, на чацвёртым тыдні па свяце, ноччу былі жахі вялікія: навальнічныя дажджы дамы падмылі, дахі пазносілі, людзі ўсю тую ноч спаць не маглі. На палях статкі ў пастухоў градам пабіла, а ў лесе жывёлу дрэвамі пазабівала…

*Як прыродныя з'явы ўплывалі на стан сельскай гаспадаркі?*

**Гэта цікава.** Важнай часткай вупражы каня з'яўляецца хамут. Дакладна невядома, калі ён з'явіўся ў гаспадарцы ўсходніх славян. Пры археалагічных раскопках у Віцебску рэшткі хамута знойдзены ў напластаванні XV ст. Напэўна, у познім сярэдневякоўі хамут ужо выкарыстоўваўся, што садзейнічала паляпшэнню земляробства і ўжыванню колавых павозак. Драўлянае кола ад павозкі знойдзена пры раскопках у Мінску, Полацку, Брэсце ў пластах XII—XIII стст.

**Да ўрока «Наш край».** Якія рамесныя спецыяльнасці існавалі ў мясцовасці, дзе вы пражываеце, у XIV ст.?

## § 9. Этнічнае і канфесійнае становішча ў ВКЛ

**Успомніце:**
*1. Калі было прынята ў Кіеве хрысціянства паводле візантыйскай традыцыі? 2. Калі была ўтворана Полацкая епархія?*

**ВКЛ як шматэтнічная дзяржава.** У пачатку XIII ст. на тэрыторыі ўсходняй Прыбалтыкі пражывалі балты. Сярод балцкіх плямён вядомы аўкштайты, жамойты, куршы, прусы, яцвягі, латгалы і г. д. Паступова адбываўся працэс зліцця плямён у саюзы. У XIII—XIV стст. на аснове аўкштайтаў і жамойтаў складвалася літоўская народнасць, у якую ўліліся і некаторыя іншыя балцкія плямёны, не захопленыя да таго часу крыжакамі.



Правообладатель Народная асвета

У X—XI стст. славянскія плямёны крывічоў, дрыгавічоў і валынян каланізавалі Верхняе Панямонне, раней заселенае балтамі, і заснавалі свае гарады: Гродна, Навагрудак, Ваўкавыск, Слонім і інш. На ўсход ад літоўцаў у Верхнім Падняпроўі, вярхоўях Заходняй Дзвіны і Верхняга Падняпроўя таксама жылі славяне — нашчадкі крывічоў-палачан, дрыгавічоў, радзімічаў.

У IX — пачатку XIII ст. гэтыя землі ўвайшлі ў склад славянскай дзяржавы — Русі, якая займала шырокія прасторы Усходняй Еўропы. У перыяд існавання Старажытнарускай дзяржавы ішоў працэс фарміравання адзінай **старажытнарускай (усходнеславянскай) супольнасці**. Для яе было характэрна адзінства мовы, культуры, пабудаванай на мясцовых і візантыйскіх традыцыях, праваслаўнай рэлігіі, асаблівасцях характару. Існавала разуменне агульнага лёсу, гістарычнай і культурнай адметнасці ўсіх рускіх зямель.

У перыяд раздробленасці, якая пачалася ў XII ст., тут утварыліся ўдзельныя княствы. На заходніх землях сярод іх найбольш значнымі былі Полацкае і Тураўскае. Адзінства Русі было парушана. Ужо тады пачаўся паступовы працэс выдзялення насельніцтва беларускіх зямель у асобную народнасць.

У другой палове XIII ст. вышэйназваныя плямёны, народы і гарады ўвайшлі ў склад новай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага. У XIV ст. да гэтай дзяржавы былі далучаны Кіеўшчына і іншыя землі Сярэдняга Падняпроўя. ВКЛ ператварылася ў **шматэтнічную дзяржаву**.

**Роля праваслаўнай царквы ў ВКЛ.** Балцкае і славянскае насельніцтва Вялікага княства Літоўскага адрознівалася не толькі мовай і звычаямі, але і рэлігіяй. Балты, у тым ліку і літоўцы, традыцыйна прытрымліваліся **язычніцтва**, ці *паганства*. Яны верылі, што прыродай і чалавечым лёсам кіруюць шматлікія багі, кожны з якіх быў па-свойму магутны. Галоўнымі багамі літоўцаў былі Дэвас — заступнік нябеснага святла і дня, міру і дружбы, а таксама Пяркунас — бог агню, грому і маланкі, справядлівы і няўмольны. Існавалі і больш дробныя багі. Нават лясы, дрэвы, багны мелі сваіх багінь, багоў і духаў.



Правообладатель Народная асвета



Язычніцкі абрад літоўцаў. *Гравюра XVI ст.*

Славянскае насельніцтва Вялікага княства Літоўскага прытрымлівалася **праваслаўя** — хрысціянства паводле візантыйскай традыцыі. Вышэйшым кіраўніком праваслаўнай царквы лічыўся патрыярх Канстанцінопальскі. На чале праваслаўнай царквы ВКЛ знаходзіўся **мітрапаліт**, які першапачаткова знаходзіўся ў Кіеве. Калі ў першай палове XIV ст. ён пераехаў у Маскву, вялікія князі літоўскія прыкладалі вялікія намаганні, каб аднавіць самастойную **мітраполію**. Уся тэрыторыя дзяржавы дзялілася на **епархіі** на чале з **епіскапамі**.

Шматбожжа літоўцаў не перашкаджала ім з павагай ставіцца і да іншых багоў, калі гэта не закранала іх інтарэсаў. Літоўская знаць, якая сутыкалася са звычаямі беларусаў, украінцаў і рускіх, праяўляла да іх цікавасць. Не адмаўлялася яна і радніцца з прадстаўнікамі «рускіх» родаў, а калі гэтага патрабавалі яе палітычныя інтарэсы, нават прымала праваслаўную веру. Звычайнай справай было прыняцце праваслаўя літоўскімі князямі пры атрыманні імі княжання ў «рускіх» гарадах. Гэта павінна было павысіць давер і любоў да іх з боку мясцовага насельніцтва.

Праваслаўным быў ужо сын Міндоўга Войшалк, а яго сястра выйшла замуж за сына галіцка-валынскага князя. Вялікі князь літоўскі Гедзімін і яго сыны былі жанатыя са славянскімі князёўнамі. Пры



Правообладатель Народная асвета

Гедзіміне **рэлігійная цярпімасць** стала адным з асноўных прынцыпаў у адносінах да «рускіх» зямель.

З прыхільнасцю ставіўся да хрысціян вялікі князь літоўскі Альгерд. Ён садзейнічаў утварэнню асобнай праваслаўнай мітраполіі для ВКЛ з цэнтрам у Навагрудку. Гэта паклала пачатак саперніцтву ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай за лідэрства ў царкоўных справах.

Праваслаў'е ўмацоўвала свае пазіцыі не толькі на беларускіх і украінскіх, але таксама і на літоўскіх землях. Знаць і некаторыя мяшчане літоўскіх гарадоў прымалі новую веру без ніякага прымусу. У сваю чаргу, царква за кошт падараванняў вялікіх князёў павялічвала свае багацці: атрымоўвала землі, залежных сялян, будавала новыя цэрквы і манастыры. Да канца XIV ст. праваслаўная царква панавала ў духоўным жыцці насельніцтва, паспяхова пашырала свой уплыў у ВКЛ.

**Пачаткі распаўсюджвання каталіцтва.** Даволі рана пазнаёміліся ў Вялікім княстве Літоўскім і з **каталіцтвам** — хрысціянствам паводле лацінскай традыцыі. Ужо першы кіраўнік дзяржавы Міндоўг прыняў каталіцтва і зрабіў першую спробу арганізацыйна аформіць тут рымска-каталіцкую царкву. Аднак глыбокіх падстаў для гэтага ў дзяржаве на той час не было. Для насельніцтва ВКЛ гэта вера



Хрышчэнне Літвы



Правообладатель Народная асвета

была чужой, а для літоўцаў да таго ж звязвалася з агрэсіяй крыжакоў. Само ж хрышчэнне Міндоўга было выклікана палітычнымі прычынамі, і пасля яго смерці наступныя правіцелі дзяржавы доўга не ўспрымалі ідэі прыняцця каталіцтва ўсур'ёз.

Тым не менш ужо ў часы Віценя і Гедзіміна разгарнулася прапаведніцкая дзейнасць каталіцкіх манахаў, якія знаходзіліся нават пры дварах вялікіх князёў. **Кляштары** (манастыры) манаскіх ордэнаў дамініканцаў і францысканцаў дзейнічалі ў Вільні і Навагрудку.

Да канца XIV ст. каталіцкая царква не мела ў ВКЛ значнай вагі. Сітуацыя змянілася пасля заключэння Крэўскай уніі 1385 г. Адной з яе ўмоў было хрышчэнне язычніцкага насельніцтва, г. зн. літоўцаў, у каталіцтва. У 1387 г. Ягайла з вялікай пышнасцю правёў абрад хрышчэння і дараваў каталіцкай царкве прывілеі, якія давалі ёй надзвычайныя правы. З гэтага часу каталіцкая царква ператварылася ў пануючую *канфесію* (рэлігію) у дзяржаве.

### Пытанні і заданні

1. Растлумачце, чаму Вялікае княства Літоўскае можна назваць шматэтнічнай дзяржавай. 2. Назавіце адметныя рысы старажытнарускай супольнасці. 3. Калі і чаму пачаўся працэс выдзялення насельніцтва беларускіх зямель у асобную народнасць? 4. Якія рэлігійныя вераванні існавалі ў балтаў? 4. Якая царква панавала ў духоўным жыцці насельніцтва Вялікага княства Літоўскага ў канцы XIII—XIV ст.? 5. Якая яшчэ хрысціянская рэлігія існавала ў Вялікім княстве Літоўскім? Як насельніцтва ВКЛ ставілася да яе? Як змянілася яе становішча ў канцы XIV ст.? 6. Чаму ў Вялікім княстве Літоўскім насельніцтва цярпіма адносілася да існавання розных рэлігій?

### Гістарычная крыніца

**З прывілея вялікага князя літоўскага і караля польскага Уладзіслава (Ягайлы)**

*20.02.1387*

Да сведчання ўсіх... жадаем, каб дайшло наступнае. З прычыны свайго рэлігійнага пачуцця, сумлення ацэньваючы шчырае і свабоднае імкненне, якое наш Літоўскі народ выказвае ў прыняцці хрышчэння ў правую каталіцкую веру, мы жадаем як найлепш гэтае самае імкненне павялічыць гэтым нашым помнікам векапомных



Правообладатель Народная асвета

правоў і вольнасцей, дабрачыннасцямі і падарункамі ў мэтах пашырэння тае веры і для ўсталявання моцы каталіцкай рэлігіі ўсім наогул літоўцам і кожнаму паасобку, рыцарам або баярам, якія знаходзяцца пад нашай уладай, ... якія ўжо ахрышчоны ці жадаюць ахрысціцца, мы даём і ўступаем вольнасці і правы, якія вызначаны ніжэй, маючыя сілу на вечныя часы, а іменна:

Кожны рыцар або баярын, які прыме каталіцкую веру, і яго наступнікі, законныя нашчадкі, маюць і будуць мець поўную і ўсякую магчымасць валодаць, трымаць, карыстацца, прадаваць, адчужаць, абменьваць, даваць, дараваць паводле сваёй добрай волі і думкі замкі, воласці, вёскі і дамы і ўсё, чым уладаў бы па бацькоўскай спадчыне, як уладаюць, карыстаюцца і ўжываюць на падставе аднолькавых правоў нобілі ў іншых землях нашага каралеўства Польскага, каб не было рознасці ў правах, паколькі адзінства робіць (дае) тое, што яны падданыя адной Кароны.

*Якія правы ўласнасці на свае зямельныя ўладанні атрымлівалі феадалы ВКЛ каталіцкага веравызнання? Як гэты прывілей змяніў сацыяльна-прававое становішча беларускіх зямель у Вялікім княстве Літоўскім?*

**Да ўрока «Наш край».** Удакладніце, якія народы пражывалі ў вашай мясцовасці ў XIII—XIV стст.

## § 10. Матэрыяльная і духоўная культура

**Успомніце:**

*1. Якія характэрныя рысы раманскага і гатычнага стыляў? 2. Чым характарызуюцца гродзенская і полацкая архітэктурныя школы? 3. Што азначае паняцце «мініяцюра»?*

**Архітэктура.** У мастацтве беларускіх зямель другой паловы XIII—XIV ст. знайшлі працяг традыцыі папярэдняга часу. Разам з тым сюды ўсё больш актыўна пранікаюць заходнія мастацкія стылі — раманскі і гатычны, што асабліва заўважальна ў архітэктуры. Узрастанне знешняй пагрозы прывяло да маштабнага будаўніцтва ўмацаванняў. У гэты час на землях Беларусі і суседняй Украіны пачынаюць узводзіцца магутныя мураваныя вежы. Першапачаткова яны ўваходзілі ў сістэму драўляных умацаванняў і маглі выконваць



Правообладатель Народная асвета

старажавыя функцыі, служыць апошнім прытулкам або жыллём абаронцаў. Найбольш вядомай з такіх вежаў з'яўляецца *Камянецкая* (г. Камянец Брэсцкай вобл.). Такія самыя вежы былі збудаваны ў канцы XIII—XIV ст. у Тураве, Брэсце, Гродне і інш.



Камянецкая вежа

З канца XIII ст. таксама разгарнулася актыўнае будаўніцтва замкаў, якія ўяўлялі сабой умацаваныя рэзідэнцыі князёў. Большасць з іх з'явілася ў XIV ст., калі вялася напружаная барацьба з крыжакамі.

Галоўныя замкі ўзводзіліся з каменю і цэглы. У першай палове XIV ст. былі ўзведзены магутныя *Верхні і Ніжні замкі ў Віцебску*. Гэта былі адны з самых моцных замкаў дзяржавы. Агульная даўжыня іх мураваных умацаванняў складала амаль 2 км, а колькасць веж раўнялася 15.

У гэты ж час распаўсюдзіўся запазычаны ў крыжакоў тып замка — **кастэль**. Кастэлі ўяўлялі сабой чатырохвугольныя ў плане магутныя збудаванні, аснову якіх складалі мураваныя сцены. За імі маглі знайсці прытулак не толькі абаронцы замка, але і насельніцтва навакольных вёсак. Па вуглах такіх замкаў маглі размяшчацца вежы, звычайна адна ці дзве. Вежы служылі галоўнымі вузламі абароны, а часам і жыллём уладальнікаў замка. Такія замкі былі збудаваны ў *Крэве* і *Лідзе*. Побач з мураванымі па-ранейшаму будаваліся і замкі з дрэва. У не-



Лідскі замак. *Рэканструкцыя*



Правообладатель Народная асвета

каторых з іх асобныя драўляныя канструкцыі паступова замяняліся мураванымі.

У абарончым дойлідстве гэтага часу найбольш праявіўся ўплыў заходняга мастацтва. Гэта тлумачыцца тым, што традыцыі ўзвядзення мураваных умацаванняў на Захадзе склаліся раней. Таму заходнія вежы і замкі служылі ўзорамі для пераймання, а заходнія майстры запрашаліся ў ВКЛ для правядзення будаўнічых работ. Што тычыцца культавага будаўніцтва, то тут традыцыі гродзенскай і полацкай архітэктурнай школ захоўваліся даўжэй. Аднак і тут адчуваўся ўплыў заходніх стыляў. Гэта выявілася ва ўжыванні новай тэхнікі будаўніцтва цэркваў і элементаў гатычнага дойлідства.

**Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.** У канцы XIII — XIV ст. знайшлі далейшы працяг багатыя традыцыі старажытнарускага *дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*. Пра гэта выразна сведчаць вырабы дробнай пластыкі. Па-ранейшаму шырока выкарыстоўваліся літыя абразкі, нацельныя, а таксама складныя крыжы, у сярэдзіне якіх змяшчаліся мошчы святых. Некаторыя з іх нават адліваліся ў формах, злепленых з больш ранніх вырабаў. Працягвалі бытаваць ранейшыя тыпы ўпрыгожанняў, напрыклад жаночыя скроневыя кольцы, бранзалеты і пярсцёнкі традыцыйных форм.



Мініяцюра з Лаўрышаўскага евангелля

Вельмі жывучымі аказаліся візантыйскія і старажытнарускія каноны ў іканапісе, дзе яны панавалі да пачатку XVI ст. У той жа час у выяўленчым мастацтве беларускіх зямель знайшлі сваё адлюстраванне і заходнееўрапейскія стылі, якія цесна перапляталіся з ранейшымі візантыйскай і старажытнарускай традыцыямі. Гэта выразна праявілася ў жывапісным аздабленні рукапісных кніг XIV ст. У гэты час тут панаваў так званы «*звярыны стыль*». Для яго характэрны прыгожа выкананыя загалоўныя літары — *ініцыялы*, у якіх элементы ў выглядзе пляцення спалучаліся з дзівоснымі жывёльнымі формамі.



Правообладатель Народная асвета

У кампазіцыю маглі ўваходзіць не толькі выявы фантастычных звяроў і птушак, але і чалавечыя фігуры. Пры гэтым асобныя ініцыялы набывалі жанравы характар.

Багаццем афармлення вылучаецца *Мсціжскае евангелле*, створанае, верагодна, у Мінску ў XIV ст. Яно аздоблена выявамі, у якіх можна сустрэць сілуэт храма, грыфонаў і хімер. Ва ўзоры ініцыялаў уплецены чалавечыя фігуры. Падобны ж стыль характэрны і для т. зв. *«Анежскага» (Мсціслаўскага) псалтыра*.



Ініцыял з Мсціжскага евангелля

У XIV ст. у мініяцюрах асобных рукапісных кніг назіраецца пэўнае парушэнне візантыйскіх канонаў, узбагачэнне тэм, ажыўленне вобразаў. Выявы набліжаюцца да жанравых сцэнак з рэальнага жыцця. Найбольш выразнымі з'яўляюцца мініяцюры *Лаўрышаўскага евангелля* пачатку XIV ст.

**Побыт насельніцтва.** Большасць жыхароў беларускіх зямель пражывала ў сельскай мясцовасці. Гарады ў той час з'яўляліся толькі рэдкімі астраўкамі, а гарадское насельніцтва складала нязначную частку. Побыт гарадскога і сельскага насельніцтва адрозніваўся нязначна. І сельская, і гарадская забудова ў пераважнай большасці складалася з драўляных жытлаў і гаспадарчых будынкаў. Падлога рабілася з дошак, а ў сельскай мясцовасці магла быць земляной ці глінабітнай. Печы таксама былі глінабітнымі і толькі ў дамах феадалаў і заможных гараджан з пачатку XIV ст. сустракаліся кафляныя печы. У гарадах асобныя будынкі мелі вытворчае прызначэнне і з'яўляліся рамесніцкімі майстэрнямі. Двары жыхароў абносіліся агароджамі. Вуліцы гарадоў масціліся драўлянымі насцiламі, у асобных гарадах існавалі водаадводныя і каналізацыйныя збудаванні.

Харчаванне гарадскога і сельскага люду было даволі сціплым і значна не адрознівалася. Прастату жыхароў ВКЛ у ежы адзначалі ўсе замежныя аўтары XIV—XV стст. Спажывалі мяса ў смажаным і вараным выглядзе, мучныя і крупяныя стравы, садавіну і гародніну, мёд і г. д. Досыць абмежаваным быў асартымент глінянага посу-



Правообладатель Народная асвета



Гульня ў косці. *Мініяцюра з Радзівілаўскага летапісу. XV ст.*

ду, які ў асноўным захаваўся з папярэдніх часоў. Ужываліся гаршкі, часам з накрыўкамі, міскі, збаны. У XIV ст. узнік такі від кухоннага прызначэння, невядомага раней, як макотры, прызначаныя для расцірання і прыгатавання прадуктаў. З металічнага посуду найбольш распаўсюджанымі былі патэльні. Выкарыстоўваўся і драўляны посуд — бочкі, біклагі, чашы, паўміскі, накрыўкі, карцы, берасцяныя кошыкі і г. д. У якасці сталовых прыбораў выкарыстоўваліся нажы і лыжкі. Відэльцы сучаснага тыпу яшчэ не былі вядомы. Замест іх выкарыстоўвалі доўгія шыпы з кольцам.

Амаль не мянялася і адзенне, якое магло выраблядца практычна ў кожнай сялянскай хаце з даматканага палатна, футра свойскай ці дзікай жывёлы. Абутак рабілі пераважна са скуры. Гэта былі чаравікі, боты, поршні, у вёсках маглі насіць і лапці. Выраб адзення і іншыя хатнія промыслы не толькі забяспечвалі гаспадарку ўсім неабходным, але і вырашалі праблему вольнага ад сельскагаспадарчых заняткаў часу. Больш заможныя жыхары знаходзілі сабе іншыя забавы — паляванне, гульні ў шахматы і шашкі і г. д.

**Пытанні і заданні**

1. Якія прычыны садзейнічалі развіццю на беларускіх землях у другой палове XIII—XIV ст. абарончага дойлідства? 2. Прывядзіце прыклады абарончых збудаванняў другой паловы XIII—XIV ст. на беларускіх землях. Якія функцыі, акрамя абароны, выконвалі гэтыя збудаванні? Рысы якіх мастацкіх стыляў у іх праявіліся? 3. Разглядзіце малюнак Лідскага замка. Ці можна аднесці яго да замкаў тыпу «кастэль»? Свой адказ аргументуйце. 4. У чым праяўляліся старажытнарускія традыцыі ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве беларускіх зямель? 5. Што паўплывала на развіццё выяўленчага мастацтва беларускіх зямель у другой палове XIII—XIV ст.? 6. Параўнайце побыт, ежу і адзенне простых людзей і заможных жыхароў ВКЛ. Ці захавалася што-небудзь з побыту сярэдневяковых жыхароў ВКЛ да нашага часу? 7*. Апішыце, чым звычайна вячэралі жыхары беларускіх зямель, якія пражывалі ў сельскай мясцовасці.



Правообладатель Народная асвета

**Гэта цікава.** Іпацьеўскі летапіс паведамляе: У год 1289. Князь жа Уладзімір за гады свайго княжання многія гарады пабудаваў пасля бацькі свайго... Залажыў горад і даў яму імя Камянец, таму што зямля была камяністай. У ім ён узвёў каменную вежу вышынёй у 17 сажаняў, дастойную здзіўлення ўсіх, хто яе бачыць.

**Да ўрока «Наш край».** 1. Ці ёсць у вашай мясцовасці архітэктурныя збудаванні XIII—XIV стст.? Якія іх асаблівасці? Чым яны цікавыя? 2. Даведайцеся аб асаблівасцях побыту жыхароў мясцовасці, дзе вы пражываеце.

## АБАГУЛЬНЕННЕ ДА РАЗДЗЕЛА I

1. Растлумачце значэнне паняццяў: каланізацыя, славянізацыя балтаў, шматэтнічная дзяржава.

2. Пакажыце на карце:

а) месцы рассялення:
балцкіх плямён;
крывічоў-палачан, дрыгавічоў, радзімічаў;
б) напрамкі славянскай каланізацыі Верхняга Панямоння.

3. Якія ўдзельныя княствы існавалі на беларускіх землях у XII — першай палове XIII ст.?

4. Раскажыце, як утварылася Вялікае княства Літоўскае, прытрымліваючыся наступнага плана:

час утварэння;
прычыны ўтварэння;
першапачатковая тэрыторыя;
горад — галоўны цэнтр ВКЛ;
першы вялікі князь.

5. Складзіце схему «Вялікія князі ВКЛ другой паловы XIII — першай паловы XIV ст.» Назавіце князёў, якія, на вашу думку, зрабілі найбольш значны ўклад ва ўтварэнне і ўмацаванне ВКЛ.

6. Растлумачце, чаму новае дзяржаўнае ўтварэнне мела поўную назву «Вялікае княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае».



Правообладатель Народная асвета

7. Складзіце сінхранічную табліцу «Барацьба за незалежнасць ВКЛ у другой палове XIII — першай палове XIV ст.»

| Дата | Барацьба з крыжакамі | Барацьба з мангола-татарамі |
|---|---|---|
| | | |

8. Назавіце гістарычных дзеячаў ВКЛ другой паловы XIII — першай паловы XIV ст., якія зрабілі, на ваш погляд, значны ўклад у барацьбу за незалежнасць дзяржавы. Растлумачце, чаму вы так лічыце.

9. Чаму архітэктура беларускіх зямель канца XIII — першай паловы XIV ст. насіла выразна абарончы характар? Які тып замкаў быў распаўсюджаны ў гэты час у ВКЛ? Прывядзіце прыклады.

10. Назавіце найбольш выдатныя творы літаратуры і ўзоры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва канца XIII — першай паловы XIV ст. Зрабіце вывад аб развіцці культуры на беларускіх землях у другой палове XIII — першай палове XIV ст.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## Раздзел II

# БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў КАНЦЫ XIV — СЯРЭДЗІНЕ XVI СТ.

## § 11. Княжанне Вітаўта

**Успомніце:**

*1. Калі было заключана Востраўскае пагадненне? 2. Якія правы, згодна Востраўскага пагаднення, атрымаў Вітаўт?*

**Намаганні Вітаўта па аднаўленні самастойнасці ВКЛ.** Пачатак праўлення Вітаўта быў няпросты. Па Востраўскім пагадненні ён стаў фактычна толькі пажыццёвым намеснікам Ягайлы, але не поўным гаспадаром Вялікага княства Літоўскага. Аднак энергічны князь не жадаў мірыцца з залежнасцю ад Польшчы і заняўся ўмацаваннем сваёй асабістай улады. Ва ўсіх пачынаннях Вітаўт абапіраўся на дробных і сярэдніх феадалаў.




Тэрыторыя Вялікага княства Літоўскага ў канцы XIV — першай палове XVст.



Правообладатель Народная асвета



Мангольскія воіны XIV ст.

Галоўную пагрозу для сябе Вітаўт бачыў ва ўдзельных князях Гедзімінавічах, пастаянна гатовых учыніць барацьбу за ўладу. Вітаўт пазбаўляў іх буйных удзелаў, якія пераўтвараў у намесніцтвы. Гэта выклікала незадавальненне знаці. Справа даходзіла да мяцяжоў, як тое было ў Віцебску ў 1393 і 1396 гг., аднак усе яны бязлітасна падаўляліся Вітаўтам. Мяцежныя князі выганяліся або атрымоўвалі драбнейшыя ўладанні, аднак ужо на ўмовах васальнай залежнасці ад Вітаўта.

Свой статус незалежнага правіцеля Вітаўт стараўся падкрэсліць і праз правядзенне самастойнай знешняй палітыкі. У *1395* г. ён падпарадкаваў сабе Смаленск, у *1398* г. усталяваў свой кантроль над Ноўгарадам. Войска Вялікага княства Літоўскага зрабіла паспяховы паход супраць татар да ракі Дон. Вітаўт авалодаў землямі ў нізоўях Дняпра. Межы Вялікага княства Літоўскага дасягнулі Чорнага мора.

У гэты час у Вітаўта з'явіліся планы грандыёзных заваёў на Усходзе. Для гэтага ён планаваў паставіць на чале Залатой Арды свайго стаўленіка Тахтамыша, незадоўга перад тым пазбаўленага ўлады. У якасці падзякі Тахтамыш абяцаў даць дазвол на заваёву ўсёй Русі. Вітаўт заручыўся падтрымкай заходніх краін, а Папа Рымскі аб'явіў задуму Вітаўта крыжовым паходам. Каб нейтралізаваць тэўтонскіх рыцараў, Вітаўт у *1398* г. заключыў з імі *Салінскае пагадненне*, адмовіўшыся ад часткі Жамойці. На піры, які быў наладжаны ў го-



Правообладатель Народная асвета

нар пагаднення, літоўскія і беларускія феадалы аб'явілі Вітаўта «каралём Літвы і Русі». Тым самым яны абвясцілі, што больш не прызнаюць залежнасці ад польскага караля.

Аднак паход, узначалены Вітаўтам, скончыўся для яго трагічна. У **1399** г. у бітве на **р. Ворскле** яго сілы былі разбіты аб'яднаным татарскім войскам. Гэта сарвала яго планы поўнага падпарадкавання Русі.

**Вялікае княства Літоўскае на вяршыні магутнасці.** Паражэнне на Ворскле зноў паставіла Вітаўта ў няпростае становішча. Падднялі галаву яго праціўнікі. У такіх умовах Вітаўт быў вымушаны ў **1401** г. заключыць новую, *Віленска-Радамскую унію* з Польшчай. Вітаўт афіцыйна набыў тытул вялікага князя літоўскага. Ён стаў пажыццёвым гаспадаром ВКЛ і атрымаў поўную свабоду ў вырашэнні ўнутраных спраў сваёй краіны. Аднак Ягайла, імкнучыся падкрэсліць сваё вышэйшае становішча, іменаваў сябе, акрамя караля польскага, яшчэ і вярхоўным князем літоўскім.

Паводле ўмоў уніі, пасля смерці Вітаўта, калі ў яго не будзе спадкаемцаў, Вялікае княства павінна было перайсці да Ягайлы і яго нашчадкаў. У выпадку ж смерці Ягайлы і згасання яго дынастыі баяры ВКЛ павінны былі ўдзельнічаць у выбарах новага агульнага манарха. Унія паміж Вялікім княствам і Польшчай набыла характар дагавора паміж двума «палітычнымі народамі». У выніку заключэння Віленска-Радамскай уніі Вялікае княства Літоўскае было адроджана як самастойнае дзяржаўнае ўтварэнне.


Вялікі князь літоўскі Вітаўт (1392—1430 гг.). *Гравюра XVI ст.*

Паражэнне на Ворскле не прымусіла Вітаўта адмовіцца ад прасоўвання на ўсход. Ён зноў падпарадкоўвае сабе Смаленск і рускія княствы ў вярхоўях Акі, умацоўвае ўладу ў Ноўгарадзе. Змяніліся адносіны Вітаўта з Тэўтонскім ордэнам. Цяпер ён не меў патрэбы ў саюзе з крыжакамі і не збіраўся мірыцца са стратай Жамойці. Войска ВКЛ адкрыта падтрымала ба-



Правообладатель Народная асвета

рацьбу жамойтаў супраць крыжакоў, што прывяло да т. зв. «Вялікай вайны» 1409—1411 гг. У гэтай вайне аб'яднаныя сілы ВКЛ і Польшчы нанеслі нечуванае паражэнне тэўтонам і прымусілі іх адмовіцца ад Жамойці.

Умацаванне пазіцый Вітаўта зноў паставіла пытанне аб яго адносінах з Польшчай. Ягайла быў вымушаны пачаць перагаворы пра аднаўленне уніі. У **1413** г. адбыўся з'езд феадалаў Польшчы і ВКЛ у замку *Гародле* (на Заходнім Бугу). Там былі выдадзены тры граматы.

Першая была складзена ад імя польскіх феадалаў, якія надзялялі феадалаў-католікаў ВКЛ сваімі гербамі і прымалі іх у сваё гербавае брацтва. У другой — феадалы-католікі ВКЛ прымалі гербы польскіх феадалаў і абяцалі быць з імі ў вечнай «дружбе і саюзе». У трэцяй грамаце Ягайла і Вітаўт абяцалі прызначаць на дзяржаўныя пасады толькі феадалаў-католікаў, якія прынялі польскія гербы. Ім дазвалялася свабодна распараджацца сваімі маёнткамі, даваць ільготы каталіцкім касцёлам і кляштарам.

Унія абвяшчала аб'яднанне ВКЛ з Польшчай, аднак гарантавала захаванне адасобленасці і нязменнасці ўлады вялікага князя літоўскага. Гарадзельская унія мела на мэце задобрыць і супакоіць Рымскага Папу, які кіраваў каталіцкай царквой і падтрымліваў Тэўтонскі ордэн.

Умацаванне ўлады Вітаўта ўвасобілася ў яго міжнародным прызнанні. Царкоўны сабор, які праходзіў у 1414—1417 гг. у Канстанцы (Германія), разгледзеў прэтэнзіі Тэўтонскага ордэна да ВКЛ і Польшчы і прызнаў іх беспадстаўнымі. На бок Вітаўта і Ягайлы схіліўся Папа Рымскі. Еўрапейскае рыцарства страціла цікавасць да крыжовых паходаў у Літву, і гэта стала пачаткам заняпаду Ордэна.

Пасля 1420 г. Вітаўт дабіўся новых поспехаў на Усходзе. Ён умешваўся ў дынастычную барацьбу ў Залатой Ардзе, узводзіў сваіх кандыдатаў на ханскі трон. Вітаўт падпарадкаваў Цвер і Пскоў, пашырыў свой уплыў на Маскву, дзе з 1425 г. правілі яго дачка Соф'я і малалетні ўнук Васіль II. Такім чынам, у перыяд княжання Вітаўта ВКЛ дасягнула сваёй найбольшай магутнасці і ператварылася ў найбуйнейшую дзяржаву ў Еўропе.



Правообладатель Народная асвета

**Спробы Вітаўта атрымаць каралеўскую карону.** Умацаваўшы сваю ўладу, Вітаўт зрабіў спробу атрымаць каралеўскі тытул. Гэта фармальна ставіла б яго на адзін узровень з іншымі манархамі Еўропы, у тым ліку з Ягайлам. Такім чынам Вітаўт канчаткова скасаваў бы апошнія праявы залежнасці ВКЛ ад Польшчы. У разрыве уніі паміж гэтымі дзяржавамі быў зацікаўлены таксама германскі імператар.

Упершыню спроба абʼявіць Вітаўта каралём была зроблена на Салінскім зʼездзе ў 1398 г. Аднак найбольш надзённым гэта пытанне стала пасля Канстанцкага сабора. Гэты сабор, акрамя ўсяго іншага, асудзіў вучэнне чэшскага мысліцеля Яна Гуса, які быў спалены як ерэтык. Гэта выклікала ў Чэхіі хвалю абурэння, якое перарасло ў шырокі антыгерманскі рух. «Гусіты», як называлі паслядоўнікаў Яна Гуса, прапанавалі Вітаўту стаць чэшскім каралём. Вітаўт нават паслаў у 1422 г. у Прагу свайго намесніка Жыгімонта Карыбутавіча, які стаў адным з гусіцкіх лідэраў.

Каб адштурхнуць Вітаўта ад гусітаў, германскі імператар Жыгімонт Люксембургскі зноў вярнуўся да ідэі атрымання Вітаўтам кароны Літвы і Русі. Вітаўту спадабалася гэта прапанова, і для яе абмеркавання ў 1429 г. у Луцку быў сабраны зʼезд з удзелам германскага імператара і польскага караля.

Палякі сустрэлі ідэю каранацыі Вітаўта з абурэннем і прыклалі ўсе намаганні, каб настроіць супраць яе еўрапейскіх манархаў і Папу Рымскага. Калі ж германскі імператар выслаў карону, палякі перахапілі яе па дарозе. Між тым быў прызначаны час каранацыі, на якую сабраліся тытулаваныя госці, у тым ліку і каранаваныя асобы. Імператар прасіў Вітаўта пачакаць, абяцаў выслаць яму новую карону, але Вітаўт нечакана памёр.

**Пытанні і заданні**

1. Якім чынам Вітаўт умацоўваў сваю ўладу ў ВКЛ? 2. Складзіце табліцу «Уніі ВКЛ і Польшчы».

| Дата | Назва уніі (пагаднення) | Асноўныя ўмовы |
|---|---|---|
| | | |



Правообладатель Народная асвета

3. Як змянілася тэрыторыя ВКЛ пры Вітаўце? 4. Ці можна сцвярджаць, што пры Вітаўце ВКЛ дасягнула вяршыні магутнасці? Прывядзіце факты, каб пацвердзіць вашу думку. 5. Якія факты сведчаць аб міжнародным прызнанні ўлады Вітаўта? 6. Чаму Вітаўт імкнуўся атрымаць тытул караля? Што перашкодзіла Вітаўту атрымаць карону і стаць каралём? 7. Вызначце ролю Вітаўта ў гісторыі Вялікага княства Літоўскага.

### Гістарычная крыніца

**З «Хронікі Быхаўца»**

Потым князь вялікі Вітаўт паслаў сваіх паслоў да Вялікага Ноўгарада і Пскова, каб яго гаспадаром сваім лічылі і даніну яму давалі… Але ноўгарадцы і псковічы на тых паслоў зусім не зважалі і даніны даваць не хацелі. І князь вялікі Вітаўт сабраўся з усімі сваімі сіламі, і пайшоў на зямлю Наўгародскую, і стаў пад горадам Порхавам, і стаяў там шэсць месяцаў, і, не здабыўшы горада, пайшоў па зямлі Наўгародскай і Пскоўскай, спусташаючы, палячы, беручы ў палон.

Налета пайшоў князь вялікі Вітаўт пад гарады пскоўскія, але не здабыў гарадоў пскоўскіх — Веліж і Красны горад. Псковічы, хочучы, каб Вітаўт больш іх зямлі не сказіў, прыслалі сваіх паслоў да вялікага князя Вітаўта, згаджаючыся, каб ён гаспадаром у іх быў, хочучы слухацца яго, даніну яму кожны год даваць і намесніка ягонага ў сябе мець. І князь вялікі пасадзіў намеснікам у іх князя пінскага Юр'я, празванага Нос, а сам пайшоў пад Ноўгарад з усімі сіламі. Ноўгарадцы, бачачы тое, што псковічы Вітаўту здаліся і намесніка ягонага прынялі, і, не хочучы больш трываць шкоды ад яго ў зямлі сваёй, паслалі да яго паслоў сваіх, падаўшыся яму на службу і падаткі даючы, і, як псковічы, за гаспадара яго мець пажадалі. Князь Вітаўт паставіў у іх намеснікам шурына свайго князя Сямёна Гальшанскага, празванага Лютым. І давалі ноўгарадцы даніну князю вялікаму кожны год... А псковічы давалі палову таго, што ноўгарадцы, як залатых і коней, так і звера махнатага.

Князь вялікі Вітаўт, расшырыўшы гаспадарства ад мора да мора, састарыўся.

*Якую тэрыторыю займала Вялікае княства Літоўскае ў часы княжання Вітаўта?*

**!** **Гэта цікава.** У канцы свайго жыцця Вітаўт настолькі ўмацаваў свой уплыў на Залатую Арду, што некаторыя татарскія ханы былі



Правообладатель Народная асвета

яго стаўленікамі і залежалі ад яго. Паводле Хронікі Яна Длугаша, аднаго з прэтэндэнтаў, Бетсуб-улана (Бетсабулу), Вітаўт узводзіў на залатаардынскі прастол проста ў Вільні, «убраўшы яго ў пурпуровую, вышываную золатам шубу».

## § 12. «Вялікая вайна» і Грунвальдская бітва

**Успомніце:**
*1. Калі і як усталяваліся крыжакі ў Прыбалтыцы? 2. Якія вынікі мела барацьба Старажытнай Русі супраць крыжакоў у XIII ст.?*

**Узмацненне крыжацкай небяспекі.** У пачатку XV ст. адносіны Вялікага княства і Польшчы з Тэўтонскім ордэнам рэзка пагоршыліся. Атрымаўшы паводле Салінскіх пагадненняў 1398 г. Жамойць і захапіўшы некаторыя польскія землі, крыжакі злучылі свае лівонскія і прускія ўладанні з Германіяй. Узнік нават праект падзелу Польшчы паміж Ордэнам і германскімі ўладарамі.

Польшча разумела небяспеку і шукала падтрымкі ў свайго бліжэйшага саюзніка — ВКЛ. Ягайла мусіў ісці на ўступкі і паводле Віленска-Радамскіх пагадненняў 1401 г. надаў Вітаўту большыя ўладныя паўнамоцтвы. Аднак і сам Вітаўт разумеў непазбежнасць канфлікту з Ордэнам з-за Жамойці. Крыжакі фармальна атрымалі правы на гэту літоўскую вобласць, але нічога не маглі зрабіць з пастаяннымі паўстаннямі жамойтаў. У значнай ступені гэтыя паўстанні падтрымліваліся Вітаўтам, які аказваў жамойтам дапамогу зброяй і вайсковымі сіламі.

**Падрыхтоўка да рашучага адпору крыжакам.** Ужо ў снежні 1408 г. адбылася тайная нарада Вітаўта і Ягайлы ў Навагрудку, дзе было прынята рашэнне аб пачатку вайны з Тэўтонскім ордэнам у 1409 г. Аднак падзеі разгортваліся такім чынам, што адказнасць за аб'яўленне вайны лягла на плечы крыжакоў.

У 1409 г. у мяцежнай Жамойці ўспыхнуў голад. Ягайла паслаў туды караблі, гружаныя, як ён сцвярджаў, хлебам. Аднак крыжакі, якія затрымалі караблі, знайшлі там зброю для паўстанцаў. Затрымку караблёў скарыстаў Вітаўт, які ледзь не адкрыта стаў на бок жамойтаў. Непазбежнасць вайны зразумелі і крыжакі. Яны паспрабавалі



Правообладатель Народная асвета



Вялікі магістр Тэўтонскага ордэна Ульрых фон Юнгінген

заручыцца нейтралітэтам палякаў, але тыя параілі немцам увогуле адмовіцца ад Жамойці і паабяцалі ў выпадку вайны падтрымаць Вітаўта. У адказ Ордэн *6 жніўня 1409 г.* аб'явіў Ягайле вайну.

Першы этап вайны скончыўся для палякаў няўдала: яны страцілі частку сваіх зямель. У кастрычніку Ягайла мусіў падпісаць з Ордэнам часовае перамір'е. У той жа час Вітаўт, які ваяваў асобна, дабіўся поспехаў і здолеў заняць Жамойць.

Мірную перадышку абодва бакі выкарыстоўвалі для падрыхтоўкі да новага сутыкнення: збіралі войскі, вербавалі наёмнікаў, вялі дыпламатычную барацьбу. Чэшскі кароль, запрошаны як міжнародны пасрэднік для мірнага вырашэння канфлікта, прыняў бок Ордэна. Аб падтрымцы крыжакоў заявіў і кароль Венгрыі. У снежні 1409 г. у Брэсце адбылася яшчэ адна нарада Ягайлы і Вітаўта, дзе быў распрацаваны падрабязны план вайны.

Ваенныя дзеянні былі адноўлены ў чэрвені 1410 г. Ягайла і Вітаўт планавалі злучыць свае сілы і рухацца на сталіцу Тэўтонскага ордэна — Мальбарк. Кіраўнік Ордэна вялікі магістр *Ульрых фон Юнгінген* даведаўся пра наступальныя планы сваіх праціўнікаў вельмі позна. Ён спрабаваў перакрыць шлях на сталіцу, аднак аб'яднаныя сілы ВКЛ і Польшчы вырашылі ўхіліцца ад бітвы і рухацца далей на Мальбарк. Тым не менш, крыжакі зрабілі яшчэ адну спробу пераняць праціўнікаў і раніцай **15 ліпеня 1410** г. сутыкнуліся з імі каля вёскі **Грунвальд** (цяпер тэрыторыя Польшчы).

**Грунвальдская бітва.** Войска крыжакоў, куды ўваходзіла шмат рыцараў з Германіі, Англіі, Францыі, Швейцарыі, Чэхіі і інш., налічвала каля 15—20 тыс. чалавек. Яны дзяліліся на 50 *харугваў* (пал-



Правообладатель Народная асвета

коў). Яшчэ адну харугву крыжакі пакінулі для аховы межаў дзяржавы.

Войска Вялікага княства Літоўскага і Польшчы было большым — каля 30—40 тыс. чалавек. Вітаўт прывёў з сабой 40 харугваў, у тым ліку з Полацка, Навагрудка, Вільні, Трокаў, Смаленска, Віцебска, Гродна, Ліды, Брэста, Пінска, Мсціслава, Драгічына і іншых зямель. З Ягайлам прыйшло 50 харугваў. У аб'яднаным



Грунвальдская бітва. *Мініяцюра XV ст.*



Правообладатель Народная асвета

войску, акрамя беларускіх, літоўскіх і польскіх сіл, былі харугвы з Украіны, атрад з Чэхіі пад кіраўніцтвам Яна Жыжкі (у будучым героя гусіцкага руху) і татарская конніца.

Беларускія і літоўскія харугвы ўзначаліў вялікі князь Вітаўт. Агульнае кіраўніцтва аб'яднаным войскам ажыццяўляў польскі кароль Ягайла. Саюзныя сілы пабудаваліся трыма лініямі. Войскі ВКЛ размясціліся на правым флангзе, палякі — на левым. Крыжакі спачатку таксама стаялі трыма лініямі, але, убачыўшы, што іх фронт выглядае карацейшым, падоўжылі яго за кошт адной з ліній.

Бітва пачалася атакай першай лініі Вітаўта. Крыжакі марна спрабавалі адбіць яе гарматным агнём, пасля чаго кінулі супраць конніцы ВКЛ свае асноўныя сілы. Бітва цягнулася доўга і зацята, аднак праз нейкі час ваяры ВКЛ пачалі адступаць і частка іх кінулася наўцёкі, што было справакавана татарскімі атрадамі, для якіх тактыка прытворных уцёкаў з далейшым вяртаннем у бітву была ўлюбёным прыёмам.

Для правага крыла саюзнікаў склалася пагрозлівая сітуацыя. Яе ўратавалі тры палкі пад камандай мсціслаўскага князя Сымона Лугвена. Яны былі амаль усе пасечаны, але выстаялі і дачакаліся дапамогі — другой і трэцяй ліній войска Вітаўта. Адначасова палякі кінулі ў бой сваю першую лінію. Бітва закіпела на абодвух флангах і набыла небывалую лютасць. У гушчы бітвы быў звалены польскі каралеўскі сцяг, і крыжакі ўжо заспявалі пераможны гімн. Ад паражэння палякаў уратавала ўвядзенне ў бой другой лініі.

У нямецкага магістра Ульрыха фон Юнгінгена таксама заставалася ў рэзерве адна лінія. Яе ён павёў у бой асабіста. Страшны ўдар крыжакоў зламаў строй саюзнікаў. Тэўтоны зноў заспявалі гімн перамогі. Аднак тут па іх ударылі з розных бакоў уцалелыя флангі Ягайлы і Вітаўта, апошняя польская лінія і тыя ваяры ВКЛ, якія вярнуліся пасля ўцёкаў. Бітва ператварылася ў знішчэнне акружаных рыцараў. Загінуў сам магістр. Быў захоплены абоз і ўсе баявыя сцягі Ордэна.

**Вынікі і гістарычнае значэнне бітвы. Тарунскі мір.** Пасля перамогі пад Грунвальдам саюзнікі маглі без перашкод рухацца да Мальбарка. Па дарозе ім без бою здаваліся прускія гарады і замкі.



Правообладатель Народная асвета



Крыжацкія сцягі, захопленыя пад Грунвальдам

Аднак аблога сталіцы Тэўтонскага ордэна зацягнулася. Хутка лагер саюзнікаў пакінулі войскі Вітаўта. Мудры князь не хацеў поўнага знішчэння Ордэна, які ён разлічваў выкарыстоўваць для стрымлівання палякаў. Ён разумеў, што без гэтага Польшча зноў захоча заявіць прэтэнзіі на яго ўладанні. Далейшая аблога Мальбарка стала марнай, і хутка палякі таксама рушылі назад.

У **1411** г. у г. *Торунь* быў заключаны мір. Найбольш выгадны ён быў для Вялікага княства Літоўскага, якому крыжакі вярталі Жамойць. Польшча таксама вяртала частку зямель. Акрамя таго, пераможцам павінна была быць выплачана вялікая сума грошай.

Тарунскі мір вызначыў новую сітуацыю ў Прыбалтыцы. Тэўтонскі ордэн страціў сваё вядучае становішча ў рэгіёне, аднак спатрэбілася яшчэ некалькі войнаў, каб ён знік канчаткова. Значна ўзрос між-



Правообладатель Народная асвета

Народная асвета

народны аўтарытэт Вялікага княства Літоўскага і Польскага Каралеўства. Ажывіўся іх гандаль, больш паспяхова сталі развівацца гаспадарка і культура.

**Пытанні і заданні**

1. Чаму барацьба з крыжакамі на працягу 200 гадоў была важнейшай знешнепалітычнай задачай Вялікага княства Літоўскага? 2. Раскажыце пра «Вялікую вайну» па плане: а) чаму пачалася; б) калі адбылася; в) удзельнікі; г) прычыны і вынікі вайны. 3. Калі і дзе адбылася рашаючая бітва? 4. З каго складалася армія Тэўтонскага ордэна ў час Грунвальдскай бітвы? Хто ўваходзіў у польска-літоўскую армію? 5*. Апішыце ход бітвы. 6. Чаму польска-літоўскае войска здолела разграміць армію тэўтонцаў? 7. У чым заключаецца гістарычнае значэнне Грунвальдскай бітвы?

**Гістарычная крыніца**

**З «Хронікі Быхаўца»**

Немцаў разбілі ўшчэнт, і самога магістра, і ўсіх яго комтураў забілі, і безліч немцаў пабілі і ўзялі ў палон... і затым, усіх іх разграміўшы і шмат гарадоў і зямель іх пабраўшы, астатняе спалілі, а людзей забралі ў палон... з вялікаю пашанаю і незвычайнаю перамогаю, заслужыўшы на ўвесь свет найвыдатную славу, паехалі ў свае землі.

*Як у «Хроніцы Быхаўца» ацэнены вынікі Грунвальдскай бітвы?*

! **Гэта цікава.** Хроніка Яна Длугаша сведчыць, што перад Грунвальдскай бітвай абодва бакі доўгі час стаялі ў нерашучасці, не жадаючы пачынаць бітву. Каб раззлаваць Ягайлу і Вітаўта і справакаваць іх наступленне ў нявыгаднай мясцовасці, крыжацкі магістр прыслаў ім два мячы, заяўляючы, што калі ў іх не хапае зброі, то крыжакі пасылаюць яе ім, каб тыя маглі нарэшце адважыцца на бой. Ягайла і Вітаўт прынялі «падарунак» і хоць стараліся ніяк не выказаць свайго абурэння, аднак неўзабаве пачалі атаку.

**Да ўрока «Наш край».** Ці прымалі ўдзел у Грунвальдскай бітве тагачасныя жыхары вашай мясцовасці? Якія падзеі адбываліся ў вашай мясцовасці ў час «Вялікай вайны»?



Правообладатель Народная асвета

## § 13. Грамадзянская вайна 1432—1439 гг.

**Успомніце:**

*1. Якія вынікі мела заключэнне Крэўскай уніі для Вялікага княства Літоўскага? 2. Які прывілей выдаў Ягайла пасля заключэння Крэўскай уніі?*

**Супярэчнасці паміж групоўкамі феадалаў у ВКЛ**. Пасля смерці Вітаўта ў 1430 г. адбыўся з'езд феадалаў ВКЛ, на якім вялікім князем літоўскім быў абраны **Свідрыгайла**. Ён быў братам Ягайлы і малодшым сынам Альгерда. Рашучы і энергічны, Свідрыгайла даўно змагаўся за ўладу і быў галоўным праціўнікам Вітаўта на працягу ўсяго яго праўлення.

Аднак, стаўшы на чале дзяржавы, Свідрыгайла выступіў гарачым паслядоўнікам Вітаўта ў яго барацьбе за поўную незалежнасць і адстойванне інтарэсаў Вялікага княства Літоўскага. Пачатак праўлення Свідрыгайлы быў адзначаны канфліктам з палякамі, якія раптоўна, нават без ведама свайго караля Ягайлы, захапілі частку Падолля — уладанняў ВКЛ на захадзе Украіны. Ягайла, які на той час гасцяваў у Свідрыгайлы, быў затрыманы і вымушаны даць палякам загад вярнуць захопленыя землі.

Палякі адмовіліся выканаць загад, і канфлікт перарос у ваеннае сутыкненне. Свідрыгайла пачаў пошук саюзнікаў і знайшоў іх у асобах малдаўскага гаспадара, татарскага хана, наўгародскага баярства. Планаваўся таксама саюз з гусітамі, але Свідрыгайла аддаў перавагу германскаму імператару Жыгімонту, які абяцаў яму, як калісьці Вітаўту, каралеўскую карону. Да антыпольскага саюза далучыўся і Тэўтонскі ордэн. У 1431 г. палякі аб'явілі Свідрыгайлу вайну і пачалі баявыя дзеянні на Валыні.



Вялікі князь літоўскі (1430—1432 гг.) Свідрыгайла

Аднак у гэты ж час выспяваў унутраны канфлікт у ВКЛ. Супраць Свідрыгайлы сфарміравалася моцная апазіцыя літоўскіх феадалаў на чале з ма-



Правообладатель Народная асвета

лодшым братам Вітаўта **Жыгімонтам Кейстутавічам**. У аснове іх незадаволенасці ляжала палітыка Свідрыгайлы па раздачы пасад выхадцам з усходу дзяржавы, пераважна «русінам» (беларусам і украінцам) праваслаўнага веравызнання. Сам Свідрыгайла быў католікам, аднак усё жыццё правёў сярод праваслаўных феадалаў, ведаў іх, давяраў ім, карыстаўся іх падтрымкай. Яму, Альгердавічу і зацятаму праціўніку Вітаўта, цяжка было разлічваць на падтрымку заходняй часткі дзяржавы, дзе традыцыйна падтрымлівалі Кейстута і яго нашчадкаў.

Літоўскія феадалы лічылі сябе пакрыўджанымі. Палітыка Свідрыгайлы падрывала палажэнні Гарадзельскай уніі 1413 г. аб раздачы дзяржаўных пасад толькі католікам. І польскія, і літоўскія феадалы былі зацікаўлены ў захаванні палажэнняў уніі. Паміж імі намеціўся саюз, хоць кожны меў на мэце свае інтарэсы.

**Змаганне паміж Свідрыгайлам і Жыгімонтам.** 1 верасня 1432 г. мяцежнікі зрабілі спробу забіць Свідрыгайлу ў Ашмянах. На чале змовы стаяў Жыгімонт Кейстутавіч. Свідрыгайла быў папярэджаны і ўцёк у Полацк, дзе яго падтрымала мясцовая знаць, да якой далучыліся феадалы Віцебскай, Смаленскай і украінскіх зямель.

У Вільні вялікім князем літоўскім быў абвешчаны Жыгімонт, якога прызнала Літва, Жамойць, Падляшша, Панямонне, Брэсцкая і Мінская землі. У выніку дзяржава была расколата на дзве часткі — Вялікае княства Літоўскае і Вялікае княства Рускае. Пачалася вайна за велікакняжацкі трон. Фактычна гэта была вайна за ўладу буйных тэрытарыяльных груповак, хоць тут цесна перапляталіся таксама рысы дынастычнай барацьбы і рэлігійнага супрацьстаяння.

Польшча адразу ж аказала Жыгімонту Кейстутавічу ваенную дапамогу. Узамен ён заключыў з палякамі новую унію, па якой пасля яго смерці ВКЛ пераходзіла да польскага караля і яго нашчадкаў. Свідрыгайлу падтрымалі цвярскі князь і лівонскія рыцары. Тэўтонскія рыцары таксама збіраліся выступіць на яго баку, аднак гэтаму перашкодзіў моцны ўдар па іх землях сумеснага польска-гусіцкага войска.

Вайна вялася вельмі жорстка. Ужо ў 1432 г. войскі Свідрыгайлы былі пад Вільняй. У наступным годзе ён захапіў Коўна (Каўнас), спа-



Правообладатель Народная асвета

ліў Заслаўе і Мінск. У адказ Жыгімонт спрабаваў захапіць Віцебск і Мсціслаў. Вялася і дыпламатычная барацьба. У 1434 г. Жыгімонт выдаў прывілей, які ўраўноўваў праваслаўных феадалаў у асноўных правах з феадаламі-католікамі. Пачаўся пераход часткі прыхільнікаў Свідрыгайлы да Жыгімонта. Тайныя перагаворы з ім пачалі смаленскія баяры і праваслаўны мітрапаліт Герасім. Даведаўшыся пра гэта, Свідрыгайла спаліў Герасіма на вогнішчы.



Бітва пад Вількамірам

**Рашаючая бітва.** 1 верасня **1435** г. пад **Вількамірам** (цяпер г. Укмярге ў Літве) адбылася вырашальная бітва. У ёй удзельнічаў Свідрыгайла са сваімі сіламі і яго саюзнікі — рыцары Лівонскага ордэна, невялікі татарскі атрад, чэшскія і заходнееўрапейскія добраахвотнікі. Сілы праціўнікаў былі прыблізна роўнымі і налічвалі не больш чым па 10 тыс. чалавек.

Бітва скончылася для Свідрыгайлы катастрофай. Яго войскі не паспелі да канца разгарнуць сваю цяжкую кавалерыю і палявы ўмацаваны лагер з вазоў, пабудаваны на гусіцкі манер. Ён быў атакаваны і разбураны літоўска-польскай конніцай. У крывавай бітве разам са сваімі атрадамі палягло 13 беларускіх і ўкраінскіх князёў. Многія трапілі ў палон. Былі ўшчэнт разбіты атрады Лівонскага ордэна. Загінуў сам магістр. Свідрыгайла з невялікай групай рыцараў уцёк у Полацк.

Няўдачы Свідрыгайлы выклікалі незадавальненне сярод яго прыхільнікаў. Усходнеславянскія землі адна за другой сталі пераходзіць на бок Жыгімонта.

Аднак Полацк, Віцебск і іншыя гарады Беларусі аказвалі ўпартае супраціўленне Жыгімонту. І толькі ў выніку няроўнай барацьбы палачане і віцябляне вымушаны былі здацца. Свідрыгайла ўцёк на



Правообладатель Народная асвета



Вялікі князь літоўскі
Казімір IV Ягелон
(1440—1492 гг.). *Надмагілле*

Валынь (Украіна). Баявыя дзеянні месцамі працягваліся яшчэ да 1439 г.

**Вынікі вайны. Усталяванне міру.** Умацаваўшы сваю ўладу, Жыгімонт Кейстутавіч таксама стаў выказваць намер вызваліцца ад залежнасці Польшчы. Разгадаўшы яго задумы, польскія паны пайшлі на збліжэнне са Свідрыгайлам. Супраць Жыгімонта выступілі і прадстаўнікі літоўскай буйной арыстакратыі, якую ён адштурхнуў ад сябе выключнай жорсткасцю. Не даляраючы знаці, Жыгімонт адсоўваў яе на задні план, атачаючы сябе дробнымі літоўскімі і беларускімі феадаламі. У 1440 г. супраць Жыгімонта была арганізавана змова і ён быў забіты ў Трокскім замку.

Пасля смерці Жыгімонта на пасаду вялікага князя літоўскага прэтэндавалі Свідрыгайла, сын Жыгімонта Кейстутавіча Міхал (Міхалюшка) і сын Ягайлы Уладзіслаў. Аднак рада паноў, якая адбылася ў чэрвені 1440 г., абрала другога сына Ягайлы, дванаццацігадовага Казіміра. Ён увайшоў у гісторыю як **Казімір IV Ягелон**. На доўгі перыяд у Вялікім княстве Літоўскім усталяваўся мір. Надышоў час займацца перабудовай грамадскага жыцця.

**Пытанні і заданні**

1. Чаму ўзнік канфлікт паміж Свідрыгайлам і Жыгімонтам? 2. Якія ўсходнеславянскія землі падтрымалі Свідрыгайлу? Якія землі прызналі ўладу Жыгімонта? 3. З якой мэтай вялася барацьба паміж Свідрыгайлам і Жыгімонтам? 4. Гісторыкі называюць Вількамірскую бітву «Бітвай народаў XV ст.» Чаму? Як яна паўплывала на ход вайны? 5. Якія былі вынікі вайны 1432—1439 гг.? 6. Успомніце, якія войны называюць грамадзянскімі. Растлумачце, чаму вайну 1432—1439 гг. вызначаюць як грамадзянскую.



Правообладатель Народная асвета

**Гістарычная крыніца**

І сеў [пасля смерці Вітаўта] на вялікае княжанне князь вялікі Свідрыгайла Альгердавіч у Вільні і Троках... І не справіўся ён з кіраваннем краінай. І першага верасня [1432 г.] пасадзіла Літва на вялікае княжанне, у Вільню і Трокі, вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча. Свідрыгайла ж пайшоў [княжыць] у Полацк і Смаленск, і рускія князі і баяры пасадзілі яго на вялікае княжанне Рускае.



Трокскі замак. *Сучасны выгляд*

*Чаму на вялікае княжанне быў пасаджаны Жыгімонт? Якія вынікі для краіны мела барацьба паміж Свідрыгайлам і Жыгімонтам?*

**!** **Гэта цікава.** Адным з кіраўнікоў войска Свідрыгайлы ў бітве пад Вількамірам у 1435 г. быў былы намеснік Вітаўта ў Чэхіі Жыгімонт Карыбутавіч. Паранены, ён трапіў у рукі Жыгімонта Кейстутавіча. На пытанне, чаму ён не ратаваўся ўцёкамі, легендарны герой гусіцкага руху адказаў, што такі ўчынак не варты яго слаўнага рыцарскага імя і што яго перасталі б паважаць нават ворагі. Такі адказ уразіў Жыгімонта Кейстутавіча, але ён усё ж загадаў патаемна забіць свайго ворага, насыпаўшы яд у яго раны.

## § 14. Змены ў дзяржаўным ладзе ВКЛ у XV — сярэдзіне XVI ст.

**Успомніце:**

*1. Якую ўладу меў вялікі князь у ВКЛ? 2. Якую ролю адыгрывала рада пры вялікіх князях літоўскіх у XIV ст.? 3. Якія саслоўна-прадстаўнічыя органы існавалі ў краінах Заходняй Еўропы?*

**Казімір Ягайлавіч і яго палітыка.** У 1440 г. вялікім князем літоўскім стаў сын Ягайлы і Соф'і Гальшанскай **Казімір IV**. Яму споўнілася трохі больш за 12 гадоў. Маладому князю кіраваць дзяржавай



Правообладатель Народная асвета



Вялікі маскоўскі князь Іван III

дапамагалі прыбліжаныя асобы. Праз сем гадоў пасля заняцця велікакняжацкага трона ў ВКЛ Казімір быў абраны яшчэ і польскім каралём. У выніку гэтага была аднаўлена персанальная унія Вялікага княства Літоўскага з Польшчай.

Перад ад'ездам у Польшчу ў **1447** г. Казімір выдаў **прывілей**, які з мэтай захавання самастойнасці дзяржавы не дапускаў пранікнення ў ВКЛ польскіх феадалаў. Зямля і дзяржаўныя пасады ў ВКЛ даваліся толькі ўраджэнцам княства. Разам з тым прывілей 1447 г. паклаў пачатак афармленню залежнасці сялян ад феадалаў. Феадалам забяспечвалася валоданне зямлёй на правах поўнай уласнасці.

У **1468** г. убачыў свет першы зборнік законаў Вялікага княства Літоўскага, які атрымаў назву **Судзебнік**. Ён устанавіў адзіныя ва ўсім княстве тры віды пакаранняў: грашовы штраф, пабоі, смяротная кара. Паводле Судзебніка, баярам давалася права судзіць сялян.

Судзебнік быў напісаны на старабеларускай мове, якая яшчэ з часоў Альгерда была дзяржаўнай мовай у Вялікім княстве Літоўскім. Такім чынам, княжанне Казіміра Ягайлавіча было адзначана важнай заканадаўчай дзейнасцю кіраўніка дзяржавы.

У 1470 г. Казімір зрабіў значную памылку ў знешняй палітыцы. Ён пайшоў на саюз са слабеючай Залатой Ардой супраць Маскоўскай дзяржавы, якая набірала сілу. Гэта пагадненне прывяло да разрыву адносін ВКЛ з крымскім ханам Менглі-Гірэем, які вёў барацьбу з Залатой Ардой. Маскоўскі вялікі князь Іван III выкарыстаў зручны момант, каб заключыць дагавор Масквы і Крыма супраць ВКЛ.

Казімір імкнуўся да пераадолення вынікаў дынастычнай барацьбы. У цэлым гэта яму ўдавалася, хоць сутыкненні з палітычнымі



Правообладатель Народная асвета

сапернікамі ён не пазбегнуў. З самага пачатку свайго праўлення Казіміру давялося змагацца з сынам Жыгімонта Кейстутавіча Міхалам, які прэтэндаваў на велікакняжацкі трон. Аднак найбольшыя клопаты прынёс яму слуцкі князь Алелька (Аляксандр), сын колішняга кіеўскага князя Уладзіміра Альгердавіча. Нашчадкі Алелькі (Алелькавічы) былі незадаволены аддаленнем іх ад палітычнай улады ў дзяржаве. У 1481 г. яны арганізавалі змову супраць Казіміра. Змова была выкрыта, а змоўшчыкі пакараны смерцю ці ўцяклі ў Маскву.

**Вышэйшыя дзяржаўныя пасады ў ВКЛ.** Як ужо адзначалася, у склад рады ўваходзілі прадстаўнікі вышэйшага кіраўніцтва дзяржавы. Яно было прадстаўлена ваяводамі, кашталянамі, мар-



Пасяджэнне сойма ВКЛ. *Гравюра XVI ст.*



Правообладатель Народная асвета

шалкам, канцлерам, вялікім і палявым гетманамі, земскім і дворным падскарбіямі, старостамі. **Ваяводы** змянілі ў XV ст. колішніх намеснікаў. Яны ўзначальвалі буйнейшыя тэрытарыяльныя адзінкі — *ваяводствы*, якія ў XVI ст. сталі дзяліцца на *паветы*. Ваявода сумяшчаў функцыі вышэйшай адміністрацыйнай, ваеннай і судовай улады ў ваяводстве. Падобныя ж функцыі ў паветах выконвалі *старосты*, якія мелі сваіх намеснікаў — падстаростаў. **Кашталяны** выступалі як кіраўнікі велікакняжацкіх замкаў.

Важная роля ў ажыццяўленні справаводства ў ВКЛ належала **канцлерам**. Спачатку яны толькі ўзначальвалі канцылярыю і адказвалі за выдачу дакументаў, аднак з сярэдзіны XVI ст. канцлеры ператварыліся, фактычна, у намеснікаў вялікага князя.

**Маршалак** кіраваў гаспадарскім дваром, прымаў паслоў, сачыў за прыдворным этыкетам, кіраваў гвардыяй і прыдворнай стражай, адказваў за бяспеку манарха.

Кіраўніцтва войскам належала **вялікаму гетману**, якога замяшчаў *палявы гетман*. **Земскі падскарбі** загадваў дзяржаўным скарбам, або казной. Намеснікам земскага падскарбія быў *дворны падскарбі*.

**Рада і сойм.** У часы праўлення Казіміра адбываецца ўмацаванне вышэйшага дарадчага органа дзяржавы — **рады**. У XIV ст. рада існавала як дапаможны орган пры вялікім князі. У XV ст. яна набыла самастойнае значэнне.

Рада, ці *паны-рада*, складалася з буйнейшых феадалаў, каталіцкіх біскупаў і вышэйшых службовых асоб дзяржавы. Да правоў рады належалі: выбранне вялікага князя, арганізацыя абароны дзяржавы, міжнародныя справы, выданне законаў, разгляд найважнейшых судовых спраў. Тэрміновыя пытанні вырашаў вузкі склад радных паноў: віленскія і троцкія ваявода і кашталян, віленскі біскуп, гетман, канцлер і маршалак.

Пасля смерці Казіміра вялікім князем літоўскім стаў яго сын **Аляксандр**. Па патрабаванні рады паноў у **1492 г.** Аляксандр выдаў прывілей. Вялікі князь абавязваўся без дазволу рады не рабіць



Правообладатель Народная асвета



Вялікі князь літоўскі Аляксандр (1492—1506 гг.). *Мініяцюра пачатку XVI ст.*

ніякіх расходаў і не раздаваць самаўладна дзяржаўныя пасады. Усю знешнюю і ўнутраную палітыку вялікі князь абавязваўся праводзіць толькі з адабрэння рады і толькі з яе згоды выдаваць законы. Рада, якая раней была дарадчым органам, была прызнана органам дзяржаўнага кіравання.

З умацаваннем рады паноў узніклі **соймы** (сеймы) — *з'езды шляхты ВКЛ*. Шляхта ўмацавала свае пазіцыі ў часы праўлення Казіміра. На вядзенне вайны неабходна было атрымаць яе згоду, а гэта патрабавала склікання сойма. Шляхта ўжо не хацела пагаджацца з тым, каб у дзяржаве важныя пытанні вырашаліся без яе ўдзелу. На сойм прыбывала ўся рада паноў, усе вышэйшыя дзяржаўныя чыноўнікі і ўсе жадаючыя феадалы. Прапановы сойма нельга было не ўлічваць: незадаволеная шляхта магла не ўхваліць падаткі на вядзенне вайны. Таму вялікі князь амаль заўсёды прыслухоўваўся да прапаноў ці просьбаў сойма. У XVI ст. сойм стаў найвышэйшым дзяржаўным і кантралюючым органам.



Правообладатель Народная асвета

У 1564—1566 гг. былі ўтвораны *павятовыя соймікі*, на якіх мясцовая шляхта вырашала свае справы, і *павятовыя суды*, у якіх судзіліся ўсе феадалы: як дробная шляхта, так і магнаты.




Схема дзяржаўнага кіравання ВКЛ у сярэдзіне XVI ст.

**Заканадаўства ВКЛ**. Развіццё феадальнага грамадства ВКЛ прывяло да таго, што ў пачатку XVI ст. узнікла патрэба ў дасканалым заканадаўстве. З гэтай мэтай у **1529** г. усе выдадзеныя раней вялікімі князямі прывілеі, законы, сабраныя ў Судзебніку 1468 г., дзяржаўныя пастановы і старыя звычаі былі запісаны ў адну кнігу, названую **Статут Вялікага княства Літоўскага**. Выданне Статута было вельмі важнай падзеяй. Гэтым зводам законаў павінны былі кіравацца ўсе дзяржаўныя ўстановы. У ім былі адлюстраваны асновы дзяржаўнага ладу, прававое становішча саслоўяў, абавязкі дзяржаўных і судовых органаў. Падкрэсліваліся абавязкі вялікага князя па захаванні тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы, адстойванні



Герб ВКЛ — «Пагоня»



Правообладатель Народная асвета



Надмагілле Альбрэхта Гаштольда

інтарэсаў яе жыхароў. У той жа час Статут адстойваў інтарэсы баяраў, замацоўваў бяспраўе простага люду, узаконьваў панаванне землеўладальнікаў-феадалаў над сялянамі.

Статут ВКЛ 1529 г. быў падрыхтаваны пад кіраўніцтвам **Альбрэхта Гаштольда —** канцлера ВКЛ. Ён усімі сіламі пацвярджаў самастойнасць ВКЛ і яго незалежнасць ад Польшчы, сцвярджаў, што вышэйшыя каштоўнасці — гэта вера, дзяржава, культура. Толькі культура ўмацоўвае дзяржаву, і мудра робіць тая дзяржава, якая развівае культуру, гуманныя, добразычлівыя адносіны паміж людзьмі.

**Пытанні і заданні**

1. Ахарактарызуйце праўленне вялікага князя Казіміра IV. 2. Назавіце асноўныя палажэнні прывілея Казіміра 1447 г. З якой мэтай ён быў выдадзены? 3. Якія заканадаўчыя акты юрыдычна замацавалі запрыгоньванне сялян? 4. Якую ролю ў кіраванні дзяржавай выконвала рада ў XV ст.? З каго яна складалася, якія пытанні вырашала? 5. Што такое сойм? Якую ролю ў кіраванні ВКЛ выконвалі соймы? 6. Як змянілася роля вялікага князя літоўскага згодна з прывілеем 1492 г.? 7. Выкарыстоўваючы схему, раскажыце, як было арганізавана дзяржаўнае кіраванне ВКЛ у сярэдзіне XVI ст. 8. З якой мэтай быў распрацаваны Статут ВКЛ 1529 г.?

**Гістарычная крыніца**

**З прывілея вялікага князя літоўскага Казіміра**

*02.05.1447*

3. Таксама згаданым прэлатам, княжатам, рыцарам, шляхцічам, баярам, мяшчанам згаданых зямель Вялікага княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага мы далі: што ні па ніякаму нагавору, яўнаму



Правообладатель Народная асвета

ці тайнаму, тых княжат, рыцараў, шляхцічаў, баяр, мяшчан не будзем ані караць, ані забіраць маёнткі ці грошы, ані арыштоўваць, ані праліваць кроў, але вочы ў вочы няхай абодва стануць на судзе, паводле права хрысціянскага, каторы ж будзе па закону вінаваты, той паводле звычая і права кароны Польскай павінен быць пакараны і асуджаны ў адпаведнасці з велічынёй яго злачынстваў.

4. Таксама за праступак, калі хто ўчыніць, ніхто іншы, як толькі той вінаваты, хто ўчыніць, паводле права хрысціянскага павінен быць пакараны; але ж ані жонка за праступак мужа свайго, ані бацька за праступак сына, ані іншы прыроджаны, ані слуга, толькі калі б быў саўдзельнікам таго злачынства, толькі за выключэннем злачынстваў супраць нашага гаспадарства.

5. Таксама дазваляем, каб княжаты, рыцары, шляхцічы, баяры, добраахвотна мелі б магчымасць выехаць з нашых зямель княства Вялікага, для лепшага шчасця набыцця, альбо ўчынкаў рыцарскіх, да любых зямель, краін, толькі выключаючы краіны непрыяцельскія, але куды б ні выязджалі са сваіх маёнткаў, каб служба наша не была занядбаная, але і нам і намеснікам нашым каб столькі служылі, як бы самі тут былі…

*Што такое прывілей? На каго распаўсюджваўся прывілей вялікага князя Казіміра? Як павінны былі судзіцца феадалы ВКЛ? Якія правы атрымалі феадалы ВКЛ паводле прывілея 1447 г.?*

**Гэта цікава.** Прадстаўніком аднаго з найбольш уплывовых у гісторыі ВКЛ магнацкіх родаў з'яўляецца Альбрэхт Гаштольд (каля 1475—1539). Ён займаў вышэйшыя дзяржаўныя пасады: ваяводы віленскага, канцлера ВКЛ. Выступаў супраць уніі з Польскім Каралеўствам. У 1528 г., паводле попісу войска ВКЛ, са сваіх маёнткаў выстаўляў 466 узброеных вершнікаў — найбольшае вайсковае апалчэнне ў ВКЛ. Пад наглядам Гаштольда быў складзены Статут ВКЛ 1529 г. У яго вялікай бібліятэцы, акрамя славянскіх рукапісаў, былі кнігі на лацінскай, польскай і чэшскай мовах.

**Да ўрока «Наш край».** Даведайцеся, з імёнамі якіх шляхецкіх і магнацкіх родаў звязана гісторыя вашай мясцовасці. Чым вылучыліся яго асобныя прадстаўнікі?



Правообладатель Народная асвета

# §15. Унутрыпалітычнае становішча ВКЛ у першай палове XVI ст.

**Успомніце:**

*1. Прычыны і вынікі грамадзянскай вайны 1432—1439 гг. 2. Якія правы атрымала феадальная знаць ВКЛ каталіцкага веравызнання ў XIV—XV стст.?*

**Выступленне М. Глінскага: прычыны, мэты і вынікі.** У пачатку XVI ст. зноў абвастрылася барацьба паміж буйнейшымі феадальнымі групоўкамі за ўладу ў дзяржаве. У апошнія гады жыцця вялікага князя Аляксандра Ягелона ўзмацніўся ўплыў маршалка дворнага князя **Міхаіла Глінскага**. Доўгі час ён знаходзіўся за мяжой — у Германіі, Італіі, Іспаніі, быў на службе ў войску германскага імператара. Спрактыкаваным вайскоўцам Глінскі вярнуўся на радзіму, дзе атрымаў ад вялікага князя зямельныя маёнткі і высокія пасады. Асабліва яго аўтарытэт узрос пасля бітвы пад Клецкам у 1506 г., дзе Глінскі атрымаў бліскучую перамогу над крымскімі татарамі.

Набліжанасць Глінскага да манаршага двара выклікала зайздрасць часткі старой літоўскай знаці. Асабліва варожа ставіўся да імклівага ўзвышэння Глінскага Ян Забярэзінскі, які па яго віне страціў пасаду троцкага ваяводы. Пасля смерці Аляксандра новым вялікім князем стаў Жыгімонт I Стары. Нядобразычліўцы Глінскага сталі пераконваць Жыгімонта ў намеры роду Глінскіх захапіць уладу. Князь Міхаіл спрабаваў апраўдацца перад манархам, патрабаваў справядлівасці, але, не дачакаўшыся яе ад Жыгімонта, вырашыў распраўіцца з крыўдзіцелямі сам. На пачатку **1508** г. ён з узброеным атрадам напаў на маёнтак Забярэзінскага. Забіўшы свайго ворага, Глінскі скіраваўся ў Тураў.

Там, сабраўшы каля 2 тыс. сваіх прыхільнікаў, М.Глінскі выступіў супраць Жыгімонта I Старога. Мэтай яго выступлення было вярнуць сабе і свайму роду былую ролю ў дзяржаве. У выпадку няўдачы планавалася стварэнне самастойнага княства з цэнтрам у Кіеве. Нягледзячы на сваё каталіцкае веравызнанне, Глінскі імкнуўся прыцягнуць на свой бок праваслаўных феадалаў, якіх ён заклікаў абараняць веру бацькоў. Вясной 1508 г. у лагеры Глінскага з'явіліся



Правообладатель Народная асвета

паслы маскоўскага вялікага князя Васіля III. Яны прапаноўвалі яму вайсковую падтрымку і перадачу роду Глінскіх усіх заваяваных ім зямель ВКЛ. Узамен князь Міхаіл павінен быў прызнаць сваю залежнасць ад Масквы. Глінскі прыняў прапанову і яго сілы злучыліся з маскоўскім войскам. Атрады Глінскага і Васіля III асаджалі Мінск, дзейнічалі пад Слуцкам, Навагрудкам, Слонімам, нават непадалёку ад Вільні.

Калі пад Лідай з'явілася войска Вялікага княства Літоўскага, Міхаіл Глінскі і яго саюзнікі мусілі адступаць на ўсход, да Оршы, якую спрабавалі ўзяць галоўныя маскоўскія сілы. У ліпені 1508 г. сюды падышла і армія ВКЛ. Войскі Васіля III не рашыліся на бітву і адступілі далей на ўсход. Глінскі скіраваўся ў Мазыр, дзе меў намер працягнуць барацьбу. Аднак у кастрычніку 1508 г. паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай быў падпісаны мір, і Глінскі застаўся без падтрымкі. На поўдзень Беларусі рушыла армія Вялікага княства Літоўскага. Страціўшы надзею на поспех, Міхаіл Глінскі са сваімі братамі і аднадумцамі пакінуў ВКЛ і выехаў ва ўладанні Васіля III. Выступленне Глінскіх скончылася іх паражэннем. Разам з тым яно паспрыяла паляпшэнню становішча праваслаўнай знаці. Падзеі 1508 г. яшчэ раз паказалі, што ўтрымаць «рускія» землі можна будзе толькі тады, калі інтарэсы беларускіх і украінскіх феадалаў будуць улічвацца, а самі яны атрымаюць доступ да кіравання дзяржавай.

**Кансалідацыя вярхоў грамадства ВКЛ**. XVI стагоддзе часам называюць *«залатым векам»* Вялікага княства Літоўскага. Менавіта так яно ўспрымалася людзьмі наступнага, вірлівага XVII стагоддзя. Выразнае ідэалізаванне гэтых часоў выказвалася Фёдарам Еўлашоўскім, вядомым сваімі мемуарамі, і Іванам Мялешкам, аўтарам славутага сатырычнага твора «Прамова Мялешкі».

Чым жа прываблівала гэта, у прынцыпе, зусім няпростае стагоддзе, людзей пазнейшых часоў? Найперш, адносным грамадскім спакоем, адсутнасцю зацятага ўнутранага супрацьстаяння паміж грамадствам і ўладай, а таксама паміж асобнымі групоўкамі ўнутры самога грамадства. Гэта, канешне ж, не азначала, што супярэчнасцей у Вялікім княстве Літоўскім не існавала зусім. Шлях-



Правообладатель Народная асвета



Касцюмы знаці ВКЛ XV ст. *З мініяцюр Радзівілаўскага летапісу*

та імкнулася да атрымання большых вольнасцей па ўзоры суседняй Польшчы, дзе ўсе важнейшыя пытанні даўно вырашаліся на соймах пры рашаючым слове шляхецкіх дэпутатаў. Магнаты ж ВКЛ па-ранейшаму не жадалі выпускаць з рук уладу і раўніва аберагалі свой выключны статус. Асобныя магнацкія роды варагавалі паміж сабой за ўплыў у дзяржаве.

Разам з тым тагачаснае грамадства рухалася ў напрамку згладжвання супярэчнасцей. Гэтыя супярэчнасці, спрэчкі і канфлікты ўлада была яшчэ ў стане вырашыць мірна, пры дапамозе згоды і літары закона.

Ва ўмовах шматлікіх войнаў шляхта ўсё больш адчувала сваю значнасць. Вярхоўная ўлада мусіла ўсё больш прыслухоўвацца да голасу дробных і сярэдніх феадалаў на соймах, бо гэта быў голас войска. Ад яго залежала, якія сілы сустрэнуць непрыяцеля на полі бою і колькі грошай будзе сабрана на ўтрыманне наёмнай арміі.

Найбольшых поспехаў па ўраўноўванні сваіх правоў з правамі магнатаў шляхта дабілася ў 60-я гады XVI ст. У 1562 г. пад Віцебскам сабраўся сойм, які патрабаваў «учыніць супольны сойм з палякамі. Каб разам караля выбіраць, мецъ агульную абарону, супольна соймікаваць і права аднолькавае ўжываць». Каб адцягнуць позіркі шляхты ад Польшчы, вярхоўная ўлада пайшла на ўраўноўванне яе



Правообладатель Народная асвета

правоў з правамі магнатаў. З гэтай мэтай былі ўтвораны *павятовыя соймікі*, на якіх мясцовая шляхта вырашала свае справы, і *павятовыя суды*, у якіх судзіліся як дробная шляхта, так і магнаты.

Значных поспехаў удалося дасягнуць і ў справе пераадолення рэлігійных супярэчнасцей. Ужо ў першай палове XVI ст. старыя пастановы, па якіх вышэйшыя пасады ў дзяржаве маглі займаць толькі католікі, не выконваліся. Прадстаўнікі праваслаўных родаў — Астрожскія, Глябовічы, Ільінічы, Сапегі, Солтаны і інш. — пастаянна ўваходзілі ў склад найвышэйшага дзяржаўнага органа — рады. Прадстаўнікі праваслаўнай знаці трапляліся нават у вузкім складзе рады, дзе ў розныя часы засядалі гетман ВКЛ князь *Канстанцін Астрожскі* ці троцкі кашталян *Рыгор Хадкевіч*.

Яшчэ больш выразнай стала відавочнасць састарэласці палажэння аб выключных правах католікаў на кіраванне дзяржавай з распаўсюджаннем у ВКЛ і Польшчы Рэфармацыі. Пратэстантамі зрабіліся многія прадстаўнікі традыцыйна каталіцкіх родаў. Яны ніколі не змаглі б пагадзіцца з пазбаўленнем іх палітычных правоў. У такіх абставінах улады ВКЛ мусілі адмовіцца ад прызнання за каталіцкім касцёлам выключнага становішча. З **1563** г. вярхоўныя пасады ў дзяржаве маглі займаць прадстаўнікі шляхты любога хрысціянскага веравызнання. Ва ўмовах зацятага рэлігійнага супрацьстаяння ў краінах Заходняй Еўропы верацярпімасць у Вялікім княстве Літоўскім была з'явай унікальнай.

**Жыгімонт I Стары.** Наступленне «залатога веку» ў дзяржаве было звязана з імем вялікага князя **Жыгімонта I Старога**, які правіў з 1506 па 1548 г. Мянушку «Стары» ён атрымаў таму, што задоўга да сваёй смерці забяспечыў свайму сыну права атрымання трона. Вымушаны на пачатку свайго праўлення падаўляць выступленне Міхаіла Глінскага, у далейшым Жыгімонт шукаў паразумення з рознымі групоўкамі феадальнага грамадства. У часы яго княжання канчаткова аформіўся сойм як адзін з важнейшых органаў дзяржаўнага кіравання. Пры ім быў прыняты першы звод феадальнага права на землях ВКЛ — **Статут 1529** г.

Жыгімонт I Стары быў спакойным, не ваяўнічым па натуры чалавекам. Пры яго праўленні Вялікае княства Літоўскае здолела вый-



Правообладатель Народная асвета

сці з паласы зацяжных войнаў. Былі спынены войны з Маскоўскай дзяржавай, арганізавана адносна эфектыўная сістэма абароны ад крымскіх татар, што спрыяла захаванню спакою ў дзяржаве.

Значны росквіт перажывала ў часы праўлення Жыгімонта І Старога культура. Будучы сам адукаваным чалавекам, Жыгімонт спрыяў развіццю адукацыі, навукі і мастацтва. Пры ім выдаваў свае кнігі Францыск Скарына. Развівалася літаратура, адкрываліся друкарні і школы. Па запрашэнні Жыгімонта да яго двара сцякаліся з розных краёў Еўропы таленавітыя мастакі, музыканты і скульптары. На беларускія землі пранікаюць павевы Рэнесанса. Гэтаму спрыяла і тое, што жонкай Жыгімонта І Старога ў 1518 г. стала Бона Сфорца, прадстаўніца славутага міланскага роду. Разам з ёй прыехала значная колькасць італьянцаў, пераважна людзей культуры, якія паспрыялі станаўленню ў ВКЛ новых мастацкіх густаў.

З перыядам праўлення Жыгімонта І Старога звязана і з'яўленне ў дзяржаве паслядоўнікаў пратэстантызму. Сам вялікі князь ставіўся да ідэй Рэфармацыі негатыўна, аднак не здолеў стрымаць пашырэнне новых ідэй сярод сваіх падданых. Гэта паспрыяла распаўсюджанню рэлігійнай цярпімасці і кансалідацыі шляхецкага грамадства.



Вялікі князь літоўскі
Жыгімонт І Стары (1506—1548 гг.)



Бона Сфорца



Правообладатель Народная асвета

## Пытанні і заданні

1. Ахарактарызуйце выступленне М. Глінскага па наступным плане: калі адбылося; прычыны і мэты выступлення; асноўныя ўдзельнікі; вынікі выступлення. 2. Як змянілася становішча феадальнай знаці ВКЛ праваслаўнага веравызнання ў XVI ст.? 3. Якіх правоў дабілася дробная і сярэдняя шляхта ВКЛ у XVI ст.? 4. Дайце ацэнку дзейнасці Жыгімонта I Старога. 5. Чаму XVI ст. называюць «залатым векам» Вялікага княства Літоўскага?

## Гістарычная крыніца

### Са Статута Вялікага княства Літоўскага

*1529 г.*

...Таксама пастанаўляем, што з гэтага часу мы самі і нашчадкі нашы, будучы ў дзяржаве нашай кароне Польскай, не маем права нікому нічога ў дзяржаве нашай Вялікім княстве Літоўскім, ні маёнткаў, ні людзей і зямель даваць і ранейшых падараванняў, калі каму далі, пацвярджаць. Няхай мы самі і нашчадкі нашы, [толькі] будучы ў Вялікім княстве, падданым нашым будзем павінны [маёмасць] даваць і іх абдароўваць па заслугах. А прывілеяў на вечныя часы не павінны іначай нідзе нікому даваць, толькі як калі будзем разам з панамі-радай нашымі на вальным сойме. А калі б хто пасля гэтага статута нашага людзей ці зямлю, калі мы будзем у Польшчы, выпрасіў альбо ранейшае падараванне наша прывілеем нашым пацвердзіў, такія лісты і прывілеі нашыя мы адмяняем і не павінны мы самі і нашчадкі нашы іх прызнаваць...

...Таксама [абяцаем клапаціцца] аб захаванні старых прывілеяў земскіх і звычаяў, якія ў тых прывілеях апісаны, пацверджаны і ўхвалены, або аб выдачы і памнажэнні новых, якія маглі б прынесці карысць нам і грамадству, [гэтыя прывілеі] толькі паводле старых традыцый, з ведама, з парадай і з дазволу рады нашай Вялікага княства Літоўскага складаць і выдаваць будзем.

*Якія абмежаванні на ўладу вялікага князя літоўскага ўведзены ў Статуце? Растлумачце, хто меў права атрымліваць маёмасць у Вялікім княстве Літоўскім. З якой мэтай павінны захоўвацца старыя і выдавацца новыя прывілеі? Якім чынам павінны выдавацца новыя прывілеі?*



Правообладатель Народная асвета

**!** **Гэта цікава.** Аўстрыйскі дыпламат Сігізмунд Герберштэйн у сваіх «Запісках аб Масковіі» паведамляў: Князь жа Міхаіл Глінскі яшчэ юнаком накіраваўся ў Германію, выказаў храбрасць на службе ў Альберта, герцага саксонскага... і, прайшоўшы ўсе ступені вайсковай службы, набыў сабе слаўнае імя. Выхаваны ў нямецкіх звычаях, ён вярнуўся на радзіму, дзе карыстаўся вялікім уплывам і займаў вышэйшыя пасады пры каралю Аляксандру, так што той усе складаныя справы вырашаў па яго парадах і жаданні...

## § 16. Войска і вайсковая справа ў ВКЛ

**Успомніце:**

*1. Як фарміравалася дружына полацкага князя? 2. У якіх выпадках збіралася народнае апалчэнне ў Полацкім княстве? Хто ў яго ўваходзіў?*

**Арганізацыя войска.** У XIV—XVI стст. Вялікае княства Літоўскае вяло шматлікія войны. Таму яго кіраўніцтва вялікае значэнне надавала стварэнню баяздольнага войска. Першапачаткова ў Вялікім княстве Літоўскім вайсковая служба з'яўлялася абавязкам кожнага мужчыны, здатнага насіць зброю. Яшчэ ў канцы XIV ст. у выпадку ўварвання ворага ўсеагульнае народнае апалчэнне збіралася для яго разгрому і праследавання. Таму такая форма ўсеагульнай вайсковай службы атрымала назву **пагоня**. Акрамя пагоні, існавалі і прафесійныя воіны-дружыннікі. З цягам часу іх значэнне ў вайсковай справе ўзрастала. Яны атрымлівалі зямлю разам з сялянамі, за валоданне якой павінны былі выязджаць на вайну ў поўным узбраенні. Падобная форма арганізацыі войска ў XV—XVI стст. атрымала назву **паспалітае рушэнне**.

Частку паспалітага рушэння складалі цяжкаўзброеныя *капійнікі*. Яны былі ўзброены коп'ямі і мячамі, мелі надзейнае засцерагальнае ўзбраенне, больш моцных коней. Другая частка — *стральцы* — мела лукі ці арбалеты. Воіны аб'ядноўваліся ў дробныя атрады — *коп'і*, якія пазней называліся початамі, а коп'і — у **харугвы**. Яны выступалі пад уласнымі сцягамі-харугвамі (адсюль паходзіць іх назва). Харугвы камплектаваліся па тэрытарыяльным прынцыпе або



Правообладатель Народная асвета

выстаўляліся буйнымі феадаламі. Падчас бою харугвы будаваліся звужанымі наперадзе калонамі. Спераду размяшчаліся капійнікі, за імі — стральцы.

Да канца XVI ст. паспалітае рушэнне Вялікага княства Літоўскага складалася амаль выключна з коннікаў. Пяхота выкарыстоўвалася пераважна для аховы абозу, пры пабудове дарог для войска ці ў крытычныя моманты бітвы. Каб ператварыць абоз у непрыступны лагер, ён акружаўся вазамі, якія маглі акоўвацца жалезам і звязвацца ланцугамі. З канца XIV ст. у Вялікім княстве Літоўскім ужывалася артылерыя.

У пачатку XVI ст. у вайсковай справе Вялікага княства Літоўскага адбыліся істотныя змены. Неабходнасць весці цяжкія войны з лёгкімі і хуткімі коннікамі на поўдні і ўсходзе прывяла да з'яўлення новых відаў конніцы — гусараў і казакоў. Аснову ўзбраення *гусараў* складалі кап'ё і шчыт. Пазней гусары запазычылі ў капійнікаў традыцыю выкарыстання даспехаў і ператварыліся ў цяжкую кавалерыю. Асаблівасцю *казакоў* была наяўнасць у іх лука, часам у спалучэнні з кароткім кап'ём.

Атрымаўшы шматлікія прывілеі, феадалы гублялі інтарэс да вайсковай справы. Іх клопаты пераключаліся на вядзенне гаспадаркі ў маёнтках. Баяздольнасць паспалітага рушэння падала. Таму з пачатку XVI ст. у Вялікім княстве пачынаюць выкарыстоўвацца *наёмнікі*. Спачатку яны набіраліся пераважна з іншаземцаў, а пасля і з мясцовай збяднелай шляхты. Для наёмнікаў вайсковая служба была асноўным заняткам, яны не імкнуліся раз'ехацца па дамах адразу ж пасля бітвы або нават да яе, таму наёмнае войска было больш надзейным. Аднак не атрымаўшы аплаты, наёмнікі маглі таксама страціць цікавасць да службы і займацца рабаўніцтвам мясцовага насельніцтва. З пашырэннем наёмнага войска ў ВКЛ з'явілася прафесійная пяхота, неабходная для абароны і будаўніцтва ўмацаванняў. Сярод пехацінцаў таксама выдзяляліся капійнікі ў даспехах і стральцы з агнястрэльнай зброяй. Наёмныя воіны — **жаўнеры** — фарміраваліся ў роты на чале з ротмістрамі. Конныя роты дзяліліся на *почты*, пешыя — на *дзесяткі*.

**Вайсковая служба.** За права валодання зямлёй феадалы павінны былі выязджаць на вайну самі і прыводзіць з сабой узброеных



Правообладатель Народная асвета

воінаў. Доўгі час ніякай сталай нормы ў памерах службы не было. Асобныя рыцары нават імкнуліся выставіць воінаў у кепскім узбраенні і на горшых конях. Толькі на пачатку XVI ст. колькасць воінаў, іх узбраенне і якасць коней сталі спецыяльна агаворвацца ў агульнадзяржаўных дакументах. Так, Статут ВКЛ 1529 г. абавязваў землеўладальнікаў выпраўляць на вайну воінаў на добрым кані, з кап'ём, шчытом, мячом, у шлеме і панцыры. Багатыя паны, уладальнікі тысяч сялян, выстаўлялі цэлыя арміі. Дробныя шляхцюкі служылі «паводле сваёй магчымасці». Некаторыя з'яўляліся на вайну пешшу і нават без зброі. Ад такога «рыцарства» карысці было няшмат, таму галоўную ролю адыгрывалі на вайне добра ўзброеныя магнацкія атрады.

На чале войска стаяў вялікі князь, а ў яго адсутнасць — гетман. У сярэдзіне XVI ст. у гетмана з'явіўся памочнік — *палявы гетман*. Для таго каб войска перайшло пад уладу гетмана, патрабавалася абвяшчэнне збору паспалітага рушэння. Гэта рабілася пасля адабрэння вальным соймам. Пасля гэтага вялікі князь ці паны-рада рассылалі па ваяводствах і паветах лісты, у якіх абвяшчаліся час і месца збору войска. У паветах зборам рыцарства кіравалі харужы і кашталян, пасля чаго ўжо сфарміраваныя харугвы пераходзілі ў падпарадкаван-



Воіны ВКЛ канца XV — пачатку XVI ст.



Правообладатель Народная асвета

не ваяводы. Далей харугвы рухаліся да месца збору ўсяго войска і паступалі ў распараджэнне гетмана. Там жа праводзіўся палявы попіс (смотр) для высвятлення колькаснага складу, якасці коней і ўзбраення рыцарства. Пасля гэтага войска лічылася гатовым для правядзення ваеннай кампаніі. Непасрэднае камандаванне павятовымі харугвамі ўскладалася на павятовых харужых. Што да харугваў буйных феадалаў, то і збор, і камандаванне імі падчас бою ўскладалася на саміх магнатаў. Яны трымаліся асобна і дзейнічалі пад уласнымі сцягамі.

Парадак у войску рэгуляваўся спецыяльнымі дакументамі — *вайсковымі уставамі,* ці *«артыкуламі»*. Яны прадугледжвалі суровае пакаранне за непаслушэнства гетману, крадзеж, бойкі, уцёкі з войска. Аднак гэта не магло прадухіліць парушэнняў дысцыпліны, што кепска адбівалася на баяздольнасці паспалітага рушэння. Яно добра дзейнічала ў адкрытым полі, магло выйграць адну-дзве бітвы, але доўга ваяваць шляхта не жадала. Таму ў XVI ст. узрастае значэнне наёмнага войска. Наёмнікі не толькі ўдзельнічалі ў палявых бітвах, але неслі гарнізонную службу ў гарадах і замках, падтрымлівалі парадак у мірны час, падаўлялі народныя хваляванні.

**Узбраенне.** Вайсковая справа Вялікага княства Літоўскага адчувала моцныя ўплывы як з захаду, так і з усходу. Спачатку тут пераважалі традыцыі, сфарміраваныя яшчэ ў часы Старажытнай Русі. Нават у літоўскіх землях мясцовыя майстры капіравалі так званыя «рускія» шлемы, завершаныя выцягнутымі шпілямі. Уплыў рускай традыцыі на развіццё ўзбраення працягваўся і далей.

Разам з тым барацьба з крыжакамі і саюзныя адносіны з Польшчай прывялі да знаёмства насельніцтва Беларусі, Літвы і Украіны з заходняй вайсковай традыцыяй. Каб паспяхова супрацьстаяць цяжкой рыцарскай конніцы, неабходна было валодаць не горшым узбраеннем. Такое ўзбраенне закуплялася ў Польшчы і іншых краінах Еўропы, даставалася ў якасці трафея, выраблялася мясцовымі майстрамі па еўрапейскіх узорах.


Шлем рыцара ВКЛ канца XV — пачатку XVI ст.



Правообладатель Народная асвета

Аснову ўзбраення рыцара складалі *кап'ё* і *шчыт*. Яны дапаўняліся *мячом*. У XVI ст. побач з мячамі ўсё часцей сталі выкарыстоўвацца *корды* (аднализовы меч), *шаблі*, *шпагі* і *кінжалы*. Добра ўзброеныя ваяры маглі дадаткова мець сякеру, баявы молат, булаву і г. д. Галаву рыцара бараніў *шлем*. Цела воіна пакрывала *кальчуга* або даспехі з жалезных пласцін. У цяжкаўзброеных коннікаў жалезнымі пласцінамі пакрываліся таксама рукі і ногі. Бедныя воіны абмяжоўваліся скуранымі або тоўстымі прашыванымі кафтанамі. Для стральбы па праціўніку шырока выкарыстоўваліся *лукі* і *арбалеты*. У XVI ст. арбалеты выцясняюцца стрэльбамі — *ручніцамі* і *аркебузамі*.



Даспехі Мікалая Радзівіла Чорнага. Сярэдзіна XVI ст.

З канца XIV ст. у ВКЛ распаўсюджваецца артылерыя, якая замяніла каменекідальныя машыны. Гарматы маглі страляць каменнымі або металічнымі ядрамі. Цяжкія гарматы служылі для разбурэння варожых умацаванняў. Лёгкія гарматы маглі выкарыстоўвацца для абароны замкаў ці ў адкрытым баі.

Першыя гарматы завозіліся ў ВКЛ з-за мяжы. У сярэдзіне XVI ст. была вядомая *людвісарня* (гарматня) у Вільні. Яна служыла не толькі буйнейшым месцам вырабу і захавання зброі, але і месцам, адкуль яна цэнтралізавана рассылалася ў гарады і замкі дзяржавы. У канцы стагоддзя шырокую вядомасць атрымала людвісарня ў Нясвіжы. Многія нясвіжскія гарматы з'яўляліся творамі мастацтва. Яны былі багата ўпрыгожаны, мелі ўласныя назвы («Сава», «Гідра») і ваяўнічыя дэвізы. У гэты ж час выраб гармат распаўсюдзіўся і ў іншых беларускіх гарадах.

Войска Вялікага княства Літоўскага неаднаразова даказвала свае высокія баявыя якасці. Найбольш эфектыўна яно дзейнічала ў адкрытым полі. Але падчас аблогі і абароны замкаў, што патрабавала шмат часу, яно праяўляла сябе значна горш. У гэтым заключалася адна з прычын ваенных няўдач, якія напаткалі ВКЛ у XVI ст.



Правообладатель Народная асвета

**Пытанні і заданні**

1. Растлумачце значэнне паняццяў: пагоня, паспалітае рушэнне, харугвы, жаўнеры. 2*. Складзіце схему арганізацыі войска ў ВКЛ у XV—XVI стст. 3. Як збіралася паспалітае рушэнне? Якія недахопы ў абароне краіны мела такая арганізацыя войска? 4. Чаму з пачатку XVI ст. у ВКЛ пачынае выкарыстоўвацца наёмнае войска? Якія станоўчыя і адмоўныя бакі мае выкарыстанне наёмнага войска? 5. Апішыце ўзбраенне капійніка, стральца, гусара, казака. Параўнайце ўзбраенне воіна ВКЛ і заходнееўрапейскага рыцара. 6. Калі з'явілася агнястрэльная зброя? Якія віды агнястрэльнай зброі выкарыстоўваліся ў XVI ст.? 7. Чаму войска ВКЛ добра ваявала ў адкрытым полі і менш эфектыўна праяўляла сябе пры абароне?

### Гістарычная крыніца

**З Земскай ухвалы 1529 г. аб абароне дзяржавы**

...каждый маеть ставити с осми служоб людей своих пахолка доброго у сукни цветной, не в сермязе, на котором бы был панцер добрый, а прылбица, а меч, а павеза, а древцо с прапором цветным, а конь бы был под ним в четыре копы грошей.

*Як феадалам належала выстаўляць воінаў? Чаму пытанне аб узбраенні воінаў вырашалася на дзяржаўным узроўні?*

## § 17. Знешнепалітычнае становішча ВКЛ у канцы XV — першай палове XVI ст.

**Успомніце:**

*1. У чым сутнасць «рускага» пытання? 2. Калі адбыўся мяцеж М. Глінскага? 3. Як складваліся адносіны паміж ВКЛ і Каралеўствам Польскім?*

**Страта ВКЛ першынства ў «збіранні рускіх зямель».** Грамадзянская вайна 30-х гадоў XV ст. стала цяжкім выпрабаваннем для беларускіх зямель. Прыход да ўлады ў 1440 г. Казіміра Ягайлавіча паспрыяў прымірэнню варагуючых бакоў, аднак незадаволенасць у грамадстве заставалася. Пакрыўджаныя прэтэндэнты на ўладу, у тым ліку сын Жыгімонта Кейстутавіча, шукалі прытулку ў Маскве. Кіраўніцтва Вялікага княства Літоўскага ў сваю чаргу старалася аслабіць пазіцыі маскоўскага князя. У 1442 г. справа дайшла да ваеннага канфлікту паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай. Каб пазбегнуць далейшых сутыкненняў, абодва бакі заключылі 31 жніўня **1449** г.



Правообладатель Народная асвета

пагадненне, у якім размежавалі сферы ўплыву. За Вільняй прызнавалася права на Смаленшчыну, княствы ў вярхоўях р. Ака (вярхоўскія княствы), на саюзныя адносіны з Цвярскім і Разанскім княствамі. Аднак вялікі князь літоўскі абяцаў не прэтэндаваць на Ноўгарад, Пскоў і Ржэў.

Пагадненне 1449 г. азначала прызнанне раўнавагі сіл паміж Вільняй і Масквой. У далейшым пазіцыя Вялікага княства Літоўскага ва Усходняй Еўропе пачала слабець. Гэта было звязана з тым, што Казімір Ягайлавіч, абраны ў 1447 г. польскім каралём, большасць часу знаходзіўся ў Кракаве, мала звяртаючы ўвагу на ўсходнія справы. Адстойваючы інтарэсы Польшчы, ён вёў паспя-




Вялікае княства Літоўскае ў другой палове XV — першай палове XVI ст.



Правообладатель Народная асвета



Маскоўскія воіны.
*Гравюра XVI ст.*

ховую вайну з Тэўтонскім ордэнам, змагаўся за атрыманне венгерскага трона для свайго сына. У выніку ВКЛ адмовілася ад далейшага пранікнення ў рускія землі, імкнучыся толькі захаваць свае межы. У выніку ініцыятыва ў «збіранні рускіх зямель» перайшла да Маскоўскай дзяржавы.

У 1450-я гады маскоўскі князь фактычна падпарадкаваў сабе Цвер і Разань, умацаваў свае пазіцыі ў Ноўгарадзе. Канчаткова Наўгародская рэспубліка спыніла сваё існаванне ў 1478 г. Далучэнне багатага Ноўгарада яшчэ больш умацавала пазіцыі маскоўскага князя Івана III. Ён прад'явіў прэтэнзіі ўжо на тыя землі былой Русі, якія ўваходзілі ў ВКЛ. Спробы Казіміра Ягайлавіча арганізаваць антымаскоўскі саюз са слабеючай Залатой Ардой скончыліся няўдала. Гэта прывяло да канчатковага вызвалення ў 1480 г. Маскоўскай дзяржавы ад ардынскага ярма і яшчэ больш умацавала прэстыж Івана III.

Іншыя палітычныя абставіны таксама не спрыялі Вільні. Вораг Залатой Арды — Крымскае ханства ўступіла ў саюз з Масквой і стала пагражаць ВКЛ з поўдня. Непрыязныя адносіны складваліся ў ВКЛ і саюзнай ёй Польшчы з Малдавіяй, магутнай Турцыяй, Германскай імперыяй. Усё гэта паставіла Казіміра Ягайлавіча і яго нашчадкаў перад пагрозай вайны на некалькіх напрамках.

**Адносіны з Вялікім княствам Маскоўскім.** У 80-я гады XV ст. пачаліся сутычкі на памежжы ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы. Пасля смерці Казіміра Ягайлавіча ў чэрвені **1492** г. яны перараслі ў маштабны ваенны канфлікт. Пераход на бок Івана III шэрага вярхоўскіх князёў прывёў да поспехаў маскоўскіх войскаў. У **1494** г. было заключана мірнае пагадненне, па якому за Масквой прызнавалася права на вярхоўскія княствы і некаторыя іншыя землі.



Правообладатель Народная асвета

Імкнучыся пазбегнуць чарговага канфлікту з Масквой, новы вялікі князь літоўскі Аляксандр уступіў у шлюб з дачкой Івана III Аленай. Аднак гэта толькі пагоршыла адносіны паміж двума ўладарамі, бо неўзабаве маскоўскі князь атрымаў звесткі аб заахвочванні Алены перайсці ў каталіцтва. У **1500** г. на службу да Івана III зноў перайшоў шэраг князёў памежных з Маскоўскай дзяржавай зямель ВКЛ. У адказ на просьбу вярнуць перабежчыкаў Іван III аб'явіў чарговую вайну. Ваенныя дзеянні адбываліся не на карысць ВКЛ, войска якога ў ліпені *1500 г.* пацярпела паражэнне на *р. Вядроша*. ВКЛ спадзявалася знайсці падтрымку ў Арды і Лівонскага ордэна, Маскоўская дзяржава — у Крымскага ханства. Але ў 1501 г. Аляксандр быў выбраны польскім каралём і з'ехаў у Кракаў. У адсутнасць караля войскі Івана III дабіліся новых поспехаў, і толькі пагроза з боку Польшчы і Лівонскага ордэна прымусіла яго пайсці ў **1503** г. на мірныя перагаворы. Паводле іх, Вялікае княства Літоўскае губляла велізарныя тэрыторыі з гарадамі Бранск, Гомель, Ноўгарад-Северскі, Старадуб, Чарнігаў і інш.

Чарговая вайна працягвалася з **1507** па **1508** г. і супала з мяцяжом, на чале якога стаяў Міхаіл Глінскі. Паражэнне мяцяжу абумовіла вынікі вайны: мір, заключаны ў кастрычніку 1508 г., замацоўваў межы, якія склаліся ў выніку папярэдніх войнаў.

Найбольшага напружання супрацьстаянне паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай дасягнула ў вайне **1512—1522** гг. У 1514 г. пасля некалькіх беспаспяховых спроб войска маскоўскага князя Васіля III штурмам авалодала Смаленскам. Гэта быў, бадай што, самы небяспечны момант для ВКЛ. З'явіў-



Канстанцін Астрожскі



Правообладатель Народная асвета

ся нават праект падзелу Вялікага княства і Польшчы паміж Маскоўскай дзяржавай і Германскай імперыяй. Аднак перамога войска Вялікага княства Літоўскага пад кіраўніцтвам **Канстанціна Астрожскага** ў бітве пад Оршай **8 верасня 1514** г. прымусіла германскага імператара адмовіцца ад саюза з Масквой. Пасля гэтага вайна вялася з пераменным поспехам і завяршылася ў 1522 г. падпісаннем пагаднення. Паводле яго ўмоў, Смаленск заставаўся ў Маскоўскай дзяржаве.

Пасля смерці маскоўскага князя Васіля III у Вільні з'явіліся спадзяванні вярнуць землі, страчаныя на ўсходзе ў папярэдніх вой-



Бітва пад Оршай. *Фрагмент карціны XVI ст.*



Правообладатель Народная асвета

нах. **Летам** 1534 г. войскі ВКЛ рушылі ў Смаленскую і Северскую землі. У адказ маскоўскія войскі прадпрынялі рэйды на беларускія землі. У наступным годзе войска ВКЛ сумесна з польскімі наёмнікамі дабілася большых поспехаў, вярнуўшы Гомель. У далейшым баявыя дзеянні працягваліся даволі вяла. У лютым **1537** г. быў падпісаны мір, які прызнаваў Гомель з зямлёй за Вялікім княствам Літоўскім.

Пасля гэтай вайны на нейкі час зноў усталявалася раўнавага сіл паміж Вялікім княствам Літоўскім і Вялікім княствам Маскоўскім. Аднак у цэлым перыяд ваеннага супрацьстаяння з Масквой у канцы XV — першай палове XVI ст. быў для ВКЛ няўдалым.

**Абарона ад набегаў крымскіх татар.** Значную пагрозу паўднёвым землям Вялікага княства Літоўскага складалі крымскія татары. *Крымскае ханства* адасобілася ад Залатой Арды ў сярэдзіне XV ст. і напачатку мела прыязныя адносіны з ВКЛ. Аднак збліжэнне Вільні з Залатой Ардой, мэтай якога было аслабленне Масквы, прывяло да пагаршэння адносін з Крымам. Ужо ў 1480 г. быў заключаны саюз Крымскага ханства з Маскоўскай дзяржавай і ў далейшым крымскія татары сталі рэгулярна здзяйсняць набегі на землі ВКЛ. Найбольш пакутавалі ад набегаў украінскія землі, аднак Беларусь таксама цярпела ад татарскіх паходаў. Іх мэтай было рабаванне і захоп палонных, якія потым прадаваліся на нявольніцкіх рынках. Татары былі ў стане дасягнуць тэрыторыі Беларусі за 8—10 дзён. Яны рухаліся скрытна, праходзячы ў дзень да 200 км, а пасля рассыпаліся ва ўсе бакі, ахопліваючы велізарныя тэрыторыі. З палонам і здабычай яны зноў збіраліся разам і вярталіся назад. Усё адбывалася так імкліва, што войска ВКЛ найчасцей нават не паспявала сабрацца для адпору ворагу. З 1474 па 1569 г. татары зрабілі 75 набегаў на ВКЛ, многія з якіх дасягалі беларускіх зямель. Калі татарам удавалася перахапіць, яны, як правіла, цярпелі паражэнне. Сіламі Вялікага княства Літоўскага былі разбіты татарскія загоны на Мазыршчыне ў 1497 г., пад Давыд-Гарадком у 1503 г., пад Слуцкам у 1505 і 1508 гг.

Найбольш буйное паражэнне было нанесена татарам у **1506** г., калі на Беларусі з'явілася значнае татарскае войска, якое разбіла



Правообладатель Народная асвета



Бітва з татарамі. *Гравюра XVI ст.*

лагер каля **Клецка**. Татарскія атрады рассыпаліся ажно да Мінска, Ашмян, Крэва, Ліды, Навагрудка, Слуцка. Аднак хутка сабранае войска ВКЛ на чале з Міхаілам Глінскім здолела аператыўна падысці да Клецка, 5 жніўня атакавала ворага і разбіла яго.

Кіраўніцтва Вялікага княства Літоўскага імкнулася разарваць саюз Крыма з Масквой і нават скіраваць татарскія набегі на землі Маскоўскай дзяржавы. Для гэтага выкарыстоўваліся розныя сродкі, у тым ліку і матэрыяльнае заахвочванне ў выглядзе «ўпамінкаў» (падарункаў) хану і яго саноўнікам. Аднак зрабіць гэта ўдавалася не заўсёды.

У першай палове XVI ст. на паўднёвых землях дзяржавы стала наладжвацца сістэма сталай абароны ад татар. Яна прадугледжвала стварэнне ўмацаваных замкаў і размяшчэнне ў іх наёмных гарнізонаў. Яны не толькі давалі адпор качэўнікам, але і выведвалі час і напрамкі татарскіх набегаў. У выніку гэтыя набегі трацілі фактар раптоўнасці. Аднак найбольш сур'ёзную сілу ў процістаянні Крымскаму ханству стала адыгрываць казацтва. Казакі не толькі давалі адпор татарам, але і самі нападалі на падкантрольныя Крыму землі, помсцячы за ранейшыя набегі і прадухіляючы іх у далейшым. Меры, прынятыя для прадухілення татарскіх набегаў, прыносілі свае вынікі: з 20-х гадоў XVI ст. яны сталі радзейшымі, а з 30-х гадоў ужо не дасягалі тэрыторыі Беларусі.

**Пытанні і заданні**

1. Ахарактарызуйце палітычнае становішча ВКЛ у другой палове XV ст. 2. Чаму адносіны паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай у другой палове XV — першай палове XVI ст. складваліся варожа? 3. Складзіце храналагічную табліцу «Войны ВКЛ з Вялікім княствам Маскоўскім».



Правообладатель Народная асвета

| Дата | Вынікі вайны |
|---|---|
| | |

4. Як змянілася тэрыторыя ВКЛ у канцы XV — першай палове XVI ст. у выніку войнаў з Вялікім княствам Маскоўскім? Пры адказе выкарыстоўвайце карту. 5. Чаму перыяд ваеннага супрацьстаяння з Масквой у канцы XV — першай палове XVI ст. быў для ВКЛ няўдалым? 6. Як складваліся адносіны паміж ВКЛ і Залатой Ардой, ВКЛ і Крымскім ханствам? 7. Якія меры былі прыняты ВКЛ для абароны сваіх зямель ад набегаў крымскіх татар? Якія яны мелі вынікі?

## Гістарычная крыніца

### З «Хронікі Быхаўца»

Тае ж восені месяца жніўня 30 дня нечакана прыйшоў… султан Бітыс-Гірэй з шасцю тысячамі татараў і найперш з'явіўся пад горадам Слуцкам… Князь жа толькі з вельмі нешматлікаю сілаю ў горадзе зачыніўся і паслаў да караля ў Вільню паведаміць пра тое… Татары ж пайшлі ў загоны (набегі) на землі навакольныя, і ідучы ваявалі каля Клецка ды Нясвіжа, і спалілі горад Клецк … шмат месцаў ды сёлаў папалілі, і невымоўнае кровапраліцце хрысціянам учынілі, і з вялікім палонам і здабыткам сабраліся да Слуцка, і без усякае шкоды ўсе ў цэласці назад вярнуліся.

*Чаму нападзенне татар не сустрэла супраціўлення і яны «без усякае шкоды ўсе ў цэласці назад вярнуліся»?*

**!** **Гэта цікава.** У бітве пад Оршай, якая адбылася 8 верасня 1514 г., бліскучую перамогу атрымала войска Вялікага княства Літоўскага пад кіраўніцтвам Канстанціна Іванавіча Астрожскага (1460—1530). Гэта быў адзін з найвыдатнейшых ваяводаў у гісторыі Беларусі. Згодна з надпісам на надмагіллі, ён атрымаў 63 перамогі. Апроч іншага, Канстанцін Астрожскі займаў пасады кашталяна віленскага, ваяводы троцкага. Ён паходзіў са старажытнага магнацкага роду, што браў свой пачатак ад тураўскіх князёў. Быў правадыром праваслаўнай шляхты, якая, дзякуючы яго выключнаму аўтарытэту, дамаглася праўнай роўнасці са шляхтай каталіцкага веравызнання. Фундатар праваслаўных цэркваў і манастыроў.



Правообладатель Народная асвета

**Да ўрока «Наш край».** Якія знешнепалітычныя падзеі сярэдзіны XV — першай паловы XVI ст. адбыліся ў вашай мясцовасці? У якіх падзеях прынялі ўдзел жыхары мясцовасці, у якой вы жывяце?

## § 18. Развіццё феадальнага грамадства

**Успомніце:**

*1. Чаму ўдзельныя князі, страціўшы дзяржаўную ўладу, заставаліся буйнымі землеўладальнікамі ў ВКЛ? 2. Чыімі васаламі станавіліся ўдзельныя князі? 3. Якія правы на зямельныя ўладанні атрымалі феадалы каталіцкага веравызнання паводле прывілея 1387 г.?*

**Саслоўі ў Вялікім княстве Літоўскім.** У XV—XVI стст. на тэрыторыі Беларусі працягвалі панаваць феадальныя адносіны. Грамадства падзялялася на **саслоўі**, або *станы,* — групы людзей у грамадстве, якія валодаюць правамі і абавязкамі, што замацаваны законам і перадаюцца па спадчыне. Найбольш актыўна складванне саслоўяў у Вялікім княстве Літоўскім праходзіла з канца XIV ст.

Пануючым саслоўем з'яўляліся **феадалы**. Ужо ў 1387 г. феадалы каталіцкага веравызнання атрымалі прывілей, які юрыдычна замацоўваў іх маёмасныя і асабістыя правы. Да сярэдзіны XV ст. гэтыя правы былі замацаваны і за праваслаўнымі феадаламі.

Да другой паловы XVI ст. феадальнае саслоўе не было аднародным, у ім выдзяляліся саслоўныя групы. На вяршыні сацыяльнай піраміды стаялі **князі** — радавая тытулаваная знаць, якая вяла сваё паходжанне ад правячых дынастый — Рурыкавічаў ці Гедзімінавічаў. У лацінамоўных дакументах яны называліся герцагамі. Такія феадалы валодалі зямлёй па праве нараджэння і па так званым *«вотчынным» праве*, гэта значыць маглі цалкам ёю распараджацца — прадаваць, дарыць, перадаваць у спадчыну і іншым асобам, у тым ліку васалам. Іх уладанні першапачаткова ўяўлялі як быццам дзяржаву ў дзяржаве. Князі мелі свае войска, якое выходзіла на вайну пад ўласнымі сцягамі, сваю раду. З асяроддзя князёў паходзіў кіраўнік дзяржавы — вялікі князь. Калі ён сумяшчаў сваю пасаду з пасадай польскага караля, яго маглі неафіцыйна называць каралём і ў ВКЛ.



Правообладатель Народная асвета

Трохі ніжэйшую прыступку займалі **паны**, якія у лацінамоўных дакументах называліся баронамі. Паны таксама належалі да тытулаванай знаці, валодалі зямлёй па вотчынным праве і маглі перадаваць яе сваім васалам. Аднак свой тытул яны атрымлівалі не па праве нараджэння, а за пэўныя заслугі перад вялікім князем, напрыклад, займаючы значныя дзяржаўныя пасады. Паны паходзілі з асяроддзя найбольш давераных асоб вялікага князя. На працягу XV—XVI стст. прадстаўнікі вядучых панскіх родаў здолелі значна павялічыць свае зямельныя ўладанні і адцясніць на задні план прадстаўнікоў старых княжацкіх родаў. У XVI ст. найбольш уплывовыя паны набывалі прэстыжныя тытулы князёў ці графаў за мяжой, у германскага імператара. Буйныя землеўладальнікі, прадстаўнікі тытулаванай знаці (князі і паны) называліся таксама **магнатамі**.

Прадстаўнікі ніжэйшага пласта феадалаў павінны былі несці вайсковую службу за валоданне зямлёй. Яна давалася ім да смерці («да жывата») ці пакуль гаспадар меў патрэбу ў службе канкрэтнага феадала («да волі»). Такія драбнейшыя феадалы, якія не мелі сваіх васалаў, спачатку называліся *баярамі*, а пасля — **шляхтай** або **рыцарствам**. Рыцарствам таксама называлася ўсё феадальнае саслоўе, якое адзінае лічылася прыдатным для выканання вайсковай службы.

У XV—XVI стст. актыўна праходзіла фарміраванне мяшчанскага саслоўя. **Мяшчане** атрымалі сваю назву ад агульнаславянскага слова «места» — горад. Мяшчанамі спачатку называлі ўсіх гарадскіх жыхароў, якія былі вольныя і мелі рамесніцкія ці гандлёвыя спецыяльнасці. Калі гарады пачалі набываць самакіраванне, то мяшчанамі сталі лічыцца тыя асобы, якія падначальваліся органам гарадскога самакіравання і ўваходзілі ў гарадскую абшчыну.



Баярын ВКЛ. XVI ст.



Правообладатель Народная асвета

Найбольш шматлікім было сялянскае саслоўе. Аднак **сяляне** былі самай бяспраўнай групай насельніцтва і цалкам залежалі ад феадалаў.

**Землеўладанне і землекарыстанне.** Галоўным багаццем у сярэднія вякі з'яўлялася зямля. На працягу XIV—XV стст. амаль поўнасцю завяршыўся яе пераход у рукі феадалаў. Найбуйнейшым уласнікам зямлі была дзяржава ў асобе вялікага князя. Значная частка зямлі знаходзілася ў спадчынным уладанні князёў, паноў і шляхты.




Становішча феадала ў грамадстве вызначалася не толькі знатнасцю і старажытнасцю роду, але і памерамі зямельных уладанняў, дзяржаўнай пасадай, якую ён займаў. Унутры аднаго і таго ж княскага ці панскага роду адны асобы маглі мець шмат сялян і быць буйнымі феадаламі, іншыя — сярэднімі і нават дробнымі. Землі належалі таксама епіскапствам, манастырам і цэрквам. Але царкоўнае землеўладанне ў XIV—XV стст. не атрымала такога развіцця, як свецкае.

У адрозненне ад феадалаў, якія валодалі зямлёй, сяляне такое права паступова гублялі і ператвараліся ў землекарыстальнікаў. Сяляне вялі сваю гаспадарку (дым) сіламі сваёй сям'і і ўласнымі прыладамі працы. Сялянскія сем'і ў той час былі вялікімі. Адных толькі працаздольных асоб налічвалася ў іх 5—7 і нават больш чалавек.

Феадалы, атрымаўшы ва ўласнасць вялікія зямельныя ўладанні, адчувалі патрэбу ў сялянах, якія б у іх працавалі. Для гэтага яны імкнуліся «замацаваць» сялян за зямлёй, забараніць ім пераход да іншых уладальнікаў. Такое замацаванне атрымала назву **прыгон**. Найбольш актыўна запрыгоньванне сялян праходзіла ў XV—XVI стст., у часы фарміравання фальваркова-паншчыннай сістэмы.



Народная асвета
Правообладатель Народная асвета

Па ступені феадальнай залежнасці сяляне дзяліліся на «пахожых» людзей і «непахожых». *«Пахожым»* дазваляўся пераход ад аднаго пана да другога. Яны плацілі даніну землеўласніку прадуктамі і грашыма за надзелы зямлі, якімі карысталіся. *«Непахожыя»* былі пазбаўлены права пераходу да другога пана. Поўнай уласнасцю феадалаў была *«чэлядзь нявольная»*, якая жыла пры іх дварах.

**Павіннасці сялян.** Сяляне знаходзіліся ў залежнасці ад феадалаў. Па сваіх павіннасцях сяляне падзяляліся на даннікаў, цяглых, чыншавых і слуг. Сялян, у якіх асноўным відам павіннасцей была даніна, называлі *даннікамі*. Землеўласнік перадаваў вольнаму селяніну ў карыстанне зямлю. За гэта селянін аддаваў феадалу *даніну* прадуктамі: зернем, мясам, мёдам, птушкай і г. д. У XV ст. быў уведзены грашовы аброк — **чынш**. *Чыншавыя* сяляне плацілі землеўласнікам чынш за карыстанне зямлёй.

*Цяглыя* сяляне адбывалі *паншчыну*. Яны працавалі на зямлі феадала некалькі дзён у тыдзень са сваёй рабочай жывёлай (валом ці канём) і сваімі прыладамі. Паншчына вядома на беларускіх землях з XIV ст., аднак шырока стала распаўсюджвацца з сярэдзіны XV — XVI ст. Попыт на збожжа ў Заходняй Еўропе прывёў да з'яўлення ў гэты час **фальварка** — феадальнага двара з будынкамі і зямельнымі ўгоддзямі, якія апрацоўваліся залежнымі сялянамі. Атрыманая прадукцыя ішла на продаж, у тым ліку за мяжу, што прыносіла феадалам вялікія прыбыткі. Такім чынам адбывалася складванне **фальваркова-паншчыннай сістэмы**.



Сяляне. *Мініяцюра XV ст.*

Сярод іншых сялян выдзялялася група *сялян-слуг*. Яны выконвалі розныя работы пры панскім двары: былі конюхамі, агароднікамі, садоў-



Правообладатель Народная асвета

нікамі, рамеснікамі і г. д. Частка такіх сялян несла вайсковую службу. Яны называліся служылымі ці панцырнымі баярамі і маглі, у рэдкіх выпадках, папоўніць рады шляхты.

### Групы сялян паводле іх павіннасцей




**Этапы запрыгоньвання сялян.** У 1447 г. вялікі літоўскі князь Казімір выдаў прывілей, які паклаў пачатак афармленню запрыгоньвання сялян. Феадалы атрымалі права на суд над залежным ад іх насельніцтвам, аднак ім забаранялася прымаць чужых беглых сялян. Судзебнік Казіміра, які быў выдадзены ў 1468 г., садзейнічаў далейшаму запрыгоньванню сялян. У ім прадугледжвалася пакаранне за дапамогу пры ўцёках залежных ад феадала людзей.

Асноўным прынцыпам пры запрыгоньванні феадаламі сялян была «даўнасць», гэта значыць працяглы тэрмін іх пражывання на адным месцы. Выкарыстанне гэтага прынцыпу мела месца ўжо ў сярэдзіне XV ст. У Статуце ВКЛ 1529 г. уводзіўся дзесяцігадовы тэрмін даўнасці. З гэтага часу селянін, які пражыў у свайго пана больш за дзесяць гадоў, лічыўся яго прыгонным. Падобны ж тэрмін даўнасці пацвярджаўся і Статутам 1566 г.

Феадалы імкнуліся замацаваць за сабой сялян і іншымі сродкамі. Яны ўводзілі для сялян спецыяльныя выплаты за права пераходу, прадастаўлялі сялянам пазыкі, якія тыя не маглі вярнуць, патрабавалі знайсці на сваё месца іншага селяніна і г. д. Калі ж селянін спрабаваў пакінуць свайго феадала без выканання гэтых умоў, яго лавілі і вярталі ўжо як прыгоннага. Гэта прыводзіла да таго, што колькасць «пахожых» сялян пастаянна скарачалася.

### Пытанні і заданні

1. Якія саслоўі склаліся ў ВКЛ у XV—XVI стст.? 2. Як у ВКЛ фарміравалася шляхецкае саслоў’е? 2. Чаму феадалы імкнуліся да валодання зямлёй? 3. Чым



Правообладатель Народная асвета

вызначалася становішча феадала ў грамадстве? 4. На якія групы падзяляліся сяляне: а) па ступені феадальнай залежнасці; б) па сваіх павіннасцях? 5. Складзіце табліцу «Этапы запрыгоньвання сялян».

| Дата | Заканадаўчы акт | Змены ў становішчы сялян |
|---|---|---|
| | | |

6. Што ўяўляла сабой гаспадарка селяніна? Якімі шляхамі сяляне гублялі сваю свабоду? 7. Што такое фальварак? Якія прычыны прывялі да з'яўлення фальваркаў?

! **Гэта цікава.** Паводле попісу 1529 г., на Беларусі былі 23 магнаты, якія мелі больш за 1000 сялянскіх дымоў. Яны трымалі ў сваіх руках 1/6 усіх уладанняў феадалаў. З іх 11 былі літоўскага паходжання, 10 — беларускага, 1 — польскага, 1 — рускага. Паводле попісу 1567 г., магнатаў, якія валодалі больш як 1000 сялянскіх дымоў, было на беларускіх землях 29. Яны складалі менш як 1 % усіх феадалаў, валодалі 42,5 % усіх сялянскіх гаспадарак. З іх 13 былі літоўскага паходжання, 9 — беларускага, 5 — украінскага, 2 — рускага.

## § 19. Развіццё гарадоў

**Успомніце:**

*1. Якія былі асноўныя прычыны ўзнікнення гарадоў у сярэднія вякі ў краінах Заходняй Еўропы? 2. Якія функцыі выконвалі сярэдневяковыя гарады ў Заходняй Еўропе? 3. Якія беларускія гарады з'яўляюцца найбольш старажытнымі?*

**Насельніцтва гарадоў.** У XV—XVI стст. у Беларусі пачынаецца новы этап у развіцці гарадоў. Пасля Грунвальдскай бітвы ВКЛ больш шчыльна наладжвае сувязі з еўрапейскімі краінамі. Развіваюцца гандлёвыя сувязі. У заходніх краінах узрастае попыт на збожжа, лес, лён і іншыя сельскагаспадарчыя прадукты, якія традыцыйна вырошчваліся на беларускіх землях. Таму для беларускіх феадалаў замежны гандаль робіцца надзвычай выгадным.



Правообладатель Народная асвета




Гарады і мястэчкі на Беларусі ў XVI ст.

Пашыраецца сувязь з рынкам і сялянскіх гаспадарак. Усё гэта прыводзіць да росту колькасці рынкаў — **таргоў**, дзе сяляне і феадалы маглі прадаць сваю прадукцыю. Вакол гэтых таргоў у XV ст. пачынаюць узнікаць новыя гарады.

Насельніцтва гарадоў магло фарміравацца за кошт сялян тых вёсак, на месцы якіх узнікалі гарады. Але часцей уладальнік горада быў зацікаўлены ў перасяленні ў новы горад рамеснікаў і гандляроў. Для гэтага па іншых гарадах дзяржавы і нават замежжа ездзілі спецыяльныя людзі, якія запрашалі сюды добрых спецыялістаў. Каб прывабіць іх, уладальнікі горада часова маглі вызваліць новых



Правообладатель Народная асвета

жыхароў ад падаткаў. Такое вызваленне ад падаткаў атрымала назву *«слабоды»*.

Пераважнай часткай насельніцтва горада былі так званыя «чорныя людзі». Гэта шматлікія рамеснікі, а таксама дробныя і сярэднія гандляры. Жыхары гарадоў доўгі час не парывалі сувязей з сельскай гаспадаркай. Карэнных жыхароў гарадоў, якія не былі залежнымі ад феадалаў, называлі **мяшчанамі**, гэта значыць жыхарамі «места» — горада.

Прывілеяванымі жыхарамі горада былі феадалы і багатыя купцы. Феадалы валодалі дамамі і дварамі ў горадзе, землямі і лясамі за горадам. Багатыя купцы вялі гандаль з іншымі гарадамі. Разам з феадаламі купцы ўдзельнічалі ў кіраванні горадам. Асобнае становішча сярод гарадскога насельніцтва займала духавенства (епіскапы, святары, манахі). Яны складалі ўплывовую групу грамадства.

Буйным гарадам працягваў заставацца Полацк. Але роля веча ў жыцці горада паступова змяншалася. Вялікія князі літоўскія ставілі ў гарадах сваіх намеснікаў. Да велікакняжацкіх намеснікаў пераходзіла кіраванне гарадамі, нават такімі вялікімі, як Полацк.

**Гарады і замкі на дзядзінцах.** Да XV ст. цэнтрам кожнага беларускага горада з'яўляўся ўмацаваны *дзядзінец*. Тут жыў князь і яго адміністрацыя. Ля сцен дзядзінца размяшчаўся рынак, сюды сцякаліся ўсе ці найбольш значныя вуліцы горада. Асноўная частка гараджан — рамеснікі і гандляры — пражывала ў неўмацаваным *пасадзе*. Раз-пораз частка дзядзінца таксама магла абносіцца ўмацаваннямі і ператваралася ў так званы вакольны горад. Але на месцы былога дзядзінца і вакольнага горада нярэдка будаваліся новыя, большыя па памерах умацаваныя цэнтры — *замкі*.



Гродзенскі замак у XV—XVI стст. *Рэканструкцыя*

У XV ст. назіраюцца змены ў планіроўцы гарадоў. Цэнтрам горада становіцца не замак, размешчаны на месцы дзядзінца, а гандлёвая плошча з ратушай, вакол якой складваліся новыя пасады.



Правообладатель Народная асвета

Асноўныя вуліцы горада з’яўляліся працягам дарог, якія звязвалі горад з наваколлем.

У XV — першай палове XVI ст. на беларускіх землях узнікаюць дробныя паселішчы гарадскога тыпу — **мястэчкі**. У мястэчкі ператвараліся вялікія сёлы і вёскі, напрыклад Моталь, Дзівін, Станькава і інш. Некаторыя мястэчкі ўзнікалі побач з замкамі ці панскімі дварамі або нават на новым месцы. Спачатку колькасць рамеснікаў у мястэчках была нязначнай. Іх галоўнай задачай было забеспячэнне дзейнасці таргоў, дзе сяляне навакольных вёсак маглі прадаць сваю прадукцыю.

Такім чынам, на тэрыторыі Беларусі колькасць гарадоў, улічваючы мястэчкі, у познім сярэдневякоўі значна павялічылася.

**Магдэбургскае права.** Дзяржава і феадалы былі зацікаўлены ў развіцці гарадоў. Каб прыцягнуць сюды новых жыхароў, у тым ліку добрых спецыялістаў з-за мяжы, яны надавалі гарадам прывілеі. Найбольш жаданым для любога горада быў прывілей на самакіраванне.

Самымі значнымі гарадамі ў XIV—XV стст. у Беларусі былі Брэст, Полацк, Слуцк, Гродна, Мінск, Навагрудак. Менавіта гэтыя



Навагрудак у пачатку XVI ст.



Правообладатель Народная асвета

гарады першымі атрымалі права на самакіраванне. На беларускіх землях найбольш шырока было распаўсюджана самакіраванне па ўзоры нямецкага горада Магдэбурга. Яно называлася магдэбургскім правам.



Герб Полацка

Паводле **магдэбургскага права** гараджане вызваляліся ад феадальнай залежнасці і павіннасцей. Ім гарантаваліся свабодныя заняткі рамяством, гандлем, земляробствам. Гараджанам дазвалялася выбіраць свой орган гарадской улады — **магістрат**, мець герб, суд, ствараць рамесніцкія аб'яднанні.

Магістрат складаўся з дзвюх частак — лавы і рады. *Лава*, якую ўзначальваў **войт**, складалася з лаўнікаў — засядацеляў. Яна судзіла мяшчан па крымінальных справах. *Рада*, на чале якой стаялі *бурмістры*, займалася судом па грамадзянскіх справах, збіраннем падаткаў, добраўпарадкаваннем горада, кіравала рамеснікамі і гандлярамі. Члены рады — райцы, ці радцы, выбіраліся мяшчанамі з найбольш паважаных жыхароў горада.

**Наданне гарадам ВКЛ магдэбургскага права**

1390 г. – Брэст
1496 г. – Гродна
1498 г. – Полацк
1499 г. – Мінск
1503 г. – Камянец
Да 1506 г. – Ваўкавыск
1511 г. – Навагрудак
1531 г. – Слонім

Першым з гарадоў Вялікага княства Літоўскага права на самакіраванне атрымала Вільня ў *1387 г.*

Грамату на магдэбургскае права даравала гарадам вярхоўная ўлада краіны або ўладальнік горада. Для магістрата і іншых органаў самакіравання ў гарадах узводзіліся асобныя будынкі — *ратушы*. У ратушы знаходзіліся канцылярыя, гарадская скарбніца, або казна, архіў; граматы з прывілеямі, якія даваліся гораду. Абапіраючыся на магдэбургскае права, гараджане вялі актыўную барацьбу з самавольствам феадалаў.



Правообладатель Народная асвета

**Гістарычная роля гарадоў.** Узнікненне і развіццё гарадоў адыграла важную ролю ў гісторыі. Іх з'яўленне — вынік аддзялення рамяства ад сельскай гаспадаркі.

Разам з тым гарады станавіліся цэнтрамі асветы, мастацтва, навукі. Пасля прыняцця хрысціянства ў гарадах разгарнулася будаўніцтва цэркваў, сабораў, манастыроў. Некаторыя гарады сталі рэзідэнцыямі епіскапаў. У іх з'явіліся буйныя кафедральныя саборы, духоўныя навучальныя ўстановы. Так гарады ператвараліся ў рэлігійныя цэнтры.

У сярэдні вякі гарады мелі ўмацаванні, а значыць, яны ў час войнаў станавіліся важнымі абарончымі пунктамі. Пасля ўвядзення тэрытарыяльнага падзелу гарады станавіліся цэнтрамі ваяводстваў, паветаў, валасцей.

### Пытанні і заданні

1. Чаму ў XV—XVI стст. у Беларусі пачынаюць узнікаць новыя гарады? Якімі шляхамі ўзнікалі новыя гарады ў Беларусі? 2. Назавіце асноўныя групы насельніцтва гарадоў. Як фарміравалася насельніцтва гарадоў? 3*. Апішыце, як выглядалі беларускія гарады. Якія змены ў планіроўцы гарадоў адбыліся ў XV ст.? 5. Якія паселішчы называюць мястэчкамі? Калі яны пачалі ўзнікаць на тэрыторыі Беларусі? 6. Якія правы атрымлівалі жыхары горада, якому надавалася магдэбургскае права? 7. Дакажыце, што магдэбургскае права было выгадна не толькі гараджанам, але і дзяржаве. 8. Якія органы кіравання існавалі ў гарадах, што атрымалі магдэбургскае права? 9. Якую ролю выконвалі гарады ў сярэдневяковым грамадстве?

### Гістарычная крыніца

**З прывілея гораду Мінску (1499 г.)**

…мы, Аляксандр, з Божае ласкі вялікі князь літоўскі, рускі, жамойцкі і іншых (земляў) пан і дзедзіч, чынім да ведама гэтым нашым лістом, …што, жадаючы памножыць усеагульнае дабро і палепшыць становішча нашага горада Менска, каб нашыя людзі, якія там жывуць, дзякуючаму добраму і справядліваму ладу былі заахвочаны, гэты наш горад Менск з права літоўскага і рускага, якое спачатку там было ўстаноўлена, на права нямецкае, так званае магдэбургскае, пераводзім на вечныя часы. Пастанаўляем і даём ім магчымасць паводле гэтага магдэбургскага права чыніць поўнае кіраван-



Правообладатель Народная асвета

не і ўсе законы, ліквідуючы ў гэтым горадзе ўсе ранейшыя правы, законы і звычаі, якія магдэбургскае права стрымліваюць, уціскаюць або яму перашкаджаюць…

Жадаем таксама, каб усе жыхары згаданага горада Менска карысталіся гэтым правам магдэбургскім і ў кожнай справе ва ўсім яго прытрымліваліся. Усіх тых людзей аддаляем ад гарадскога і баярскага права і навечна вызваляем іх ад суда і ўлады ўсіх ваяводаў, паноў і старостаў, намеснікаў, суддзяў і ўсіх начальнікаў усяго Вялікага княства Літоўскага такім чынам, што калі па якой-небудзь справе (мяняне) будуць выкліканы (апошнімі), яны маюць права не з'яўляцца і не адказваць ім. А калі хто ў чым будзе вінаваты, павінен па справядлівасці стаць перад войтам, бурмістрамі і радцамі. Калі ж войт або бурмістры вырашаць несправядліва, тады па той справе павінны будуць выкліканы да саміх нас і нам вырашаць, каго якім правам судзіць…

*Калі Мінск атрымаў магдэбургскае права? Хто даравў Мінску магдэбургскае права? З якой мэтай? Якія змены ў кіраванні горадам адбыліся паводле магдэбургскага права? Якія правы атрымалі гараджане?*

**!** **Гэта цікава.** Магілёўская хроніка Трафіма Сурты і Юрыя Трубніцкага паведамляе: «У год 1526. ...Не ўступае горад Магілёў, з ласкі Маткі Божай, Кіеву... гэты горад Магілёў багаты на людзей вучоных, набожных, гандлёвых і на розныя рамёствы багаты, цэрквамі ўпрыгожаны, цэрквы скарбамі, працамі і штодзённым квітнеючым грэка-рускім набажэнствам аздоблены...
Жыгімонт Аўгуст, які ў гэты час шчасліва валадарыў, бачачы, што, як пчолы, збіраюцца людзі да Магілёва, і каб справядлівасць і слава Божыя шырыліся, прыгожа ўмацаваў горад правамі і вольнасцямі ўзнагародзіў».

**Да ўрока «Наш край».** Якія гарады існавалі ў вашай мясцовасці ў сярэдзіне XV — першай палове XVI ст.? Якія з іх атрымалі магдэбургскае права?



Правообладатель Народная асвета

# § 20. Гаспадарчыя заняткі гараджан

**Успомніце:**

*1. З якой мэтай утвараліся цэхі ў сярэдневяковых гарадах Заходняй Еўропы? 2. Якія рамёствы былі распаўсюджаны ў гарадах ВКЛ?*

**Узрастанне значэння рамесніцкіх заняткаў.** У XIV—XV стст. у жыцці беларускіх гарадоў узрастае значэнне рамяства. Яшчэ раней у гарадах працавалі кавалі, ювеліры, ганчары, шаўцы, цесляры, гарбары. Аб далейшым развіцці рамесніцкай вытворчасці сведчыць выдзяленне больш вузкіх спецыяльнасцей. Так, з прафесіі кавалёў вылучыліся слесары, збройнікі, мечнікі і г. д. Сярод шаўцоў існавалі майстры па пашыве розных гатункаў абутку, сярод гарбароў — спецыялісты па вырабе розных гатункаў скур. Павялічвалася колькасць прафесій і ў асобных гарадах.

Рамеснікі некаторых гарадоў спецыялізаваліся на вырабе канкрэтнай прадукцыі. Так, у Гродне шырока былі распаўсюджаны прафесіі, звязаныя з будаўніцтвам, у Віцебску і Полацку — з абслугоўваннем портаў, у Магілёве і Слуцку — з апрацоўкай металаў і скуры.

У XV—XVI стст. павялічваецца сувязь гарадскіх рамеснікаў з рынкам. Разам з тым існавалі цэлыя спецыяльнасці, якія працавалі пераважна на заказ ці на абслугоўванне патрэб феадальных двароў — карэтнікі, печнікі, вазніцы, пушкары, дойліды, муляры і г. д.



Замкі XVI ст.

У рамесніцкіх майстэрнях вырабам прадукцыі займаліся пераважна гаспадар і члены яго сям'і. З XV ст. у асобных гарадах пачынаюць з'яўляцца рамесніцкія аб'яднанні — **цэхі**, або брацтвы. У цэхі ўваходзілі майстры адной ці некалькіх блізкіх спецыяльнасцей. *Майстры* мелі памочнікаў — *падмай-*



Правообладатель Народная асвета

*страў*, або чаляднікаў, а таксама *вучняў*. Для таго каб стаць майстрам, вучань павінен быў прайсці складаны шлях навучання, стаць падмайстрам, папрацаваць нейкі час у майстра і даказаць сваю кваліфікацыю, вырабіўшы ўзорны прадмет — «*штуку*». Цэхі ўзначальваліся кіраўнікамі — *цэхмістрамі*, якія выбіраліся з асяроддзя майстроў. Цэхі рэгулявалі рамесніцкую вытворчасць у горадзе, не дапускалі на рынак няцэхавых майстроў — «партачоў», сачылі за якасцю выпускаемай прадукцыі.



Гарбар. *Мініяцюра XVI ст.*

**Гандаль.** Нязменным спадарожнікам рамяства з'яўляўся гандаль. З развіццём гарадоў ён мяняў сваю форму: ажыццяўляўся пераход ад звычайнага абмену да продажу. Беларускія гарады вялі як унутраны, так і знешні гандаль. Выгаднае геаграфічнае становішча Вялікага княства Літоўскага дазваляла яму актыўна гандляваць з рознымі краінамі. Яно падтрымлівала гандлёвыя сувязі з Польшчай, Чэхіяй, Венгрыяй, украінскімі землямі, Маскоўскай дзяржавай.

На Захадзе беларускія купцы набывалі рамесніцкія тавары — металічныя вырабы, тканіны, упрыгожанні, віны, экзатычныя прадукты — садавіну, прыправы. Вельмі важнае значэнне меў гандаль соллю і селядцамі. Узамен вывозіліся драўніна і вырабы з яе, збожжа, воск, футра, лён, пянька.

З Украіны на беларускія землі завозіліся ўсходнія тавары — шоўк, турэцкія дываны і г. д. У Маскоўскай дзяржаве закупляліся футры каштоўных звяроў і скуры. Частка набытага тавара перапрадавалася на Захад. У рускія ж гарады беларускія купцы прадавалі свае і заходнееўрапейскія тавары — тканіны, металічныя і скураныя вырабы, паперу, прыправы.

На беларускіх землях існавала даволі густая сетка сухапутных дарог. Аднак найбольш актыўны гандаль вёўся па буйных рэках —



Правообладатель Народная асвета



Купцы ВКЛ. *Малюнак XVI ст.*

Дняпры, Дзвіне, Нёмане і яго прытоках, Заходнім Бугу, Прыпяці. Летам па рэках плылі на плытах, чаўнах і караблях. Водны гандаль меў такое вялікае значэнне, што карабель быў нават адлюстраваны на гербе Полацка. Зімой рэкі замярзалі і па лёдзе можна было хутка і зручна рухацца на санях.

Па Дзвіне жыхары беларускіх зямель гандлявалі з Рыгай, па Заходнім Бугу — з польскімі гарадамі ў вусці Віслы. Аднак самым выгадным лічыўся гандаль па Нёмане і яго прытоках — Віліі і Нёманскай Бярэзіне. Гэтыя рэкі звязвалі Беларусь з Прусіяй, дзе цэны на прадукты сельскай гаспадаркі былі вышэйшыя, а прамысловыя тавары, якія набывалі беларускія купцы, больш разнастайныя.

**Знешні гандаль**




Пашыраўся гандаль паміж горадам і вёскай. Узрастала патрэба сельскіх жыхароў, асабліва феадалаў, у вырабах гарадскіх майстроў, а гарадоў, насельніцтва якіх павялічвалася, — у пра-



Правообладатель Народная асвета

дуктах харчавання. Пашырэнню гандлёвых сувязей паміж горадам і вёскай спрыяла таксама распаўсюджанне грашовай рэнты. У выніку сяляне, нават калі яны маглі абысціся без «гарадскіх» тавараў, мусілі прадаваць сваю прадукцыю, каб выплаціць чынш свайму пану.



Карчма ў ВКЛ. *Гравюра XVI ст.*

Гарадскі гандаль вёўся ў некалькіх формах. Кожны дзень пакупнікі маглі набыць тавары ў *крамах*, або лаўках, дзе гандляры і рамеснікі прадавалі свае вырабы, а часам і набытыя ў сялян прадукты. Адзін ці некалькі разоў на тыдзень праводзіліся *таргі*, куды сяляне навакольных вёсак звозілі свае тавары. Акрамя таго, большасць гарадоў і мястэчак мелі **кірмашы**, якія праводзіліся адзін ці некалькі разоў на год. На кірмашы з'язджаліся купцы з далёкіх краёў і з-за мяжы. Некаторыя кірмашы набывалі агульнадзяржаўнае значэнне.

У XV—XVI стст. вялікае значэнне ў гаспадарчай дзейнасці гарадоў, асабліва дробных, мела ўтрыманне *корчмаў*. Корчмы давалі праезджым гандлярам і проста падарожнікам начлег, тут можна было паесці і выпіць, направіць воз ці падкаваць каня. Да канца XVI ст. утрыманне корчмаў з'яўлялася асноўным заняткам жыхароў большасці беларускіх мястэчак.

### Пытанні і заданні

1. Якія змены адбыліся ў дзейнасці рамеснікаў у XIV—XV стст.? 2. Як вы лічыце, чаму ў XIV—XV стст. назіралася спецыялізацыя рамеснай вытворчасці асобных беларускіх гарадоў? Якія віды рамяства былі распаўсюджаны ў беларускіх гарадах у XIV—XV стст.? 3. Як геаграфічнае становішча ВКЛ уплывала на развіццё гандлю? 4. З якімі краінамі гандлявала Вялікае княства Літоўскае? Пакажыце гэтыя краіны на карце. 5. Назавіце найбольш зручныя гандлёвыя шляхі, якія звязвалі ВКЛ з іншымі краінамі. Знайдзіце іх на карце. 6*. Уявіце сябе вучнем майстра і апішыце адзін працоўны дзень у рамеснай майстэрні.



Правообладатель Народная асвета

**Гістарычная крыніца**

**З прывілейнай граматы Полацку на магдэбургскае права (1498 г.)**

Дазваляем гэтаму вышэйназванаму гораду тры разы на год ладзіць кірмашы для яго карысці… Чужаземныя купцы павінны будуць купляць [у полацкіх купцоў] воск — адным кавалкам… сабалі, куніцы і тхары — па сорак штук; вавёрку, гарнастая, ласку і норку — дзвесце пяцьдзесят; попел і смалу… і ўсяго гэтага не маюць права яны купляць ні ў лясах, ні ў барах, ні ў сёлах, а толькі ў горадзе [Полацку].

Чужаземныя купцы… тканіны могуць прадаваць паставам; соль — лаштам; перац, імбір, міндаль і іншыя звычайныя прыправы — каменем; шафран, мускат, гваздзіку… іншыя дарагія прыправы — фунтам; сякеры, нажы і іншыя падобныя рэчы — тахрам, або тузінам; жалеза, волава, медзь, латунь і іншыя — цэнтнерам; фінікі, разынкі — кошыкам; розныя віны, нямецкае піва і іншыя замежныя напоі — цэлаю бочкаю.

*Якія тавары маглі купляць у Полацку на кірмашы чужаземныя купцы? Якія тавары ім дазвалялася прадаваць?*

**Да ўрока «Наш край».** З дапамогай гістарычнай карты высветліце, якія гандлёвыя шляхі праходзілі праз вашу мясцовасць. Даведайцеся, што выраблялася ў гарадах вашай мясцовасці. Якія тавары вывозіліся і куды? У якіх формах ажыццяўляўся гандаль у вашай мясцовасці?

## § 21. Утварэнне беларускай народнасці

**Успомніце:**

*1. Якія плямёны пражывалі на тэрыторыі Беларусі да з’яўлення славян?*
*2. Калі пачалася славянская каланізацыя беларускіх зямель?*

**Асаблівасці фарміравання беларускага этнасу.** Слова **«этнас»** грэчаскага паходжання і ў перакладзе на беларускую мову азначае «народ», «народнасць».

Ва ўсходніх славян фарміраванне народнасцей — беларускай, рускай, украінскай — пачалося пры пераходзе ад першабытнасці да



Правообладатель Народная асвета

феадалізму і працягвалася ўсё сярэдневякоўе. **Народнасць** як гістарычная супольнасць людзей мае свае прыкметы.




Важны этап фарміравання этнічнага складу насельніцтва Беларусі быў звязаны з узнікненнем і існаваннем Вялікага княства Літоўскага. На працягу прыкладна 150 гадоў, з сярэдзіны XIII і да пачатку XV ст., складваецца тэрыторыя Вялікага княства Літоўскага — дзяржавы многіх народаў і рэлігій. У рамках існавання гэтай дзяржавы славянская каланізацыя працягвалася, у тым ліку і на землях этнічнай Літвы. У выніку ўзаемадзеяння не толькі балцкае насельніцтва пераймала славянскую мову і культуру, але і славяне адчувалі на сабе балцкі ўплыў. Аднак афіцыйны статус старабеларускай мовы ставіў яе ў больш выгаднае становішча. Ёй карысталіся не толькі сяляне і мяшчане, але і шляхта, паны і князі, у тым ліку літоўскага паходжання. На ёй складаліся дзяржаўныя дакументы, вялася перапіска, выдаваліся творы мастацтва. У выніку старажытнабеларуская культура атрымала ў ВКЛ спрыяльныя ўмовы для развіцця, што садзейнічала фарміраванню беларускай народнасці.

**З'яўленне старабеларускай мовы.** Паступова ў мове насельніцтва заходніх зямель Русі сталі замацоўвацца агульныя рысы. Аб гэтым сведчаць помнікі пісьменнасці XIV—XV стст. Іх змест захаваў прыкметы старабеларускай гутарковай мовы.

Старабеларуская мова фарміравалася на аснове ўсходнеславянскай мовы пры пэўным уплыве польскай і літоўскай моў. Важнай адзнакай тагачаснай мовы было змяненне гука [д] пры яго памякчэнні на [дз'] («дзед» замест «дед»). Не менш распаўсюджаным быў і пераход цвёрдага [т] на мяккае [ц'] («цень» замест «тень»). Першая з'ява атрымала назву «дзекання», а другая «цекання». Асаблівасцю мовы было таксама «аканне» (нага, галава, карова).



Правообладатель Народная асвета

Замацаванне з другой паловы XIV ст. старабеларускай мовы ў якасці мовы дзяржаўных дакументаў і заканадаўства садзейнічала ўзбагачэнню яе новымі тэрмінамі і далейшаму развіццю.

**Адметныя рысы беларусаў і іх саманазвы.** Гэтыя рысы фарміраваліся гістарычна на працягу многіх стагоддзяў.

Беларус — гэта перш за ўсё заўзяты працаўнік. Спрадвеку прывык ён жыць сваёй працай і спадзявацца толькі на яе. Паўсядзённыя клопаты рабілі яго руплівым гаспадаром. Але цяжкая праца не заўсёды дазваляла зводзіць канцы з канцамі. Жыццё рабіла беларуса надзвычай ашчадным. Лепш не даесці, а прыдбаць нешта на «чорны» дзень.

Шчасце беларус уяўляў сабе не ў гультайстве, не столькі ў матэрыяльным багацці, якога ў яго заўсёды не хапала, колькі ў свабоднай працы на роднай зямлі. Шчаслівым лічыўся чалавек, у якога былі працавітыя дзеці, парадак у сям'і, згода з суседзямі і г. д.

Хлеб, які даставаўся нялёгка, шанавалі, як сваё жыццё. Здаралася, пасля ежы зграбуць яго крошкі ў жменю і з'ядуць. І акраец бохана, што застаецца, асцярожна, як найвялікшую каштоўнасць, пакладуць на стол (пад абраз) і накрыюць чысцюткім белым ручніком.



Уборы жыхароў ВКЛ. XVI ст.



Правообладатель Народная асвета

З даўніх часоў славіліся беларусы сваёй гасціннасцю. Накарміць госця, даць яму прытулак лічылася ў нашых продкаў святой справай.

Бывала, жыццё гнула беларуса. Ён пакутаваў і цярпеў, марыў і спадзяваўся на лепшую будучыню, калі не для сябе, то для сваіх дзяцей. З усіх сіл стараўся беларус пакінуць у спадчыну дзецям штосьці большае, чым атрымаў сам ад сваіх бацькоў.

Складанае жыццё ў сярэдневяковы час не дазваляла нашым продкам памыляцца, бо памылкі маглі абярнуцца голадам і прывесці да смерці. Гэта зрабіла беларусаў людзьмі разважлівымі.

Жыццё часта сутыкала беларуса сам-насам са сваім лёсам. Таму ён спадзяваўся на свае сілы, але дапамогу іншых цаніў і ніколі не забываўся аддзякаваць за яе.

Беларус — вялікі міралюб. Ён дзеля спакою можа ахвяраваць многім. Калі ж у ліхую гадзіну чужынец квапіўся на яго зямлю, ён абараняў Радзіму храбра і ўпарта, не шкадуючы нават свайго жыцця. Беларусы былі добрымі змагарамі, але войны прыносілі нашым продкам вельмі шмат шкоды і пакут.

У XIV—XV стст. насельніцтва Вялікага княства Літоўскага ўжо выдзяляла сябе сярод іншых народаў. Бытавала шмат розных назваў нашых продкаў: «русь», «русіны», «людзі русі», «ліцвіны», «ліцвіны-беларусы», была таксама назва «палешукі». Назвы «русіны» і «беларусцы» больш адносіліся да жыхароў Падзвіння і Падняпроўя, заселенага ў асноўным праваслаўнымі, назва «ліцвіны» — часцей да тэрыторыі Верхняга Панямоння (тэрыторыя цяперашняй Гродзенскай вобласці), а больш позняя назва — «палешукі» — да Палесся (тэрыторыя Брэсцкай і Гомельскай абласцей). Назва «ліцвіны» мела і шырокі сэнс для абазначэння ўсіх жыхароў Вялікага княства Літоўскага.

**Паходжанне назвы «Белая Русь».** Сучасныя назвы нашай дзяржавы «Беларусь» і яе народа «беларусы» маюць гістарычныя карані. У гістарычнай крыніцы 1382 г. Полацк названы крэпасцю Белай Русі. У XIV—XV стст. Белай Руссю называлі тэрыторыю беларускага Падняпроўя і Падзвіння, але паступова гэта назва распаўсюдзілася і на астатнюю тэрыторыю сучаснай Беларусі.



Правообладатель Народная асвета

Узнікае пытанне: што азначае назва «Белая Русь»? Адзінай думкі па гэтым пытанні ў вучоных няма. У тыя часы адпаведны колер мог азначаць напрамак свету: белы — усход, чорны — захад. Белай Руссю тэрыторыю нашай краіны маглі называць і таму, што яе жыхары насілі белае палатнянае адзенне, мелі светлыя валасы і белы колер твару. Паводле яшчэ адной версіі, Белай Руссю называлі тую частку тэрыторыі нашай краіны, якая ў сярэднія вякі не была захоплена ні крыжакамі, ні татарамі. Слова «белая» азначала стан свабоды, волі, незалежнасці.

**Пытанні і заданні**

1. Растлумачце значэнне паняцця «народнасць». Назавіце характэрныя рысы народнасці. 2. Калі пачала складвацца беларуская народнасць? 3. Якія ўсходнеславянскія плямёны склалі этнічную аснову беларускага народа? 4. Якія народы зрабілі свой уклад у фарміраванне беларускай народнасці? 5. Якімі адметнымі рысамі характару вызначаюцца беларусы? Які ўплыў на фарміраванне характару беларусаў аказаў гістарычны лёс краіны? 6. Якімі асаблівасцямі характарызуецца беларуская мова? 7. Якія існуюць тлумачэнні назвы «Белая Русь»? 8*. Даведайцеся, якія адметныя словы сустракаюцца ў гутарковай мове насельніцтва вашай мясцовасці?

! **Гэта цікава.** Старадаўнім звычаем беларусаў было валачобніцтва, калі гурт моладзі (валачобнікаў) на першы дзень Вялікадня абыходзіў двары вёскі і віншаваў гаспадароў са святам песнямі, пажаданнямі шчасця сям'і, дабрабыту ў гаспадарцы. Валачобніцтва — з'ява, уласцівая народнай абраднасці Беларусі. У Расіі валачобніцтва вядома толькі ў сумежных з Беларуссю раёнах, што некалі ўваходзілі ў склад ВКЛ.

**Да ўрока «Наш край».** Запішыце паданні, песні, легенды і г. д., якія захаваліся ў вашай мясцовасці са старажытных часоў.

## § 22. Этнічныя меншасці ў ВКЛ

**Успомніце:**

*1. Хто такія балты? 2. Якія ўсходнеславянскія плямёны размяшчаліся ў раннім сярэдневякоўі на тэрыторыі Беларусі? 3. Калі з'явіліся першыя звесткі пра Літву?*



Правообладатель Народная асвета

**Шматэтнічны склад насельніцтва дзяржавы.** Вялікае княства Літоўскае насялялі розныя народы: літоўцы, беларусы, украінцы, рускія, палякі. Размяшчэнне ВКЛ на памежжы Захаду і Усходу Еўропы садзейнічала сувязям карэнных жыхароў дзяржавы з суседнімі народамі.

Трывалай была сувязь насельніцтва беларускіх зямель з літоўцамі. Наваградскія і суседнія з імі літоўскія землі склалі ядро новай дзяржавы ў перыяд княжання ў ёй Міндоўга. Вакол гэтага ядра пачало фарміравацца Вялікае княства Літоўскае. Пры Альгердзе тэрыторыя дзяржавы падвоілася, у яе склад увайшла значная частка ўкраінскай тэрыторыі.

На тэрыторыі ВКЛ утварыўся **шматэтнічны склад насельніцтва**, у якім пераважалі ўсходнія славяне: беларусы, украінцы, рускія. З цягам часу з'явіліся этнічныя меншасці: татары, яўрэі і інш.

**Татары.** Першыя звесткі пра татар як жыхароў Вялікага княства Літоўскага адносяцца да XIV ст. Вялікія князі Гедзімін, Вітаўт і інш. запрашалі татар з Залатой Арды і Крыма, выкарыстоўваючы іх у барацьбе з нямецкімі рыцарамі.

У ВКЛ знаходзілі сабе прытулак беглыя ханы. У канцы XIV ст. сюды адступіў вялікі золатаардынскі хан Тахтамыш са сваёй дружынай пасля паражэння ў сутыкненні з сярэднеазіяцкім заваёўнікам Цімурам. Тахтамыш быў гасцінна прыняты Вітаўтам і пасяліўся ў Лідзе. Вітаўт і Тахтамыш зрабілі паспяховы паход пад Азоў, дзе захапілі шмат ваеннапалонных татар, якія былі паселены каля Вільні, у Лідскім, Навагрудскім, Ашмянскім, Брэсцкім паветах.


Татарскі хан

У сваю чаргу, татарскія орды, якія атабарыліся ў Крыме, рабілі спусташальныя набегі на ўкраінскія і беларускія землі, рабавалі насельніцтва, захоплівалі жыхароў у палон. У 1506 г. князь Міхаіл Глінскі на чале войска ВКЛ разбіў пад Клецкам няпрошаных гасцей, узяў каля 4 тыс. палонных, якіх пасялілі



Правообладатель Народная асвета

ў Клецку і ў Менску, дзе для іх выдзелілі вольныя землі. За зямельныя ўладанні татары павінны былі несці ваенную службу, а таксама выконваць іншыя павіннасці.

Татарам дазвалялася вызнаваць іслам і будаваць мячэці. Пачынаючы з XVI ст. большасць татар сталі карыстацца ў паўсядзённым жыцці беларускай мовай. На беларускай мове з выкарыстаннем арабскага алфавіта былі напісаны свяшчэнныя кнігі беларускіх татар **Аль Кітабы**.

Татарскі народ аддана служыў сваёй новай радзіме і, калі патрабавалася, разам з іншымі народамі мужна бараніў яе ад захопнікаў.

**Яўрэі**. Пасля распаду Рымскай імперыі яўрэі апынуліся ў розных краінах. Яны размаўлялі на мовах тых народаў, сярод якіх жылі.

У яўрэйскага насельніцтва ў Еўропе распаўсюдзілася новаяўрэйская мова ідыш, заснаваная на базе гаворак нямецкай мовы. Разам з тым яўрэі паўсюдна шчыра захоўвалі традыцыі іудзейскай рэлігіі, запісаныя ў шматтомным Талмудзе.




Грамата яўрэям ВКЛ, выдадзеная ў XVI ст.

У час ганення яўрэі пачалі перасяляцца з Заходняй Еўропы (Германіі, Англіі, Францыі) у Польшчу і Вялікае княства Літоўскае. Вітаўт ахвотна запрашаў заможных яўрэяў на жыхарства ў ВКЛ. Яны мелі свой гасцінны двор у Вільні. Яўрэі сяліліся пераважна ў гарадах асобнымі кварталамі — **гета**, у межах сваёй абшчыны — **кагалу**, дзе кожны лічыўся паўнапраўным грамадзянінам. Вярхоўная ўлада, магнаты ВКЛ прыхільна ставіліся да яўрэяў. Часам некаторыя з іх выконвалі важныя заданні: збіралі падаткі, гандлёвыя пошліны, працавалі ў маёнтках буйных феадалаў. Аднак яны не маглі набы-



Правообладатель Народная асвета

ваць зямельную ўласнасць, служыць у шляхецкім войску. Толькі ў некаторых населеных пунктах яўрэі мелі свае палкі і сотні, якія ўдзельнічалі ў іх абароне ў часы вайны.

На беларускіх землях першыя яўрэйскія абшчыны з’явіліся ў канцы XIV ст. у Брэсце і Гародні. Масавае перасяленне яўрэяў у Беларусь пачалося ў канцы XV ст. пры Казіміру IV Ягелоне.

**Прыход цыганоў.** Продкі цыганоў жылі ў Індыі. Прычынамі, якія прымусілі цыганоў пакінуць сваю гістарычную Радзіму, верагодна, былі спусташальныя набегі і паходы розных заваёўнікаў на іх землі. У Еўропе цыганы з’явіліся ў X ст. У Вялікае княства Літоўскае яны трапілі з Польшчы, Германіі, Венгрыі ў XV ст.

Цыганы былі добрымі каняводамі, дрэсіроўшчыкамі звяроў, варажбітамі, знахарамі, танцорамі. Займаліся рамёствамі і гандлем коньмі.

Аднак качавы лад жыцця групамі сем’яў, ці **табарам**, жорсткая барацьба за існаванне часта выклікалі непаразуменні з мясцовым насельніцтвам і ўладамі. У сярэднія вякі амаль ва ўсіх краінах Еўропы былі суровыя законы ў адносінах да цыганоў. Забойства цыгана нават не каралася законам.

У ВКЛ цыганы аддавалі перавагу качавому ладу жыцця. Месцамі іх збору былі кірмашы. На беларускіх землях цыганы прытрымліваліся той жа рэлігіі, што і мясцовае насельніцтва. Яны гаварылі на цыганскай мове, а таксама навучыліся размаўляць пабеларуску.

На тэрыторыі Беларусі галоўным месцам збору цыганоў была Зэльва (цяпер Гродзенская вобласць). Аднак найбольшая колькасць цыганоў пражывала ў Міры (Карэліцкі раён Гродзенскай вобласці). Цыганы жылі тут абшчынамі, выбіралі цыганскіх старэйшын — «баронаў», ці «каралёў», якім яны падпарадкоўваліся.

### Пытанні і заданні

1. Якія славянскія народы пераважалі па сваёй агульнай колькасці ў параўнанні з балтамі на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага? 2. Чаму вялікія князі літоўскія запрашалі ў ВКЛ татар з Залатой Арды і Крыма? 3. Дзе пасяліў Вітаўт ваеннапалонных татар пасля паходу пад Азоў? 4. Калі яўрэі з’явіліся ў ВКЛ і Польшчы? Адзначце асаблівасці жыцця яўрэяў. Чым яны ў асноўным займаліся? Што ім было забаронена рабіць? 5. Чаму Вітаўт запрашаў у ВКЛ у першую чаргу за-



Правообладатель Народная асвета

можных яўрэяў? 6. Калі і адкуль з'явіліся цыганы на тэрыторыі ВКЛ? У якіх месцах на тэрыторыі Беларусі была значная колькасць цыганоў? Якому ладу жыцця аддавалі яны перавагу? 7. Пацвердзіце прыкладамі вывад: на тэрыторыі ВКЛ утварыўся шматэтнічны склад насельніцтва.

**Да ўрока «Наш край».** Даведайцеся, якія народы пражывалі ў вашай мясцовасці ў сярэдзіне XV — першай палове XVI ст. Ці захавалі яны своеасаблівыя традыцыі? Апішыце іх.

## § 23. Царква і рэлігія

**Успомніце:**

*1. Калі была заключана Крэўская унія? 2. Якія правы атрымала шляхта каталіцкага веравызнання паводле Гарадзельскага прывілея? 3. Якім чынам праваслаўнае насельніцтва ВКЛ змагалася за свае правы?*

**Палітыка дзяржавы ў адносінах да царквы.** Пасля заключэння Крэўскай уніі рэлігійная палітыка кіраўніцтва Вялікага княства Літоўскага памянялася. Раней тут існавала толькі адна хрысціянская канфесія — праваслаўе, якой прытрымлівалася насельніцтва беларускіх, украінскіх і рускіх зямель дзяржавы. Да канца XIV ст. вялікія князі літоўскія пераважна былі язычнікамі, аднак яны не парушалі рэлігійных правоў праваслаўнага люду, бо гэта магло перашкодзіць ім у так званым «збіранні рускіх зямель». Больш таго, яны рабілі актыўныя крокі ў стварэнні ўласнай праваслаўнай мітраполіі з цэнтрам у Навагрудку.

Аднак паводле ўмоў Крэўскай уніі язычніцкае насельніцтва павінна было быць ахрышчана па каталіцкім абрадзе. Зрабіць гэта толькі прымусовымі сродкамі было складана і магло прывесці да ўнутранага канфлікту. У жыхароў ВКЛ, асабліва язычнікаў-літоўцаў, каталіцкая вера стагоддзямі звязвалася з галоўнымі ворагамі — крыжакамі. Таму былі неабходны такія меры, якія зрабілі б новую веру прывабнай, прыцягальнай для шырокіх слаёў насельніцтва.

Ужо ў 1387 г. феадалы, якія прынялі каталіцтва, атрымалі новыя прывілеі, якіх не мелі язычнікі і праваслаўныя. Шлюбы паміж католікамі і праваслаўнымі забараняліся; для таго каб ажаніцца з католікам, маладая павінна была спачатку перайсці ў каталіцтва. Яшчэ большыя правы атрымалі католікі паводле


Правообладатель Народная асвета

Гарадзельскага прывілея 1413 г. З гэтага часу толькі яны маглі займаць вышэйшыя пасады ў дзяржаве.



Царква ў Сынковічах

У выніку праваслаўнае насельніцтва апынулася ў нераўнапраўным становішчы. Незадаволенасць рэлігійнай палітыкай кіраўніцтва ВКЛ абвастрала напружанасць у дзяржаве, надавала ўнутраным канфліктам рэлігійную афарбоўку. У 1432 і 1434 гг. улады былі вымушаны ўраўнаваць праваслаўных і католікаў у большасці правоў, аднак палажэнне аб заняцці вышэйшых дзяржаўных пасад толькі католікамі фармальна дзейнічала да 1563 г.

У XV ст. у Еўропе сталі распрацоўвацца планы ўз'яднання хрысціянскай царквы, якая з XI ст. была расколана на дзве часткі — каталіцтва і праваслаўе. Планы царкоўнай уніі сустрэлі падтрымку ў вялікага князя літоўскага Вітаўта. Гэтаму спрыяў шматканфесійны характар ВКЛ і жаданне Вітаўта, не губляючы сувязі з каталіцкай Еўропай, пашырыць свой уплыў на праваслаўную Русь. Поспех царкоўнай уніі дазволіў бы згладзіць супярэчнасці паміж праваслаўным і каталіцкім насельніцтвам ВКЛ і ператварыў бы гэту дзяржаву ў мацнейшы хрысціянскі фарпост на ўсходзе Еўропы. Пазней ідэю царкоўнай уніі падтрымаў Свідрыгайла.

У 1439 г. унія паміж каталіцкай і праваслаўнай цэрквамі была заключана на саборы ў Фларэнцыі. Аднак у ВКЛ яго рашэнні не атрымалі шырокай падтрымкі. Каталіцкія кіраўнікі не жадалі дзяліцца з праваслаўнай царквой правамі і прывілеямі, а праваслаўнае насельніцтва цвёрда прытрымлівалася векавых традыцый. Не падтрымаў унію і новы вялікі князь Казімір Ягелон. Заваяванне Канстанцінопаля туркамі ў 1453 г. зрабіла пытанне уніі яшчэ менш актуальным. Але спробы аднавіць Фларэнтыйскую унію рабіліся і пазней, напрыклад на мяжы XV і XVI стст. вялікім князем Аляксандрам.



Правообладатель Народная асвета

**Становішча праваслаўнай царквы.** У канцы XIV — XVI ст. на беларускіх землях самай шматлікай канфесіяй заставалася праваслаўе. Крэўская унія мела негатыўныя вынікі для праваслаўнай царквы, аднак яе прыхільнікі не прымушаліся да пераходу ў іншую веру. Таму пазіцыі праваслаўя заставаліся вельмі моцнымі нават у асяроддзі феадальнай знаці. Напрыклад, з дванаццаці сыноў Альгерда каталікамі былі толькі двое — Ягайла (Уладзіслаў) і Свідрыгайла (Баляслаў). Вярхоўная ўлада абмяжоўвала будаўніцтва праваслаўных цэркваў у Літве, але нават на пачатку XVI ст. у сталіцы дзяржавы — Вільні праваслаўных храмаў было больш, чым каталіцкіх.

Беларускія землі ўваходзілі ў склад Навагрудскай, Полацкай, Тураўскай, Уладзімірскай, Смаленскай і Чарнігаўскай епархій. Тут дзейнічала некалькі дзесяткаў манастыроў, большасць якіх былі невялікімі і налічвалі да 15—20 манахаў.

З канца XIV ст. праваслаўная царква не карысталася такой апекай кіраўніцтва ВКЛ, як каталіцкі касцёл. Царква не атрымоўвала ад дзяржавы шчодрых зямельных падараванняў, праваслаўныя іерархі не засядалі ў радзе. Таму надзвычай важнае значэнне атрымала падтрымка праваслаўнай царквы з боку свецкіх асоб — магнатаў, шляхты і мяшчан. Некаторыя заможныя апекуны царквы карысталіся аўтарытэтам, не меншым за аўтарытэт вышэйшых духоўных асоб. Разам з тым гэта прыводзіла да залежнасці духавенства ад свецкіх апекуноў і да іх умяшальніцтва ў царкоўныя справы.



Касцёл у вёсцы Уселюб. XV ст.

**Умацаванне пазіцый каталіцтва.** Стварэнне арганізацыйнай структуры каталіцтва ў ВКЛ пачалося неўзабаве пасля заключэння Крэўскай уніі. У *1387* г. было створана *Віленскае біскупства*, а касцёлу вызначалася забеспячэнне ў выглядзе зямель, даходаў і павіннасцей з падданага насельніцтва. Спачатку Віленскае біскупства падпарадкоўвала-



Правообладатель Народная асвета

ся непасрэдна Рыму, але затым стала намесніцтвам Гнезенскага архібіскупства ў Польшчы. Дзякуючы гэтаму каталіцтва было важным фактарам, які трывала звязваў ВКЛ з Каронай Польскай. У першай палове XV ст. дзейнічалі таксама Жамойцкае і Луцкае біскупствы.

Ужо ў часы Вітаўта актыўна засноўваліся каталіцкія храмы, каля трэці якіх было закладзена на беларускіх землях. Пераважна касцёлы канцэнтраваліся на заходніх і паўночна-заходніх ускрайках Беларусі, дзе прысутнасць літоўскага насельніцтва была большай. У далейшым пашырэнне ўладанняў каталіцкага касцёла на тэрыторыі Беларусі ішло больш хуткімі тэмпамі. З 33 багацейшых **парафій** (прыходаў), заснаваных у ВКЛ да сярэдзіны XVI ст., 22 былі закладзены ў Беларусі. Тут знаходзілася каля дзвюх трэцяў усіх уладанняў Віленскага біскупства.

Яшчэ ў папярэднія часы на землях Беларусі дзейнічалі каталіцкія манахі. У XV ст. актыўную дзейнасць разгарнулі тут прадстаўнікі ордэнаў францысканцаў, дамініканцаў, бернардзінцаў, аўгусцінцаў. Усяго да сярэдзіны XVI ст. у ВКЛ дзейнічала 8 каталіцкіх ордэнаў.

**Рэлігійная талерантнасць у ВКЛ**. У першай палове XVI ст. рэлігійнае становішча ў ВКЛ стала мяняцца. Прадстаўнікі праваслаўнай знаці ўсё часцей дапускаліся да вышэйшых дзяржаўных пасад, што парушала нормы Гарадзельскага прывілея 1413 г. Гэта павінна было залагодзіць праваслаўнае насельніцтва, павысіць яго давер да ўлады. Далейшае аслабленне пазіцый каталіцкага касцёла было звязана з пранікненнем у ВКЛ пратэстанцкіх ідэй. Прыхільнікам верацярпімасці быў вялікі князь Жыгімонт Аўгуст. Ён нават падтрымліваў ідэю стварэння Народнага сабора, дзе аб'ядналіся б прадстаўнікі ўсіх напрамкаў хрысціянства.



Вялікі князь літоўскі Жыгімонт II Аўгуст (1548—1572)

Да сярэдзіны XVI ст. у ВКЛ усталявалася адносная **рэлігійная талерант-**



Правообладатель Народная асвета

**насць,** або верацярпімасць. У **1563** г. быў прыняты прывілей, паводле якога феадалы ўсіх хрысціянскіх канфесій ураўноўваліся ў правах.

**Пытанні і заданні**

1. Якая канфесія была найбольш распаўсюджанай і самай шматлікай у ВКЛ у канцы XIV—XVI ст.? 2. Калі на тэрыторыі Беларусі пачало пашырацца каталіцтва? 3. Якія правы атрымалі каталікі паводле: а) Крэўскай уніі; б) Гарадзельскага прывілея? Калі феадалы ўсіх хрысціянскіх канфесій у ВКЛ былі ўраўноўваны ў правах? 4. Якія прычыны садзейнічалі распаўсюджанню ў ВКЛ рэлігійнай талерантнасці?

**Гістарычная крыніца**

**З прывілея вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста**

*1563 г.*

Таму ўсе іншыя стану рыцарскага і шляхецкага, як літоўскага, так і рускага народа, толькі б былі веры хрысціянскай... на пасады дворныя і земскія, не толькі падданыя касцёлу Рымскаму, ад гэтага часу выбраны і прызначаны быць могуць, але аднолькава і роўна ўсе рыцарскага стану з народа шляхецкага людзі веры хрысціянскай, як Літва, так і Русь, кожны паводле дасягненняў і здабыткаў сваіх, ад нас, гаспадара, на месцы высокія службовыя і на іншыя пасады з ласкі нашае могуць прызначацца...

*Хто, згодна з прывілеем, мог займаць дзяржаўныя пасады ў ВКЛ?*

! **Гэта цікава.** Выдатнай з'явай у гісторыі беларускай культуры XV ст. была дзейнасць рэлігійнага дзеяча, таленавітага пісьменніка і прапаведніка Рыгора Цамблака (1364 — каля 1450), родам з Балгарыі. Па ініцыятыве вялікага князя Вітаўта ён быў абраны кіеўскім мітрапалітам. Даследчыкі лічаць Цамблака аўтарам больш як 40 твораў, з якіх зберагліся каля 26. Яго творы, напісаныя вобразнай моваю, карысталіся вялікай павагай ва ўсім славянскім свеце.

**Да урока «Наш край».** Даведайцеся, прадстаўнікі якіх канфесій пражываюць у вашай мясцовасці.



Правообладатель Народная асвета

# § 24—25. Культура ў XIV — XV стст.

**Успомніце:**

*1. Асноўныя рысы гатычнай архітэктуры. 2. Якія замкі адносяцца да тыпу «кастэль»? 3. Што садзейнічала развіццю абарончага дойлідства на беларускіх землях у другой палове XIII — XIV ст.?*

**Асноўныя мастацкія стылі.** Перыяд XIV—XV стст. быў надзвычай адметным у развіцці беларускай культуры і мастацтва. Паступова страчваліся традыцыі полацкай і гродзенскай архітэктурных школ, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва старажытнарускага часу. Аднак побач з традыцыйнай культурай, сфарміраванай на візантыйскай аснове, на беларускіх землях пачынаюць праяўляцца элементы заходнееўрапейскіх мастацкіх стыляў. Раманскі стыль, які панаваў у Заходняй Еўропе з X па XII ст., не атрымаў у XIV—XV стст. на Беларусі шырокага распаўсюджання. Асобныя яго рысы можна заўважыць толькі ў адзінкавых помніках архітэктуры і скульптуры. Значна большы ўплыў на развіццё беларускага мастацтва аказаў гатычны стыль, які ўзнік у Еўропе ў XII ст. Для гатычнага стылю, які праявіўся найперш у архітэктуры, былі характэрны спічастыя, выцягнутыя ўгору абрысы, вялікія вокны са стральчатымі аркамі, крыжовыя, зорчатыя ці сотавыя скляпенні, якія стваралі непаўторны ўзор на столі. Усё гэта стварала ўражанне лёгкасці, прыбранасці будынка, яго імкнення ўгору, да Бога, што было асабліва важна пры ўзвядзенні цэркваў і касцёлаў. Значная ўвага надавалася скульптурнаму аздабленню будынкаў, выкарыстанню **вітражоў** — вокнаў з малюнкамі з каляровага шкла. У далейшым готыка стала пануючым стылем і ў скульптуры, жывапісе, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Ламаныя, вычварныя формы гатычнага стылю надавалі чалавечым фігурам і нават проста дэкаратыўным узорам надзвычайную выразнасць.

На беларускіх землях першыя збудаванні ў гатычным стылі ўзводзяцца з канца XIII ст. У далейшым гэты стыль аказаў моцнае ўздзеянне на скульптуру, жывапіс, нават напісанне літар. «Гатычныя» густы праяўляліся ў вырабе ўзбраення, даспехаў, свецкай модзе. Праявы готыкі пратрымаліся на беларускіх землях вельмі доўга і сустракаліся нават у XVII ст.



Правообладатель Народная асвета

Народная асвета

**Культавае і абарончае дойлідства.** Да сярэдзіны XV ст. самымі моцнымі ў Вялікім княстве Літоўскім былі дзяржаўныя замкі. У далейшым актыўна пачынаюць будавацца замкі магнатаў. Напэўна, самы вядомы магнацкі замак быў узведзены ў пачатку XVI ст. у *Міры*.

Для замкавай архітэктуры былі ўласцівыя прастата і суровасць. Найбольшая ўвага звярталася на моц сцен і веж, якія павінны былі супрацьстаяць любому ворагу. Замкі будаваліся ў месцах, нязручных для жылля, але зручных для абароны — на пагорках, сярод балот, на астравах азёр. Многія замкі абводзіліся ровам. Некаторыя складаліся з дзвюх частак — Ніжняга і яшчэ больш магутнага Верхняга замка.

Пастаянная ваенная пагроза наклала адбітак і на культавае будаўніцтва. У XIV—XV стст. тут таксама замацоўваецца гатычны



Мірскі замак. *Сучасны выгляд*



Правообладатель Народная асвета

стыль. Для беларускай готыкі ўласціва большая стрыманасць і суровасць у параўнанні з заходнееўрапейскай, а таксама выкарыстанне цэглы, а не каменю. Галоўнай асаблівасцю архітэктуры гатычных храмаў Беларусі былі трохвугольныя спічастыя фасады, часам з пабеленымі нішамі. Сцены ўмацоўваліся спецыяльнымі падпорамі — *контрфорсамі*, што стварала ўражанне велічнасці і манументальнасці. Аркі і нішы ў беларускіх гатычных збудаваннях часам рабілі не стральчатымі, а скругленымі, што надавала ім падабенства з раманскім стылем. Да нашых дзён захаваліся гатычныя касцёлы ва *Уселюбе, Ішкалдзі, Гнёзне* і г. д.



Царква ў Мураванцы

Першапачаткова готыка на Беларусі была звязана з узвядзеннем каталіцкіх касцёлаў. Аднак хутка яна пашырылася і ў праваслаўным дойлідстве. На мяжы XV і XVI стст. на беларускіх землях распаўсюдзіўся спецыфічны тып царквы, у якім спалучаліся рысы готыкі, традыцыйнага руска-візантыйскага стылю і элементы абарончага характару. Па сённяшні дзень узвышаюцца абарончыя цэрквы ў *Сынковічах* і *Мураванцы*. Іх аблічча вызначаюць спічастыя трохвугольныя гатычныя франтоны і абарончыя вежы па вуглах. Гэта былі не адзіныя цэрквы абарончага тыпу на Беларусі. Нават Сафійскі сабор у Полацку быў перабудаваны на мяжы XV і XVI стст. у падобным стылі.

**Жывапіс і скульптура.** Далейшае развіццё атрымала ў XIV—XV стст. выяўленчае мастацтва. Па-ранейшаму вялікае значэнне меў *іканапіс*, які развіваўся на аснове візантыйска-рускіх традыцый. Вялікае прызнанне атрымалі беларускія майстры фрэсак. Захаваліся іх роспісы ў шэрагу польскіх храмаў. Самымі вядомымі з'яўляюцца



Правообладатель Народная асвета



Распяцце з вёскі Галубічы



Скульптура «Святы Рыгор». Канец XV — пачатак XVI ст.

фрэскі замкавай капліцы ў Любліне пачатку XV ст., у тым ліку партрэт Ягайлы. У Віцебску меліся партрэты Альгерда і яго жонкі Ульяны, у Троцкім замку — Вітаўта. З XV ст. партрэты пачынаюць заказваць не толькі манархі, але і іншыя ўплывовыя асобы — князі, магнаты.

Моцныя ўплывы візантыйскай традыцыі захоўваліся ў *кніжнай мініяцюры*, аднак і тут яны мусілі крыху адступіць пад націскам новых культурных павеваў. Вельмі характэрным у гэтым сэнсе з'яўляецца так званы ***Радзівілаўскі летапіс***, створаны на ўсходніх землях Вялікага княства Літоўскага ў канцы XV ст. Летапіс утрымоўвае 617 каляровых мініяцюр, на якіх адлюстраваны розныя бакі жыцця сярэдневяковага грамадства — бітвы, народныя паўстанні, праца і адпачынак, святы, побытавыя сцэнкі і г. д. Мастакі старанна імкнуліся вытрымаць руска-візантыйскія каноны. Аднак праз іх праступаюць і мясцовыя рэаліі XV ст. — рыцарскае ўзбраенне, гатычнае



Правообладатель Народная асвета

адзенне і мэбля, геральдыка, уласцівыя гатычнаму мастацтву выявы фантастычных звяроў — грыфонаў, адзінарогаў і г. д.

Новай з’явай у мастацтве беларускіх зямель XIV—XV стст. стала *скульптура*. Развіццё скульптуры ў гэты час было звязана з культавым дойлідствам, найперш каталіцкім, бо праваслаўная царква аддавала перавагу абразам. Самая ранняя скульптурная выява на Беларусі — распяцце XIV ст. з в. Галубічы Віцебскай вобласці, выкананае ў раманскім стылі. У XV—XVI стст. пашыраецца гатычная скульптура. Самым папулярным сюжэтам гэтага часу робіцца юная Дзева Марыя з дзіцем на руках. Сустракаюцца таксама выявы святых. Для скульптур гэтага часу характэрна велічнасць, што падкрэслівалася манументальнасцю поз і ламанымі складкамі адзення. Разам з тым у асобных гатычных скульптурах XVI ст. прасочваюцца і новыя рысы, уласцівыя мастацтву Адраджэння — цікавасць да ўнутранага свету чалавека, яго самабытнасці, больш свабодныя позы і г. д. (Скульптура «Святы Рыгор» і інш.).



Скульптура Дзевы Марыі з вёскі Рось Гродзенскай вобласці. Пачатак XVI ст.

**Літаратура.** Развіццю беларускай літаратуры ў XIV—XV стст. спрыяла тое, што старабеларуская мова мела ў Вялікім княстве Літоўскім статус афіцыйнай.

Напачатку аснову літаратуры складалі, як і ў ранейшыя часы, *творы рэлігійнага характару* — Біблія, богаслужэбныя кнігі, жыццяпісанні святых, павучанні і інш. Яны перапісваліся пераважна манахамі ў манастырах на царкоўнаславянскай мове. Захаваліся выдатныя ўзоры падобнай літаратуры — *Лаўрышаўскае*, *Мсціжскае*



Правообладатель Народная асвета

і іншыя *Евангеллі*. У XV ст. з'явіліся і першыя пераклады рэлігійнай літаратуры на беларускую мову.

Узнікалі і іншыя творы, таксама звязаныя з рэлігійнай тэматыкай, але насычаныя больш пазнавальнай інфармацыяй. Да іх адносяцца творы *паломніцкай літаратуры*, нечым падобныя да падарожных нататкаў. У XV ст. узнік жанр *панегірычнай літаратуры*, якая ўслаўляла пэўных асоб. Найбольш вядомым творам такога характару была «*Пахвала Вітаўту*», створаная ў першай палове XV ст. у Смаленску. У ёй Вітаўт услаўляецца як мудры і магутны правіцель, які карыстаецца міжнародным аўтарытэтам і праводзіць паспяховую аб'яднаўчую палітыку. Вялікае княства Літоўскае паказваецца як супольная дзяржава балтаў і славян, адзін з галоўных цэнтраў «збірання ўсходнеславянскіх зямель».

У гэты ж час ствараюцца выдатныя летапісныя творы, якія адчувалі ўплыў старажытнарускага летапісання папярэдніх часоў. Гэта «*Летапісец вялікіх князёў літоўскіх*» і *Беларуска-літоўскі летапіс*. У іх паслядоўна адстойвалася палітыка вярхоўнай улады па ўмацаванні дзяржавы, ухвалялася барацьба з непакорнымі феадаламі.

Перапісванне кніг было доўгай і цяжкай працай. Таму дазволіць сабе мець бібліятэку, хай сабе і невялічкую, мог далёка не кожны. Найчасцей зборы кніг меліся пры цэрквах і манастырах. Гэта тлумачылася не толькі царкоўным характарам большасці літаратурных твораў, але і тым, што перапісваннем кніг займаліся пераважна манахі. З канца XV ст. вядомы бібліятэкі феадалаў, дзе трапляліся кнігі не толькі на царкоўнаславянскай і старабеларускай, але і на лацінскай, польскай, чэшскай і іншых мовах. Тут былі кнігі не толькі духоўнага, але і свецкага характару.

**Пытанні і заданні**

1. Якія асаблівасці мела архітэктура гатычнага стылю на беларускіх землях? 2. Параўнайце знешні выгляд касцёла ў Ішкалдзі і сабора Божай Маццеры ў Парыжы. Знайдзіце агульнае і адметнае ў гэтых пабудовах. 3. Які ўплыў аказала готыка на мастацтва і побыт жыхароў ВКЛ? 4. Назавіце асноўныя напрамкі развіцця беларускага жывапісу. 5. З чым звязана развіццё скульптуры на беларускіх землях у XIV—XV стст.? 6. Якія факты сведчаць аб развіцці літаратуры на бела-



Правообладатель Народная асвета

рускіх землях? Назавіце найбольш значныя літаратурныя творы, якія былі створаны ў XIV—XV стст.

**Да ўрока «Наш край».** Даведайцеся, у якіх музеях Беларусі ёсць мастацкія творы XIV—XV стст.

## § 26. Рэнесансавая культура ў ВКЛ у першай палове XVI ст.

**Успомніце:**
*1. Які перыяд у гісторыі Еўропы называюць Адраджэннем? Чаму? 2. Дзе і калі пачалася Рэфармацыя? 3. Якія новыя канфесіі з'явіліся ў Еўропе пад уплывам Рэфармацыі?*

**Рэнесанс і яго праявы ў культуры і штодзённым жыцці.** Рэнесанс, што па-французску азначае Адраджэнне, складае ў культурным і духоўным жыцці Еўропы цэлую эпоху. Ён пачаўся ў Італіі ў XIV ст., і хутка яго павевы распаўсюдзіліся на поўнач, дакаціўшыся ў пачатку XVI ст. да беларускіх зямель. Рэнесанс закрануў не толькі мастацтва. Ён праявіўся ў павышэнні ўвагі да чалавека, яго знешняй і ўнутранай прыгажосці (гуманізм), у пошуку рэформ і шляхоў удасканалення грамадства, рэлігійна-духоўнага абнаўлення, ва ўзрастанні ўвагі да прыроды і гісторыі. З Рэнесансам звязваецца ўзрастанне нацыянальнай годнасці. На змену аскетызму прыходзіць прага свецкіх забаў і ў той жа час унутранага самаўдасканалення.

Новыя павевы ў культуры ВКЛ распаўсюджваліся спачатку пры двары манархаў, затым магнатаў, а адтуль — у асяроддзі шляхты і багатых мяшчан, якія пераймалі звычкі знаці. Ужо двор вялікага князя Аляксандра быў у гэтым сэнсе бліскучым, аднак асабліва ўзмацніўся подых Рэнесанса ў часы Жыгімонта І Старога і яго сына Жыгімонта ІІ Аўгуста. Сюды сцякаліся замежныя музыканты, мастакі, архітэктары, у тым ліку выхадцы з Іта-



Медаль з выявай Жыгімонта І Старога



Правообладатель Народная асвета



Партрэт Юрыя Радзівіла. XVI ст.

ліі. Гэтаму ў нейкай меры спрыяла італьянскае паходжанне жонкі Жыгімонта Старога Боны Сфорца. Пры велікакняжацкім і магнацкіх дварах наладжваліся піры з танцамі і спевамі, маскарады, рыцарскія турніры. Нават такі звыклы занятак, як паляванне, мог абстаўляцца з пышнай тэатральнасцю: пры паляванні на зубра часам узводзіліся спецыяльныя трыбуны, з якіх высакародныя гледачы любаваліся распраўай над зверам. Сціпласць у харчаванні змянілася пошукам усё больш вытанчаных і далікатных страў. Залішняя пампезнасць і багацце праяўляліся і ў касцюмах магнатаў, якія спаборнічалі паміж сабой, пераймаючы модныя павевы то з Захаду, то з Усходу.

Каб атрымаць прызнанне сучаснікаў, чалавек імкнуўся да славы, сваёй асабістай, свайго роду і сваёй Айчыны. Адсюль вынікае павышаная цікавасць да мінулага, стварэнне міфаў, легендарных продкаў. Шляхта выводзіла сваё паходжанне то ад старажытных рымлян, то ад сарматаў, якія калісьці нібыта насялялі гэтыя землі. Згодна з новымі ўяўленнямі чалавек не толькі павінен быў дасягнуць прыжыццёвай славы, але і перадаць яе нашчадкам. Каб пакінуць пра сябе добрую памяць, багатыя асобы займаліся мецэнацтвам, узводзілі за свой кошт новыя храмы, выдзялялі грошы на развіццё мастацтва.

У XVI ст. распаўсюджваецца традыцыя парадных *партрэтаў*, якія паказвалі ўладальнікаў у велічных позах, у багатых касцюмах ці рыцарскіх даспехах. Паступова складваецца традыцыя стварэння цэлых партрэтных галерэй магнацкіх родаў. З'яўляецца такі новы від мастацтва, як *гравюра*. Элементы Рэнесанса праяўляюцца ў скульптуры і архітэктуры. Пры забудове гарадоў Нясвіжа, Старога Быхава, Слуцка прасочваецца імкненне да стварэння «ідэальнага» горада. На зме-



Правообладатель Народная асвета

ну суровым замкам прыходзяць палацава-замкавыя комплексы, якія спалучалі рысы готыкі і Рэнесанса. У культавым дойлідстве рэнесансавыя рысы найбольш праявіліся пры пабудове пратэстанцкіх храмаў. Уздзеянне Рэнесанса адчуваецца нават у іканапісе. На беларускіх абразах гэтага часу пачынаюць адлюстроўвацца дэталі штодзённага жыцця, кананічнасць вобразаў змяняецца паказам чалавечых пачуццяў.



Абраз «Пакланенне вешчуноў». XVI ст.

**Літаратура.** Развіццю літаратуры на беларускіх землях у XVI ст. спрыяў афіцыйны статус беларускай мовы. У гэтым выразна праявілася імкненне да пашырэння свецкай літаратуры, як уласнай, так і перакладной. Дзякуючы перакладам агульнадаступным стаў такі распаўсюджаны ў Заходняй Еўропе жанр, як *рыцарскі раман* («Аповесць пра Баву», «Аповесць пра Трыстана» і г. д.).

Важнае месца ў літаратуры ВКЛ першай паловы XVI ст. займаюць *рэнесансавыя вершаваныя творы*, напісаныя на лацінскай мове. Пачынальнікам гэтага жанру стаў **Мікола Гусоўскі**. У 1523 г. выйшла яго паэма *«Песня пра зубра»*. Аўтар праслаўляе беларускую прыроду, слаўнае мінулае ВКЛ часоў Вітаўта, лічыць яго ўзорам для сучаснікаў. Адначасова ён асуджае войны паміж хрысціянскімі народамі, заклікае іх згуртавацца перад турэцкай пагрозай.

Далейшае распаўсюджанне атрымала *беларуска-літоўскае летапісанне.* Найлепшымі яго ўзорамі сталі створаныя ў першай палове XVI ст. *«Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага»* і *«Хроніка Быхаўца»*. Яны ў цэлым мелі сярэдневяковы характар, але з відавочнымі рэнесансавымі рысамі (міфалагізацыя і папулярызацыя мінулага, патрыятычныя настроі, публіцыстычная скіраванасць).



Правообладатель Народная асвета




Мікола Гусоўскі

Падобнымі рысамі прасякнуты і іншыя творы XVI ст. Яны праявіліся ў прадмовах і каментарыях да перакладаў Біблії **Францыска Скарыны**, які імкнуўся выкарыстаць кнігі Святога пісання ў выхаваўчых мэтах. Гуманістычныя ноткі выразна гучаць у працы **Міхалона Літвіна** «Пра норавы татар, літвінаў і маскавітаў». Аўтар не толькі прыводзіць цікавыя і падрабязныя звесткі пра гэтыя народы, але і крытыкуе адмоўныя бакі тагачаснага грамадства ВКЛ, заклікае да павышэння яго маральнасці.

Цэлы жанр рэнесансавай літаратуры ўзнік на глебе *рэлігійнай палемікі*, якая разгарнулася з сярэдзіны XVI ст. Пашырэнне ў ВКЛ Рэфармацыі прывяло да з'яўлення прац, у якіх аўтары не толькі асуджалі каталіцкую царкву, але і выступалі ў абарону свабоды чалавека, супраць феадальнага прыгнёту. Найбольш яркімі пратэстанцкімі аўтарамі сталі **Сымон Будны** і **Васіль Цяпінскі**.

**Развіццё кнігадрукавання.** Важнае значэнне для развіцця літаратуры, культуры і асветы мела пашырэнне кнігадрукавання. Дзякуючы яму з новымі творамі маглі азнаёміцца значна больш чытачоў. Пачынальнікам кнігадрукавання на беларускіх і ўсходнеславянскіх землях стаў **Францыск Скарына**. У **1517** г. ён выдаў у Празе



Правообладатель Народная асвета

першую кнігу з элементамі гутарковай старабеларускай мовы, зразумелай народу. А ў 1522 і 1525 гг. Скарына працягнуў сваю выдавецкую дзейнасць ужо ў сталіцы ВКЛ — Вільні. На тэрыторыі Беларусі першая друкарня была заснавана ў 1553 г. у Брэсце. Самыя раннія друкаваныя кнігі ў ВКЛ былі выдадзены на старабеларускай мове. Першая літоўская кніга была выдадзена толькі ў 1547 г. па-за межамі дзяржавы, у Прусіі.

Хуткае пашырэнне кнігадрукавання ў другой палове XVI ст. было звязана з Рэфармацыяй. Важнай задачай пратэстантаў было распаўсюджанне сваіх ідэй і азнаямленне шырокага кола людзей з тэкстам Бібліі. Аднак у прапагандзе сваіх ідэй былі зацікаўлены і прадстаўнікі іншых канфесій. У XVI ст. у ВКЛ дзейнічала цэлая сетка друкарняў, якія выпусцілі больш за 320 выданняў на беларускай, царкоўнаславянскай, польскай, лацінскай і іншых мовах.

**Пытанні і заданні**

1. Калі ідэі Рэнесанса распаўсюдзіліся на беларускіх землях? Якія змены адбыліся ў штодзённым жыцці пад уплывам Рэнесанса? 2. Якія новыя жанры з'явіліся ў жывапісе ў XVI ст.? 3. Якія асноўныя напрамкі і жанры атрымалі развіццё ў беларускай літаратуры XVI ст.? Назавіце найбольш вядомых аўтараў XVI ст. 4. Як вы лічыце, чаму ў XVI ст. узрасла колькасць твораў свецкай літаратуры? Прывядзіце прыклады. 5. Хто з'яўляецца пачынальнікам кнігадрукавання на беларускіх і ўсходнеславянскіх землях? 6. Якія прычыны садзейнічалі развіццю кнігадрукавання?

! **Гэта цікава.** Новай з'явай у культурным жыцці Беларусі ў сярэдзіне XVI ст. стала мецэнацтва. Некаторыя адукаваныя беларуска-літоўскія арыстакраты апекавалі таленавітых маладых людзей, садзейнічалі іх адукацыі ў лепшых універсітэтах тагачаснай Еўропы, гуртавалі вакол сябе пісьменнікаў, мастакоў, вучоных, збіралі кнігі, музейныя каштоўнасці, помнікі мастацтва, адкрывалі школы-тэатры, друкарні. Іх двары, напрыклад двор князёў Радзівілаў у Нясвіжы, станавіліся своеасаблівымі культурнымі цэнтрамі. Вялікую ролю ў развіцці мецэнацтва ў розных сферах культуры і асабліва ў арганізацыі кнігадрукавання ў ВКЛ адыграла дзейнасць Мікалая Радзівіла Чорнага (1515—1565) — выдатнага дзяржаўнага, палітычнага і культурнага дзеяча.



Правообладатель Народная асвета

## § 27. Францыск Скарына — усходнеславянскі і беларускі гуманіст і асветнік

**Успомніце:**
*1. Калі на беларускіх землях распаўсюдзіліся ідэі Адраджэння? 2. Растлумачце значэнне паняцця «гуманізм». 3. Калі з'явілася кнігадрукаванне ў Еўропе? Хто быў яго пачынальнікам?*

**Жыццёвы шлях Ф. Скарыны.** Сярод іншых прадстаўнікоў рэнесансавай культуры на Беларусі вылучаецца постаць **Францыска Скарыны**. Скарына нарадзіўся *каля 1490 г.* у Полацку, у купецкай сям'і. Яго бацька гандляваў скурамі і іншымі таварамі. Ён, відаць, быў чалавекам даволі адукаваным, таму змог даць свайму сыну першапачатковую адукацыю дома. Пазней малады Францішак удасканальваў веды ў адной са школ Вільні або роднага Полацка, а ў 1504 г. паступіў у Кракаўскі універсітэт. Праз два гады ён скончыў універсітэт і неўзабаве атрымаў дыплом доктара філасофіі.

Ужо тады выявіліся надзвычайныя здольнасці Скарыны, што адкрывала перад ім шырокія перспектывы. Нейкі час ён быў сакратаром караля Даніі, аднак прага да ведаў прывяла яго ў 1512 г. у славуты Падуанскі універсітэт у Італіі, дзе Скарына бліскуча абараніў дыплом доктара медыцынскіх навук. Напэўна ўжо тады Скарыну зацікавіла кнігадрукаванне, якое адзінае давала ў той час магчымасць зрабіць веды набыткам шырокага кола людзей.

Месцам сваёй кнігавыдавецкай дзейнасці Францішак Скарына выбраў Прагу, якая была на той час значным культурным цэнтрам Еўропы. Да таго ж, дзякуючы знаходжанню на чэшскім троне прадстаўніка дынастыі Ягелонаў, падтрымліваліся даволі цесныя кантакты паміж Вялікім княствам Літоўскім і Чэхіяй. У **1517** г. тут выйшла першая кніга Скарыны — *Псалтыр*. У далейшым пабачылі свет яшчэ 22 пражскія выданні Скарыны, пасля чаго ён пераехаў у сталіцу ВКЛ — Вільню, дзе працягнуў сваю выдавецкую дзейнасць. Каля 1522 г. тут была выдадзена *«Малая падарожная кніжыца»*, а ў 1525 г. — *«Апостал»*.

Скарына спрабаваў распаўсюджваць свае кнігі не толькі на радзіме, але і за яе межамі. З гэтай мэтай ён наведаў Маскоўскую



Правообладатель Народная асвета

дзяржаву. Аднак там палічылі, што скарынаўскія выданні не адпавядаюць прынятым у Маскве царкоўным канонам. Ездзіў Скарына і ў Кёнігсберг да прускага герцага. Аднак у далейшым Скарына стаў адчуваць сур'ёзныя матэрыяльныя цяжкасці. Памерлі амаль што ўсе мецэнаты яго выдавецкай дзейнасці. Скарына быў вымушаны пакінуць радзіму і зноў скіравацца ў Прагу. Там ён да самай смерці працаваў каралеўскім садоўнікам.

**Погляды і друкарская дзейнасць Скарыны.** Францыск Скарына прысвяціў сваё жыццё выданню біблейскіх тэкстаў. Гэта не было выпадковым. У часы сярэдневякоўя Біблія была найбольш вядомай кнігай. Яна мела не толькі рэлігійнае значэнне; па ёй вучыліся грамаце, яна служыла крыніцай ведаў па гісторыі, геаграфіі. Таму Скарына імкнуўся не толькі зрабіць Біблію больш даступнай, таннейшай, чым рукапісныя кнігі, але і надрукаваць яе зразумелай народу мовай. Для гэтага ён перакладаў кананічныя тэксты, уводзіў у іх элементы жывой гутарковай мовы.



Прага. *Фрагмент гравюры XVI ст.*

Аднак Скарына не абмежаваўся толькі выдавецкай і перакладчыцкай дзейнасцю. У сваіх выданнях ён выступае і як аўтар прадмоў і сказанняў, якія набліжаюцца да пропаведзей, павучанняў. Каб зрабіць біблейскія сюжэты больш зразумелымі простаму чытачу, Скарына ў даступнай форме каменціраваў іх, даваў тлумачэнні і звесткі пра часы, якія апісваў. Ён выкарыстоўвае прыёмы вершаскладання, змяшчае ўласныя гімны.



Гравюра «Саламон будуе храм» з выдання Ф. Скарыны



Правообладатель Народная асвета



Францыск Скарына

У прадмовах, сказаннях і пасляслоўях Скарыны чытаецца яго ўнутраны свет, для якога была характэрна гуманістычная скіраванасць, уласцівая Рэнесансу. Скарына выступае як гарачы патрыёт, адданы прыхільнік духоўнага і грамадскага адзінства народа, хрысціянскіх і агульначалавечых каштоўнасцей.

У выданнях Скарыны прасочваецца глыбокая павага да свецкіх навук, цікавасць да набыткаў антычнасці, прыхільнасць да ідэі справядлівых і дасканалых законаў, заснаваных на натуральным праве. Ідэалам Францыска Скарыны была справядлівая і моцная манархія, якая падтрымлівала б хрысціянскую справядлівасць, кіравалася б законамі, жыла ў міры і згодзе з суседзямі, спрыяла развіццю гаспадаркі і духоўнай культуры падданых. Прыклады ідэальнага грамадства Скарына шукаў у мінулым, прычым яго ўвагу прыцягвалі не толькі біблейскія персанажы, але і дзеячы грэчаскай і рымскай антычнай гісторыі.

У сваіх выданнях Скарына змяшчаў звесткі па свецкіх навуках. Так, у «Малой падарожнай кніжыцы» маюцца звесткі па астраноміі, календары, даюцца беларускія назвы месяцаў года, прадстаўляюцца знакі Задыяка. Скарына лічыў, што па «Пеўніцах» можна было навучыц-



Правообладатель Народная асвета

ца музыцы, па кнігах Маісеевых — арыфметыцы, па кнізе Ісуса Навіна — геаметрыі і астраноміі.

Выданні Скарыны унікальныя і з пункту гледжання афармлення. Яны з поўным правам могуць лічыцца шэдэўрам кніжнай справы. Яны маюць зручныя памеры, аздоблены высокамастацкімі гравюрамі, арнаментам, нават шрыфт вызначаецца дасканаласцю. Ілюстрацыі выданняў Скарыны не толькі ўпрыгожваюць тэкст, але і дапамагаюць паўней зразумець змест. Лічыцца, што ў афармленні кніг і падрыхтоўцы гравюр прымаў удзел сам Скарына.

У сваёй выдавецкай дзейнасці Ф. Скарына ўвёў некаторыя навінкі, невядомыя раней. Ён стаў выкарыстоўваць прамежкі паміж асобнымі словамі, што аблегчыла чытанне, разбіваў тэкст на абзацы. Гэта спрыяла распаўсюджанню яго кніг, рабіла іх яшчэ больш зразумелымі.

**Велічнасць асобы Ф. Скарыны.** Францыска Скарыну часам называюць тытанам беларускага Адраджэння. Ён стаў першым беларускім і ўсходнеславянскім першадрукаром, які намнога апярэдзіў сваіх сучаснікаў. Першыя друкаваныя кнігі ў суседніх з беларусамі народаў з'явіліся значна пазней. Аднак Скарына выступае не толькі як кніжнік, асветнік, носьбіт і пашыральнік духоўных каштоўнасцей. Яго асоба ўвабрала ў сябе шматбаковасць, характэрную для найбольш слаўных прадстаўнікоў еўрапейскага Рэнесанса. Скарына праявіў сябе ў розных галінах навукі і мастацтва — як філосаф, медык, пісьменнік і паэт, перакладчык, мастак, першадрукар. Яму ж прыпісваюць удзел у падрыхтоўцы першага звода законаў ВКЛ — Статута 1529 г.


Помнік Ф. Скарыне ў Полацку

Францыск Скарына стаў бадай што першым прыкметным дзеячам Адраджэння на беларускіх землях



Правообладатель Народная асвета

і пачынальнікам многіх наватарскіх тэндэнцый. Яго дзейнасць аказала ўплыў не толькі на кнігадрукаванне, але і на развіццё кніжнай гравюры ў ВКЛ, вершаскладанне, пашырэнне свецкіх тэндэнцый у літаратуры. Увядзенне элементаў жывой народнай гаворкі ў царкоўнаславянскія тэксты паспрыяла развіццю старабеларускай мовы.

**Пытанні і заданні**

1. Дзе і калі нарадзіўся Ф. Скарына? Дзе ён атрымаў адукацыю? 2. У якіх сферах дзейнасці праявіўся талент Ф. Скарыны? 3. Складзіце табліцу «Выдавецкая дзейнасць Ф. Скарыны».

| Дата выдання кнігі | Назва кнігі | Месца выдання |
|---|---|---|
| | | |

4. Растлумачце, чаму большасць кніг, выдадзеных Ф. Скарынам была рэлігійнага зместу. Чым адметныя кнігі, выдадзеныя Ф. Скарынам? 5. На адной з кніг, выдадзеных Ф. Скарынам, у загалоўку напісана: «Библия руска, выложена доктором Франциском Скориною из славного града Полоцька, богу ко чти и людем посполитым к доброму научению». Як у гэтых словах вызначаны мэты выдання? 6. Ахарактарызуйце погляды Ф. Скарыны. Ці можна сказаць, што погляды Ф. Скарыны важныя для сучаснага чалавека? 7. Вызначце ролю Ф. Скарыны ў развіцці беларускай культуры.

### Гістарычная крыніца

**З работ Ф. Скарыны**

Понеже прирожения звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя; птици, летающие по возъдуху, ведають гнезда своя; рыбы, плывающие по морю и в реках, чують виры своя; пчелы и тым подобныя боронять ульев своих, тако ж и люди, и где зародилися и ускормлены суть по Бозе, к тому месту великую ласку имеють.

* * *

Закон прироженый в том наболей соблюдаем бывает: то чинити иным всем, что самому любо ест от иных всех, итого не чинити иным, чего сам не хощеши от иных имети… Сей закон прироженый ест в серци единого кажного человека.

*Да чаго прызываў Ф. Скарына ў сваіх работах?*



Правообладатель Народная асвета

**Гэта цікава.** Францыск Скарына стаў адным з найбольш вядомых выпускнікоў Падуанскага універсітэта. У так званай Зале сарака гэтага універсітэта на кафедры ўстаноўлены бюст Галілеа Галілея, які чытаў тут лекцыі па матэматыцы. А на сценах, у два рады, вісяць партрэты сарака найбольш выдатных асоб, якія вучыліся тут і пакінулі яркі след у сусветнай культуры. Партрэт Ф. Скарыны знаходзіцца ў верхнім радзе амаль над самай кафедрай Галілея ў акружэнні выяў знакамітага польскага паэта Яна Каханоўскага і першага рускага доктара медыцыны П. В. Поснікава.

* * *

Францыск Скарына — адзін з найбольш велічных сыноў Беларусі. Вышэйшыя ўзнагароды Беларусі — медаль і ордэн — названы ў яго гонар. Яго імя носіць універсітэт у Гомелі, цэнтральная бібліятэка і педагагічнае вучылішча ў Полацку, вуліцы ў многіх гарадах Беларусі. Помнікі Ф. Скарыне ўстаноўлены ў Полацку, Мінску, Лідзе, Калінінградзе, Празе.

## АБАГУЛЬНЕННЕ ДА РАЗДЗЕЛА II

1. Пры якім князі Вялікае княства Літоўскае набыло свае найбольшыя памеры? Як змянілася тэрыторыя ВКЛ да сярэдзіны XVI ст.?
2. Ахарактарызуйце дзяржаўны лад ВКЛ, які склаўся ў канцы XIV — першай палове XVI ст.
3. Складзіце схему «Вялікія князі ВКЛ другой паловы XIV — першай паловы XVI ст.». Назавіце князёў, якія, на вашу думку, зрабілі найбольш значны ўклад ва ўмацаванне і развіццё ВКЛ.
4. Назавіце саслоўі, якія сфарміраваліся ў ВКЛ у другой палове XIV — першай палове XVI ст. Якія з іх былі прывілеяванымі, якія падатковымі?
5. Апішыце працэс запрыгоньвання сялян у ВКЛ. Складзіце храналагічную табліцу.



Правообладатель Народная асвета

6. Якія канфесіі былі найбольш распаўсюджанымі ў ВКЛ? Якую палітыку ў дачыненні да розных канфесій праводзіла дзяржава?

7. Складзіце сінхранічную табліцу «Адносіны ВКЛ з Польшчай і Расійскай дзяржавай».

| Дата | Адносіны з Польшчай | Дата | Адносіны з Расійскай дзяржавай |
|---|---|---|---|
| | | | |

8. Калі пачалося фарміраванне беларускай народнасці? Што садзейнічала яе фарміраванню? Назавіце адметныя рысы беларускай народнасці. Якія з іх захаваліся да нашага часу?

9. Чаму ў культуры беларускіх зямель другой паловы XIV — першай паловы XVI ст. назіраўся ўплыў візантыйскіх і заходнееўрапейскіх традыцый? Прывядзіце прыклады.

10. Якія асноўныя рысы рэнесансавай культуры ў ВКЛ у XVI ст.? Назавіце найбольш вядомых дзеячаў культуры ВКЛ XVI ст. Чым яны знакамітыя?

11. Складзіце абагульняючую табліцу «Культура ВКЛ у XIV — першай палове XVI ст.».

| Літаратура | Кнігадрукаванне | Архітэктура | Скульптура, жывапіс |
|---|---|---|---|
| | | | |

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

# ВЫНІКОВАЕ АБАГУЛЬНЕННЕ

Вы скончылі вывучэнне гісторыі Беларусі ў складзе Вялікага княства Літоўскага, у якім у XIII—XIV стст. беларускія землі аб'ядналіся з суседнімі літоўскімі плямёнамі. Знаходжанне ў новай дзяржаве стала важным этапам для беларускага народа. Менавіта ў гэты час адбылося фарміраванне беларускай народнасці. Беларускія землі, адкрытыя ўплыву як з усходу, так і з захаду, перажывалі культурны ўздым. Тут былі прадстаўлены практычна ўсе мастацкія стылі, вядомыя тады ў Еўропе, а ў XVI ст. да Беларусі дакаціліся магутныя хвалі Рэнесанса. У часы Вялікага княства Літоўскага жылі і тварылі такія велічныя дзеячы беларускай культуры, як Францыск Скарына, Мікола Гусоўскі, Васіль Цяпінскі і інш. У складзе гэтай дзяржавы нашым продкам удалося вырашыць многія знешнепалітычныя праблемы, якія паўсталі перад беларускімі землямі ў папярэднія часы. Пасля разгрому крыжакоў пад Грунвальдам у 1410 г. больш не ўяўляў сур'ёзнай пагрозы магутны калісьці Тэўтонскі ордэн. На пачатку XVI ст. удалося ўтаймаваць Крымскае ханства — апошні асколак Залатой Арды, які складаў небяспеку для беларускіх зямель.

Паспяхова развівалася гаспадарка. Беларускія землі былі ўключаны ў сістэму еўрапейскіх гандлёвых сувязей. Збожжа з беларускіх палеткаў знаходзіла попыт далёка за межамі Вялікага княства Літоўскага. Выгаднасць сельскагаспадарчых заняткаў заахвочвала феадалаў да новых форм вядзення гаспадаркі. У выніку адбывалася складанне фальваркова-паншчыннай сістэмы і канчатковае запрыгоньванне сялянства.

Росквіт перажываюць і гарады. Яны растуць колькасна і якасна, засяляюцца новымі жыхарамі, папаўняюцца новымі відамі рамяства. Сведчаннем гаспадарчай і прававой самастойнасці гарадоў стала атрыманне імі, пачынаючы з канца XIV ст., самакіравання паводле магдэбургскага права. Для забеспячэння сабе большай эканамічнай і грамадскай вагі рамеснікі і купцы аб'ядноўваюцца ў прафесійныя суполкі — цэхі і брацтвы. У выніку беларускі горад яшчэ больш набывае агульнаеўрапейскае аблічча.



Правообладатель Народная асвета

Значныя зрухі адбываліся ў сацыяльна-палітычнай сферы. Беларускія землі, якія першапачаткова карысталіся ў Вялікім княстве Літоўскім значнай самастойнасцю, усё цясней уключаюцца ў палітычную структуру дзяржавы. У той жа час з сярэдзіны XV ст. улада вялікіх князёў паступова пачынае слабець, а пазіцыі шляхты і асабліва магнатаў умацоўваюцца. У другой палове XVI ст. тут фарміруецца унікальная форма шляхецкай рэспублікі з выбарным манархам і шляхецкім парламентам — соймам. Абмежаванне ўлады манарха востра паставіла пытанне аб падрыхтоўцы дасканалых юрыдычных дакументаў. Вынікам гэтага стала падрыхтоўка Статутаў ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гадоў, якія былі аднымі з найлепшых узораў тагачаснай еўрапейскай прававой думкі.

Разам з тым далёка не ўсё было станоўча ў развіцці Вялікага княства Літоўскага. Феадальная эксплуатацыя непасільным бярэмам кладася на плечы сялян. Існавалі ў дзяржаве і сур'ёзныя рэлігійныя супярэчнасці. Перыяд спрыяльнага існавання праваслаўнай царквы ў Вялікім княстве Літоўскім скончыўся пасля заключэння ў 1385 г. Крэўскай уніі. Паводле яе ўмоў пануючае месца ў дзяржаве займала каталіцтва, што закранала інтарэсы беларускага і ўкраінскага насельніцтва, пераважна праваслаўнага. У далейшым грамадства развівалася ў напрамку большай верацярпімасці, аднак Контррэфармацыя, якая разгарнулася з канца XVI ст., зноў паставіла розныя хрысціянскія плыні ў нераўнапраўнае становішча.

Вырашыўшы праблему крыжацкай небяспекі, Вялікае княства Літоўскае з канца XV ст. было вымушана весці працяглыя войны на іншых напрамках. Далёкімі ад ідыліі былі і адносіны з бліжэйшым палітычным партнёрам — Каралеўствам Польскім. Апошняе не толькі прад'яўляла свайму ўсходняму суседу тэрытарыяльныя прэтэнзіі, але і імкнулася да поўнага палітычнага падпарадкавання ВКЛ. У рэшце рэшт гэта прывяло да стварэння новай дзяржавы — Рэчы Паспалітай, у складзе якой незалежнасць ВКЛ была моцна абмежавана. Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя, якую вы будзеце вывучаць у наступным годзе.

Правообладатель Народная асвета

## Храналагічная табліца

| | |
|---|---|
| 1230-я — 1263 гг. | Княжанне Міндоўга |
| 1237—1241 гг. | Нашэсце мангола-татараў на Русь |
| 1264—1266 гг. | Княжанне Войшалка |
| 1293—1316 гг. | Княжанне Віценя |
| 1316—1341 гг. | Княжанне Гедзіміна |
| 1345—1377 гг. | Княжанне Альгерда |
| 1362 г. | Бітва каля р. Сінія Воды |
| 1377—1392 гг. | Княжанне Ягайлы |
| 1385 г., 14 жніўня | Крэўская унія |
| 1386—1434 гг. | Ягайла — кароль польскі (Уладзіслаў II) |
| 1387 г. | Утварэнне віленскага каталіцкага біскупства |
| 1390 г. | Атрыманне г. Брэстам магдэбургскага права |
| 1392 г., 5 жніўня | Востраўскае пагадненне |
| 1392—1430 гг. | Княжанне Вітаўта |
| 1399 г. | Бітва на р. Ворскла |
| 1401 г. | Віленска-Радамская унія |
| 1409—1411 гг. | «Вялікая вайна» |
| 1410 г., 15 ліпеня | Грунвальдская бітва |
| 1413 г. | Гарадзельская унія |
| 1430—1432 гг. | Княжанне Свідрыгайлы |
| 1432—1439 гг. | Грамадзянская вайна ў ВКЛ |
| 1435 г. | Бітва пад Вількамірам |
| 1432—1440 гг. | Княжанне Жыгімонта Кейстутавіча |
| 1440—1492 гг. | Княжанне Казіміра IV |
| 1468 г. | Судзебнік Казіміра IV |
| Каля 1470 — каля 1533 г. | Жыццё і дзейнасць М. Гусоўскага |
| Каля 1490 — каля 1551 г. | Жыццё і дзейнасць Ф. Скарыны |
| 1492—1506 гг. | Княжанне Аляксандра |



Правообладатель Народная асвета

| | |
|---|---|
| 1500—1503 гг. | Вайна паміж ВКЛ і Вялікім княствам Маскоўскім |
| 1506 г. | Бітва пад Клецкам |
| 1506—1548 гг. | Княжанне Жыгімонта I Старога |
| 1507—1508 гг. | Вайна паміж ВКЛ і Вялікім княствам Маскоўскім |
| 1508 г. | Мяцеж М. Глінскага |
| 1512—1522 гг. | Вайна паміж ВКЛ і Вялікім княствам Маскоўскім |
| 1514 г., 8 верасня | Бітва пад Оршаю |
| 1529 г. | Зацвярджэнне I Статута ВКЛ |
| 1534—1537 гг. | Вайна паміж ВКЛ і Вялікім княствам Маскоўскім |
| 1548—1572 гг. | Княжанне Жыгімонта II Аўгуста |
| 1566 г. | Зацвярджэнне II Статута ВКЛ |

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## ГІСТАРЫЧНЫ СЛОЎНІК

**Біскуп** — духоўны сан у каталіцкай царкве, які адпавядае праваслаўнаму епіскапу.

**Ваявода** — у XIV—XV стст. намеснік вялікага князя з судова-адміністрацыйнымі функцыямі, з XV ст. радны пан вялікага князя літоўскага і яго намеснік у вялікай правінцыі — ваяводстве, вайсковы і цывільны правіцель.

**Вёска** — невялікае паселішча, жыхары якога займаліся пераважна сельскай гаспадаркай; асноўны тып паселішча ў ВКЛ. У дакументах ВКЛ вёску часцей за ўсё абазначалі тэрмінам «сяло» ці «весь».

**Воласць** — 1) зямельныя ўладанні, якія належалі адной асобе ў ВКЛ; 2) адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў ВКЛ, населеная сялянамі-даннікамі.

**Вялікі князь**, **гаспадар** — найвышэйшы княжацкі тытул у ВКЛ, кіраўнік дзяржавы. Выбіраўся феадаламі, звычайна з сыноў ці блізкай радні папярэдняга вялікага князя.

**Дамен** — форма зямельнай уласнасці, пры якой зямля знаходзіцца ў поўным і спадчынным валоданні. Уладальніку дамена належала не толькі зямля, але і людзі, што на ёй жылі.

**Дым** — сялянская гаспадарка ў ВКЛ у XIV—XVIII стст., якая складалася з хаты, гаспадарчых будынкаў, розных сельскагаспадарчых угоддзяў, рабочай і прадукцыйнай жывёлы, гаспадарчага інвентару.

**Гетман** — галоўны начальнік над узброенымі сіламі дзяржавы ў ВКЛ.

**Епархія** (у рымска-каталіцкай царкве — **біскупства**) — хрысціянская царкоўна-адміністрацыйная адзінка ў межах пэўнай тэрыторыі (вобласці, зямлі, дзяржавы).

**Канцлер** — службовая асоба ў ВКЛ; спачатку быў непасрэдным кіраўніком канцылярыі ВКЛ, які адказваў за дакументальнае абслугоўванне дзейнасці вялікага князя і агучванне яго рашэнняў. З сярэдзіны XVI ст. канцлеры ператварыліся фактычна ў намеснікаў вялікага князя.



Правообладатель Народная асвета

**Канфесія** — веравызнанне; аб’яднанне веруючых, якія прытрымліваюцца пэўнага веравызнання.

**Кашталяны** — кіраўнікі велікакняжацкіх замкаў.

**Кляштар** — каталіцкі манастыр. На тэрыторыі Беларусі адзінкавыя кляштары вядомы з сярэдзіны XIII ст. Многія ўзніклі неўзабаве пасля хрышчэння Літвы ў 1387 г.

**Магістрат** — выбарны адміністрацыйны і судовы орган гарадскога самакіравання ў гарадах, якія атрымалі магдэбургскае права. У ВКЛ уводзіліся з канца XIV—XV ст.

**Магнаты** — у ВКЛ нашчадкі ўдзельных князёў, прадстаўнікі знатных феадальных родаў, якія валодалі вялікімі зямельнымі ўладаннямі з гарадамі, мястэчкамі і тысячамі сялянскіх дымоў.

**Маршалак** — найвышэйшая пасада ў ВКЛ у пачатку XVI—XVIII ст. Кіраваў дваром вялікага князя, прымаў замежных паслоў, вышэйшыхураднікаў дзяржавы, назіраў за этыкетам, загадваў прыдворнай стражаю і каралеўскай гвардыяй, сачыў за бяспекаю манарха.

**Мястэчкі** — дробныя паселішчы гарадскога тыпу. У ВКЛ узніклі ў XV ст.

**Мяшчане** — карэнныя жыхары гарадоў, якія не былі залежнымі ад феадалаў.

**Надзел** — зямля, якая апрацоўвалася сялянамі і была замацавана ў іх карыстанні.

**Намеснік** — прадстаўнік вялікага князя, які валодаў адміністрацыйна-гаспадарчай, фінансавай і судовай уладай.

**Пагоня** — ваенная павіннасць у ВКЛ; усеагульнае народнае апалчэнне, якое збіралася для разгрому і праследавання ворага. Вядома з канца XIV ст.

**Падскарбі** — кіраўнік скарба ВКЛ.

**Паспалітае рушэнне** — шляхецкае апалчэнне ў ВКЛ, у якое землеўладальнік павінен быў выставіць пэўную колькасць воінаў.



Правообладатель Народная асвета

**Прывілей** — заканадаўчы акт у ВКЛ, якім вялікія князі давалі або пацвярджалі асаблівыя правы феадалаў ці іншых груп насельніцтва.

**Рада Вялікага княства Літоўскага** — вышэйшы орган дзяржаўнай улады ў ВКЛ у XV — першай палове XVI ст., у які ўваходзілі вышэйшыя службовыя асобы дзяржавы (маршалак, гетман, канцлер, падскарбі, ваяводы і інш.), каталіцкія біскупы, найбуйнейшыя феадалы. Сфарміравалася на аснове дарадчага органа пры вялікім князі. Была пастаянна дзеючым выканаўча-распарадчым, заканадаўчым, кантралюючым і судовым органам. Для вырашэння найважнейшых пытанняў рада збіралася ў поўным складзе ці выносіла іх на разгляд сойма. Штодзённыя справы вырашалі пераважна старэйшыя радныя паны: віленскія біскуп, ваявода і кашталян, троцкія ваявода і кашталян, а таксама маршалак земскі, гетман найвышэйшы, канцлер, падскарбі.

**Славянізацыя** — працэс пераймання балцкім насельніцтвам мовы, культуры і традыцый славян. Славянізацыя балтаў на беларускіх землях адбывалася прыкладна ў канцы V—XIII ст.

**Сойм**, сейм — саслоўна-прадстаўнічы орган у ВКЛ у XV — першай палове XVI ст., на які першапачаткова запрашалася ўся шляхта.

**Соймікі**, сеймікі — сход шляхты павета (зямлі, ваяводства) у ВКЛ. Утвораны ў 1564—1566 гг. З’яўляліся органамі мясцовай улады і самакіравання.

**Статут Вялікага княства Літоўскага** — звод законаў феадальнага права ВКЛ. У Першым Статуце ВКЛ, прынятым у 1529 г., юрыдычна замацаваны асновы грамадскага і дзяржаўнага ладу ВКЛ, прававое становішча розных колаў насельніцтва, парадак утварэння, склад і паўнамоцтвы некаторых органаў дзяржаўнага кіравання і суда.

**Судзебнік** — зборнік законаў; першы зборнік законаў ВКЛ быў выдадзены вялікім князем Казімірам на сойме 1468 г.

**Унія дзяржаўная** — аб’яднанне, саюз дзяржаў.



Правообладатель Народная асвета

**Унія персанальная** — саюз дзяржаў пад уладай аднаго манарха пры захаванні імі пэўнай самастойнасці ва ўнутранай і знешняй палітыцы.

**Фальварак** — від феадальнага зямельнага ўладання ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай; феадальная гаспадарка (панскі двор з жылымі і гаспадарчымі пабудовамі, ворыўныя і іншыя ўгоддзі), заснаваная на працы прыгонных сялян і накіраваная на вытворчасць збожжа на продаж.

**Харугва** — 1) назва сцяга ў ВКЛ; 2) асноўная адзінка шляхецкай кавалерыі.

**Этнас** — гістарычна ўзнікшая група людзей (племя, народнасць, нацыя), аб'яднаная агульным паходжаннем, тэрыторыяй, свядомасцю, мовай, побытам і культурай.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## ПАМЯТКІ

**Памятка 1. Як працаваць з гістарычным тэкстам?**

1. Уважліва прачытайце тэкст параграфа (па частках, пунктах).

2. Калі ў тэксце сустрэнуцца незнаёмыя словы, знайдзіце іх значэнні ў слоўніку ці спытайцеся ў настаўніка.

3. Выдзеленыя тлустым шрыфтам даты, паняцці, імёны з'яўляюцца асноўнымі, іх неабходна запамятаць.

4. Выдзеліце ў кожнай частцы (пункце) тэксту галоўную думку.

5. Перакажыце змест параграфа, абапіраючыся на галоўныя думкі кожнага пункта; выкарыстайце ў пераказе асноўныя даты, імёны, паняцці.

**Памятка 2. Як працаваць з гістарычнай крыніцай?**

1. Прачытайце назву гістарычнай крыніцы, звярніце ўвагу на яе аўтара і час напісання.

2. Уважліва прачытайце тэкст гістарычнай крыніцы; вызначце, пра якую гістарычную падзею ў ёй ідзе гаворка.

3. Вызначце ў тэксце гістарычнай крыніцы невядомыя вам раней звесткі пра падзею. Запомніце іх і выкарыстайце пры апісанні гістарычнай падзеі.

4. Сэнс невядомых вам слоў знайдзіце ў слоўніку.

5. Адкажыце на пытанні, якія даюцца да гістарычнай крыніцы.

**Памятка 3. Як складаць просты план?**

1. Уважліва прачытайце тэкст, падзяліце яго на лагічна завершаныя часткі.

2. Коратка сфармулюйце галоўную думку кожнай часткі.

3. Запішыце паслядоўна галоўныя думкі кожнай часткі ў выглядзе загалоўкаў, абазначце іх арабскімі лічбамі.

4. План павінен адпавядаць тэксту па змесце і логіцы выкладання матэрыялу.

**Памятка 4. Як працаваць з ілюстрацыяй?**

1. Уважліва разгледзьце ілюстрацыю.

2. Вызначце падзею, якая на ёй адлюстравана; час і месца, дзе яна адбылася.



Правообладатель Народная асвета

3. Складзіце план расказу па ілюстрацыі.

4. Апішыце паказаных на ілюстрацыі людзей (іх знешні выгляд, прылады працы, зброю, прадметы побыту, дзеянні).

5. Правільна выкарыстоўвайце ў сваім расказе гістарычныя паняцці.

6. Выкарыстоўвайце інфармацыю ілюстрацый пры апісанні гістарычных падзей, якія вы вывучаеце.

**Памятка 5. Як параўноўваць гістарычныя факты?**

Параўнанне — гэта вызначэнне агульнага і рознага ў гістарычных фактах (падзеях, з'явах, працэсах).

1. Вызначце аб'екты параўнання (прыродныя ўмовы, грамадскі лад, войны, заняткі, прылады працы і г. д.).

2. Ахарактарызуйце аб'екты, якія параўноўваюцца, па кожным пункце прапанаванага плана параўнання.

3. Суаднясіце характарыстыкі, вызначце агульныя прыкметы і адрозненні.

4. Сфармулюйце вывады аб падабенстве і адрозненнях.

5. Параўнанне зручна выконваць у форме табліцы.

| План параўнання | Аб'ект 1 | Аб'ект 2 |
|---|---|---|
| 1.<br>2. і г. д. | | |

Вывады.

**Памятка 6. План характарыстыкі гістарычнага дзеяча**

1. Даведайцеся, калі і дзе жыў гістарычны дзеяч, якому вы даяце характарыстыку.

2. Да якой групы насельніцтва ён адносіўся?

3. Якія мэты ён імкнуўся ажыццявіць?

4. Якімі сродкамі дабіваўся ажыццяўлення задуманага?

5. Якія асабістыя якасці яму дапамагалі ў гэтым?

6. Пералічыце яго найбольш выдатныя дасягненні.

7. Якую карысць прынесла яго дзейнасць людзям? Дайце сваю ацэнку яго дзейнасці.



Правообладатель Народная асвета

**Памятка 7. Як характарызаваць помнікі культуры?**

1. Назавіце помнік, месца і час яго стварэння.

2. Даведайцеся, хто яго аўтар.

3. З якой мэтай ён быў створаны? З якімі гістарычнымі падзеямі ён звязаны?

4. Вызначце мастацкія асаблівасці помніка, яго гістарычную каштоўнасць.

5. Выкажыце ваша асабістае ўражанне ад помніка.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## Раім пачытаць

Атлас гісторыі Беларусі, ад старажытнасці да нашых дзён. Мінск, 2006.

Беларуская міфалогія. Мінск, 2001.

Бохан Ю. М. Турнірныя традыцыі ў Вялікім княстве Літоўскім у XIV—XVI стагоддзях. Мінск, 2008.

Бутрамееў Ул. Вялікія і славутыя людзі беларускай зямлі. Мінск, 1995.

Бутэвіч А. Званы Нямігі. Сем цудаў Беларусі. Мінск, 2002.

Бутэвіч А. У гасцях у вечнасці. Мінск, 2001.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі ў сярэднія вякі (VI—XV стст.). Дапаможнік для вучняў і настаўнікаў. Пад рэдакцыяй Г. В. Штыхава. Мінск, 1998.

Дубянецкі Э. С. Таямніцы народнай душы. Кніга для вучняў. Мінск, 1995.

Думін С. У., Канапацкі І. Б. Беларускія татары. Мінск, 1993.

Из тьмы веков светлеющие лики. Минск, 1994.

Ипатова О. Вещун Гедимина. Минск, 2005.

Іпатава В. М. Альгердава дзіда. Мінск, 2002.

Краўцэвіч А. К. Вялікі князь Вітаўт. Мінск, 1998.

Краўцэвіч А. К. Тэўтонскі ордэн. Мінск, 1993.

Масленицына И. А. По рыцарским законам. Минск, 2001.

Масленицына И., Богодзяж Н. Радзивиллы — несвижские короли. Минск, 1997.

Масляніцына І. А., Багадзяж М. К. Слава і няслаўе. Мінск, 1995.

Тарасаў К. Памяць пра легенды. Постаці беларускай мінуўшчыны. Мінск, 1990.

Терехин С. Ф. Охота в Белоруссии. Минск, 1986.

Ткачев М. А. Замки Беларуси. Минск, 2005.

Цітоў А. Гарадская геральдыка Беларусі. Мінск, 1989.

Чаропка В. Імя ў летапісе. Мінск, 1994.

Чаропка В. Храм без бога. Раман. Мінск, 1992.

Правообладатель Народная асвета

# Змест

Ад аўтараў . . . 3
Уводзіны . . . 5

**Раздзел I**
**Беларускія землі ў сярэдзіне XIII—XIV ст.**

§ 1. Вытокі ўтварэння Вялікага княства Літоўскага . . . 8
§ 2. Пачатак Вялікага княства Літоўскага . . . 12
§ 3. Умацаванне велікакняжацкай улады . . . 17
§ 4. Княжанне Альгерда. Пачатак праўлення Ягайлы . . . 21
§ 5. Барацьба з крыжацкай агрэсіяй . . . 26
§ 6. Зблiжэнне Вялікага княства Літоўскага з Польшчай . . . 31
§ 7. Дзяржаўны лад ВКЛ у сярэдзіне XIII—XIV ст. . . . 35
§ 8. Гаспадарчае жыццё . . . 39
§ 9. Этнічнае і канфесійнае становішча ў ВКЛ . . . 43
§ 10. Матэрыяльная і духоўная культура . . . 48
**Абагульненне да раздзела I** . . . 53

**Раздзел II**
**Беларускія землі ў канцы XIV — сярэдзіне XVI ст.**

§ 11. Княжанне Вітаўта . . . 55
§ 12. «Вялікая вайна» і Грунвальдская бітва . . . 61
§ 13. Грамадзянская вайна 1432—1439 гг. . . . 67
§ 14. Змены ў дзяржаўным ладзе ВКЛ у XV — сярэдзіне XVI ст. . . 71
§ 15. Унутрыпалітычнае становішча ВКЛ у першай палове XVI ст. 79
§ 16. Войска і вайсковая справа ў ВКЛ . . . 85
§ 17. Знешнепалітычнае становішча ВКЛ у канцы XV — першай палове XVI ст. . . . 90
§ 18. Развіццё феадальнага грамадства . . . 98
§ 19. Развіццё гарадоў . . . 103
§ 20. Гаспадарчыя заняткі гараджан . . . 110
§ 21. Утварэнне беларускай народнасці . . . 114
§ 22. Этнічныя меншасці ў ВКЛ . . . 118
§ 23. Царква і рэлігія . . . 122
§ 24—25. Культура ў XIV — XV стст. . . . 127
§ 26. Рэнесансавая культура ў ВКЛ у першай палове XVI ст. . . . 133



Правообладатель Народная асвета

§ 27. Францыск Скарына — усходнеславянскі і беларускі гуманіст і асветнік . . . 138
**Абагульненне да раздзела II** . . . 143
**Выніковае абагульненне** . . . 145
Храналагічная табліца . . . 147
Гістарычны слоўнік . . . 149
Памяткі . . . 153
Раім пачытаць . . . 156

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

Вучэбнае выданне

**Штыхаў** Георгій Васільевіч
**Бохан** Юрый Мікалаевіч
**Краснова** Марына Аляксееўна

**ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ:**

**другая палова XIII — першая палова XVI ст.**

Вучэбны дапаможнік
для 7 класа агульнаадукацыйных устаноў
з беларускай мовай навучання

Заг. рэдакцыі *В. Г. Бехціна.* Рэдактар *З. І. Малейка.* Афармленне *Г. П. Парафенюка, В. А. Ляхора, П. Ю. Татарнікава, В. М. Цемушава.* Мастацкі рэдактар *А. А. Валатовіч.* Тэхнічны рэдактар *М. І. Чаплаводская.* Карэктары *Д. Р. Лосік, Т. М. Вядзернікава, 0В. С. Бабеня, Г. В. Алешка.*

Падпісана ў друк 10.07.2009. Фармат $70 \times 90^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура літаратурная. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 11,7. Ул.-выд. арк. 8,1. Тыраж 28 800 экз. Заказ .

Выдавецкае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Народная асвета» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. ЛИ № 02330/0494083 ад 03.02.2009.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Мінская фабрыка каляровага друку».
ЛП № 02330/0494156 ад 03.04.2009.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

__________________________________________________

(Назва і нумар школы)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета